

НЯМА ПРАРОКА Ў СВАЁЙ АЙЧЫНЕ? **5**

ПРАБЛЕМНЫЯ ПЫТАННІ ВЯСКОВАГА ГАНДЛЮ



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

27 ЛІПЕНЯ 2018 г.
ПЯТНІЦА
№ 142 (28758)

9-24 стар. МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ. ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ +TV ПРАГРАМА

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Андрэй МОЛЧАН, дырэктар Дэпартамента па турызме Міністэрства спорту і турызму:**

*«Бязвізавы рэжым паўплываў на прырост наведванняў нашай краіны прыкладна ў 20 %. Яго ўвядзенне адназначна звязана з павелічэннем патоку турыстаў. Падаўжэнне тэрміну бязвізавага знаходжання з 5 да 30 дзён запатрабуе абнаўлення турыстычнай інфраструктуры і падрыхтоўкі кадраў з веданнем замежных моў. Калі раней асноўны турпаток прыходзіўся на прадстаўнікоў Расіі і краін СНД, то зараз больш увагі трэба ўдзяліць рабоце з турыстамі з далёкага замежжа. Атэлям, санаторыям і аграсядзібам трэба забяспечыць магчымасць разліку праз міжнародныя сістэмы плацяжоў. Натуральна, гаворка ідзе і аб павышэнні якасці і культуры абслугоўвання».*

# МІНСК. ВЕЧАР. РОВАР



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## КОРАТКА

- Сямейны экіпаж у складзе Пятра і Паўла Масквянковых з Мастоўскага раёна першы ў Гродзенскай вобласці пераадолеў мяжу ў 2 тыс. тон збожжа.
- **Беларускія анколагі ўпершыню ўстанавілі пацыенту тытанавае рабро.**



- Інфляцыя ў Беларусі па выніках 2018 года чакаецца ніжэй за мэтавы параметр (не больш за 6 %).
- **У Беларускім дзяржаўным універсітэце на бюджэтную форму навучання па спецыяльнасці «журналістыка (напрамак — вэбжурналістыка)» прахадны бал склаў 393.**
- Новы аўтобусны маршрут звязка Брэст і польскі Цярэспаль.

■ Занятасць

## «ПРАЕХАЦЬ СТАНЦЫЮ — ГРУБАЯ ПАМЫЛКА»

### Як слесары і спартсмены перавучваюцца на машыністаў метро

**«Памятаю, да нас тры лётчыкі прыйшлі. Адзін пару месяцаў папрацаваў — плюнуў. Сказаў: «Лётаць прасцей, чым вадзіць вашы цягнікі», — і вярнуўся на аэрадром». Мінскі метрапалітэн рэгулярна праводзіць курсы па прафесіі «машыніст электрацягніка». Спецыяльнасць высокааплатная, а таму ад ахвотных адбою няма. Мы даведаліся, як адбіраюць і рыхтуюць будучых машыністаў.**



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

■ Надвор'е

## ЛІПЕНЬ ЗАВЯРШАЕЦЦА СПЯКОТАЙ

### У панядзелак будзе прыпякаць паўсюдна — чакаецца ад 25 да 32 цяпла

**Апошнія дні другога месяца лета абяцаюць быць сапраўды гарачымі. Калі ў пятніцу максімальная тэмпература паветра дасягне 30 цяпла, то ў суботу і нядзелю будзе да плюс 32 градусаў, перадаюць спецыялісты Белгідрамета. А гэта ўжо горача...**

Аднак няўстойлівае надвор'е яшчэ захаваецца і 28 ліпеня. У суботу ўначы месцамі, раніцай і днём на большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы, у асобных раёнах будуць лівені з навальніцамі. Ноччу тэмпература складзе ад плюс 15 да плюс 20 градусаў, удзень — 26—32 цяпла.

А вось у нядзелю ўзмоцніць уплыў скандынаўскі антыцыклон, па перыферыі якога ў краіну будзе паступаць вельмі цёплае паветра. Дажджоў стане менш, але будзе горача. У гэты дзень месцамі, пераважна па паўднёвым захадзе краіны, не абыдзецца без кароткачасовых навальнічных дажджоў. Тэмпература ўначы складзе ад плюс 15 да плюс 21 градуса, днём будзе значна цяплей — 32 градусы.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных спецыялістаў, у панядзелак пераважна па паўднёва-заходняй палове краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы, месцамі з навальніцамі. Уначы будзе ад плюс 15 да плюс 21 градуса, удзень — ад 25 цяпла па паўночным усходзе да плюс 32 градусаў па паўднёвым захадзе краіны. Таксама гарачыня чакаецца і ў аўторак. У гэтыя суткі выключна днём прагназуюцца кароткачасовыя дажджы, магчымы навальніцы. Тэмпература паветра ўначы складзе плюс 13—20 градусаў, злёгку адпусціць і днём — 24—29 градусаў. Але па поўдні краіны паветра прагрэецца да плюс 31 градуса. Спякота...

**Сяргей КУРКАЧ.**

ISSN 1990 - 763X
18142
9 771990 763008

# ПЛАНКА — УВЕРХ

## Патрабаванні да дзяржаўных служачых павінны быць найвышэйшыя

**Такую пазіцыю агучыў Аляксандр Лукашэнка на нарадзе, тэмай якой павінны былі стаць пытанні сацыяльна-прававых гарантый дзяржаўных служачых і павышэння прэстыжу дзяржаўнай службы. Пра гэта таксама казалі, аднак беларускі лідар адразу даў зразумець прысутным: у першую чаргу трэба гаварыць аб узмацненні жорсткасці патрабаванняў да чыноўнікаў, і толькі потым — аб павышэнні прэстыжу іх службы.**

### Карупцыі — бой, узнагароды — найлепшым

У пачатку сустрэчы Прэзідэнт адзначыў: што б ні рабілася ў краіне — няхай гэта будзе рэалізацыя маштабных праектаў, выкананне тых ці іншых рашэнняў — многае залежыць ад прафесіяналізму кіраўніцкіх кадраў.

«Ёсць талковыя кіраўнікі — ёсць развіццё і перспектывы ў краіны. Таму да дзяржслужачых прад'яўляюцца павышаныя патрабаванні, — адзначыў кіраўнік дзяржавы. — Гэта павінны быць спецыялісты, якія валодаюць шырокім кругаглядам, здольныя вызначаць стратэгічныя задачы і правільна ацэньваць наступствы рашэнняў, якія прымаюцца. Але, перш за ўсё, дзяржслужачы — гэта чалавек з высокімі маральнымі якасцямі».

Беларускі лідар падкрэсліў: у дзяржаўным апараце не павінна быць і намёку на карупцыйныя праявы. «Я думаю, не толькі вы, увесь народ бачыць маю палітыку ў гэтым плане. Тут няма нічога нечаканага і надзвычайнага для дзяржаўнага служачага — і пра гэта кажу ўвесь час, і гэта краевугольны камень любой маёй прэзідэнцкай кампаніі», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што за апошнія гады ў Беларусі праведзена маштабная работа па аптымізацыі колькасці дзяржслужачых. Толькі за апошні перыяд яна скарацілася на чвэрць і складае крыху больш за трыццаць тысяч, што зусім няшмат у параўнанні з іншымі краінамі.

Паводле яго слоў, у дзяржаўных органах назіраецца негатыўная тэндэнцыя, калі падбор кандыдатаў на вакантныя пасады зацягваецца на месяцы, а то і гады, у сувязі з чым важна вырашыць, як менавіта прыцягнуць у згаданую сферу самых лепшых і вопытных кіраўнікоў.

«Некалі мы гаворку пра гэта вялі, было даручана ўраду ўнесці адпаведныя прапановы. Яны накіраваны на тое, каб работа ў дзяржапараце была ганаровай, прывабнай», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Беларускі лідар пацікавіўся ў прысутных, наколькі прапанаваныя меры дадуць магчымасць павысіць эфектыўнасць работы дзяржаўных служачых. На думку Прэзідэнта, гэта галоўнае. Таксама кіраўніка дзяржавы зацікавіў фінансавы складнік згаданага пытання, на гэты аспект Аляксандр Лукашэнка звярнуў асаблівую ўвагу. «Калі вы прыйшлі да мяне з прапановамі аб павышэнні грашовага забеспячэння і зарплат дзяржслужачым, нават не падымайце гэтае пытанне, яно раз і назаўсёды вырашана», — адрэзаў ён.

Акрамя таго, кіраўнік дзяржавы выказаўся наконт заснавання медаля «За бездакорную дзяржаўную службу» — ён абсалютна не супраць. Аднак патрабаванні, якія будуць прад'яўляцца да дзяржаўных служачых, павінны быць найвышэйшыя.

Аляксандр Лукашэнка яшчэ раз падкрэсліў: гаворка не ідзе пра раздачу нейкіх прэміяльных або падарункаў, а пра тое, якія патрабаванні ў якіх нарматыўна-прававых актах павінны прад'яўляцца дзяржаўнаму служачаму, растлумачыў кіраўнік дзяржавы.

«Калі гэта будзе, як у ваенных, адпаведны статут — добра, хай будзе статут. Але людзі і грамадства павінна бачыць, што Прэзідэнт гэтым самым прад'яўляе вельмі жорсткія патрабаванні да дзяржаўных служачых», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Ён дадаў, што калі чыноўнік не спраўляецца з задачамі, то ён павінен сысці, а ўслед за парушэннем абавязкаў надыдуць штрафныя санкцыі аж да турэмнага тэрміну.

### Чакаем дакументы?

Па выніках нарады з журналістамі пагутарыла кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Наталля Качанава.

Яна нагадала, што сёння ў нашай краіне існуе закон аб дзяржаўнай службе. «У цяперашні час уносяцца дапаўненні і змяненні ў яго па той праграме, якая была запланаваная. Сёлета і меркавалася перагледзець гэты закон», — адзначыла Наталля Качанава.

Разам з тым на нарадзе была пастаўлена задача: распрацаваць, магчыма, статут дзяржаўнага служачага або кодэкс, паколькі фармалізаваць усе патрабаванні ў адзіным дакуменце — гэта правільна, упэўнена кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта.

Таксама Наталля Качанава паведаміла, што на нарадзе было вырашана стварыць рабочую групу. Яе ўдзельнікі — прычым не з дзяржслужачых — разгледзяць усе неабходныя пытанні і ўнясуць прапановы, каб на практыцы ажыццявіць намечанае.

Дарэчы, Прэзідэнт падчас нарады падкрэсліў, што дакумент павінен быць празрысты і справядлівы. Акрамя таго, ён павінен быць зразумелы для любога чалавека, а не толькі для дзяржаўнага служачага.

Назваў Аляксандр Лукашэнка і тэрміны выканання: дакументы, якія абмяркоўвалі, павінны быць падрыхтаваны ў найбліжэйшыя месяцы, каб запрацаваць з першага студзеня.

«Дзяржаўная служба падобна вайсковай, і людзі павінны разумець, што гэта не проста нейкія прывілеі, гэта перш за ўсё служба на карысць Радзімы і народа», — дадала кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.**




# Фарміруецца колас, ідзе пасляванне...

## Дажджы па-ранейшаму стрымліваюць прасыханне збожжа

**Згодна з апошняй інфармацыяй аддзела аграметэаралогіі Белгідрамета, на асноўных масівах збожжавых культур завяршаецца наліў коласа, ідзе яго пасляванне.**

У яравога ячменю ў Брэсцкай вобласці, на захадзе Мінскай і ў паўночных раёнах Гродзенскай вобласці наступіла поўная спеласць збожжа, у паўднёвых раёнах краіны пачалася яго ўборка. Яравая пшаніца саспела да васковай спеласці на захадзе Гродзенскай вобласці, месцамі на поўдні Брэсцкай, у асобных раёнах на ўсходзе Мінскай вобласці.

На астатніх масівах у яравой пшаніцы адзначаецца малочная спеласць збожжа. У аўса на большай тэрыторыі адзначана васковая спеласць. Вільготнасць збожжа павышаная, толькі на асобных палях яна паменшылася, у Мінскай і на поўдні Брэсцкай вобласці вільготнасць збожжа блізкая да кандыцыйных паказчыкаў.

Моцныя лівневыя дажджы з ветрам выклікалі палягане збожжавых культур, асабліва ў паўночна-ўсходняй палове краіны. Шэраг метэастанцый Віцебскай і Магілёўскай абласцей на 10—20 % плошчы адзначаюць сярэдняе паляганне збожжавых каласавых культур, а па звестках метэастанцый Полацк і Касцюковічы, на 50 % плошчы поля паляганне моцнае. У найбліжэйшыя дні дажджы па-ранейшаму будуць стрымліваць прасыханне збожжа і тэмпы уборачных работ, адзначаюць спецыялісты аграрнага аддзела Белгідрамета.

**Сяргей ПАЛІНІН.**

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Венесуэльскі балівар страціць пяць нулёў



Валюта Венесуэлы, балівар, будзе дэнамінаваная і прывязаная да крыптавалюты Petro з 20 жніўня. Пра гэта заявіў прэзідэнт краіны Нікалас Мадура, перадае El Nacional. Паводле яго слоў, нацыянальная валюта пазбавіцца пяці нулёў. Мадура сцвярджае, што названыя меры дапамогуць «радыкальна стабілізаваць і змяніць грашова-крэдытнае і фінансавае жыццё дзяржавы», якая пакутуе ад гіперінфляцыі. Днямі МВФ папярэдзіў, што інфляцыя ў Венесуэле можа дасягнуць мільёна працэнтаў да канца года, што прывядзе да найгоршага эканамічнага крызісу ў сучаснай гісторыі. Спецыялісты супаставілі гіперінфляцыю ў краіне з сітуацыяй, якая назіралася ў Германіі ў 1923-м і ў Зімбабвэ напрыканцы 2000-х гадоў. Спажывецкія цэны ў паўднёваамерыканскай дзяржаве выраслі на 46,3 тысячы працэнтаў. Рэспубліка перажывае зацяжны эканамічны крызіс з-за падзення цэн на нафту ў 2014 годзе.

### Выратаваныя з пячор у Тайландзе дзеці пайшлі ў манастыр

11 з 12 падлеткаў, выратаваных з затопленай пячоры на поўначы Тайланда, і іх трэнер прайшлі працэс пасвячэння ў будыйскія манахі. Яшчэ адзін хлопчык — хрысціянін, ён прысутнічаў на цырымоніі як глядач. Падлеткі правядуць у манастыры дзевяць дзён. Па заканчэнні гэтага тэрміну яны стануць паслушнікамі, а іх трэнер — манахам. Цырымонію, якая праходзіла ў будыйскім манастыры Ват Пхра Тхат Дой Тунг, адным з найбуйнейшых манастыроў правінцыі Чыянграй, трансляваў у прамым эфіры тэлеканал Thai PBS. Як вядома, усе мужчыны-будысты хоць бы адзін раз у жыцці часова стрыгуцца ў манахі. Гэтую працэдуру можна паўтараць яшчэ шмат разоў. Розніца толькі ў тым, што пастулаты, якія манах выконвае, з кожным пастрыжэннем становяцца больш складаныя.

### На Месяцы знайшлі прыкметы жыцця

Астрабіёлагі ўніверсітэта штата Вашынгтон прыйшлі да высновы, што на Месяцы магло існаваць жыццё. Навукоўцы лічаць, што даных дастаткова, каб упэўнена казаць аб наяўнасці спрыяльных умоў на нябесным целе мільярды гадоў таму. Артыкул навукоўцаў апублікаваны ў часопісе Astrobiology. Па словах спецыялістаў, пасля таго як спадарожнік Зямлі сфарміраваўся больш за чатыры мільярды гадоў таму з абломкаў, з яго нетраў вывяргаліся вялікія аб'ёмы гарачых газаў, уключаючы вадзяную пару. Працэс дэгазацыі, верагодна, прывёў да з'яўлення вадаёмаў на паверхні нябеснага цела і стварыў шчыльную атмасферу. Такія ўмовы прысутнічалі на Месяцы 3,5 мільярда гадоў таму падчас павышанай вулканічнай актыўнасці.

■ Новыя кнігі

# ЯК ЗРАЗУМЕЦЬ ЧАЛАВЕКА-ЛЕГЕНДУ?

**Выдавецтва «Адукацыя і выхаванне» прэзентавала шэсць кніг пра выдатных асоб найноўшай беларускай гісторыі.**

Калісьці супрацоўнікамі выдавецтва разам з «Настаўніцкай газетай» ужо была распачата серыя нарысаў пра слынных гістарычных дзеячаў. Але публікацыя ў перыёдыцы — адно, а паўнавартасная кніга — зусім іншы ўзровень. Так у 2014 годзе з'явілася ідэя заснаваць новую біяграфічную серыю «Асобы». Першым выданнем стала кніга на аснове ўспамінаў сяброў, калег, знаёмых «Віктар Парфёнаў: пакланіся травіцы. Экспедыцыя акадэміка» за аўтарствам Уладзіміра Ліпскага.

— Мы хацелі, каб «Асобы» расказвалі не проста пра чалавека, які знайшоў сваю справу і добра яе робіць, але пра асобу, якая разважае пра сябе, наша прызначэнне ў свеце, пра служэнне роднай зямлі, — абазначае мэты **Мікалай СУПРАНОВІЧ, ініцыятар і заснавальнік серыі, дырэктар выдавецтва «Адукацыя і выхаванне».**

Плануецца, што серыя кніг стане своеасаблівай «гісторыяй навейшага часу Беларусі», расказанай праз лёс людзей, якія ў многім яе і вызначалі.

На прэзентацыі ўжо надрукаваных шасці кніг удзельнікі маглі сустрэцца з галоўнымі героямі гэтых выданняў: першым касманаўтам Беларусі Пятром Клімуком, пісьменнікам Уладзімірам Ліпскім, акадэмікам НАН Беларусі Віктарам Парфёнавым, аграрыямі Рыгорам Бабчанком і Аляксеем Скакуном, разведчыкам і контрразведчыкам, героем афганскай вайны Уладзімірам Гаркавым.

— Кожны раз, калі праязджаю міма могілак, я думаю: «Божа, ляжыць бібліятэка непрачытаных кніг!» Нам, як пісьменнікам, журналістам, трэба паспець запісаць той вопыт, што накапіў чалавек, з чаго потым стане складацца наша гісторыя, — такую думку выказаў падчас прывітальнага слова **Уладзімір ЛІПСКІ, пісьменнік, а таксама яшчэ адзін ініцыятар і заснавальнік біяграфічнай серыі «Асобы».**

Сапраўды, за сваё жыццё чалавек часта набірае падзей і думак на паўнавартасны раман. А бываюць жа яшчэ жыццёвыя эпапеі, чые багатыя сэнсы дапамагаюць раскрыць сведкі, знаёмыя, сябры і калегі. Менавіта таму ўспаміны, сабраныя ў кнігах, датычацца не толькі агульнай «прафесійнай» дзейнасці беларускіх дзеячаў. Ёсць там месца і для выпадкаў, якія раскрываюць характар, знаёмяць са звычкамі, марамі і захапленнямі.

— Асабліва прыемна, што ў кнізе сабраны словы маіх знаёмых, сяброў — усіх тых людзей, з кім я меў зносіны, — выказаў словы падзякі **Пётр КЛІМУК.**

Яшчэ першы беларускі касманаўт падзяліўся ўспамінамі пра сваё вясковае дзяцінства і пра тое, якім было жыццё ў Зорным гарадку.

— Я лічу, што прыдумка стварыць такія кнігі — надзвычай удалая ідэя. Калі літаратар піша мастацкую кнігу, ён хоць крышачку, але павінен дабавіць у яе выдумкі. А тут жа аўтары-складальнікі запісвалі рэальныя размовы і праўдзівыя ўспаміны. Яны маглі параіцца і ўдакладніць некаторыя моманты з самімі «героямі твораў», — лічыць **Віктар ПАРФЁНАЎ.**

Цяпер выдавецтва працуе яшчэ над трыма кнігамі пра знакамітых беларусаў. Наступныя выданні раскажуць пра Віктара Пякарскага, былога начальніка сталічнага крымінальнага вышуку, паэтэсу Раісу Баравікову і вучонага ў галіне распрацоўкі новых матэрыялаў, акадэміка НАН Беларусі Пятра Віцязя.

**Рагнеда ЮРГЕЛЬ**

■ Супрацоўніцтва

# У ПОШУКАХ ПРЫТУЛКУ

## Якая сітуацыя з мігрантамі ў нашай краіне?

**Мы ўжо пісалі, што на днях адбылося адкрыццё сёмай Міжнароднай школы па падрыхтоўцы да рэагавання на надзвычайныя сітуацыі Беларускага таварыства Чырвонага Крыжа. Адным з цэнтральных тэарэтычных мерапрыемстваў стала прэс-канферэнцыя, прысвечаная сучасным міграцыйным выклікам, а таксама вопыту ўзаемадзеяння дзяржаўных, міжнародных і грамадскіх структур у гэтым няпростым аспекце.**

Склад спікераў атрымаўся сапраўды насычаны. З боку ўлады ў мерапрыемстве прынялі ўдзел міністр інфармацыі Аляксандр Карлюкевіч, старшыня Пастаяннай камісіі па нацыянальнай бяспецы Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Валянцін Міхневіч. Тут жа — вядучыя дзеячы Чырвонага Крыжа, напрыклад — генеральны сакратар БТЧК Вольга Мычко. Не абышлося і без прадстаўнікоў структур ААН, МУС, МНС, Міжнароднай арганізацыі па міграцыі і іншых.

Як адзначыла Вольга Мычко, большасць пытанняў, звязаных з міграцыяй, і адпаведны ўклад Чырвонага Крыжа сфарміраваліся ў 2014 годзе, калі павялічыўся паток вымушаных перасяленцаў з Украіны. Каля 160 тысяч украінцаў былі перамешчаны на тэрыторыю Беларусі — але гэта не азначае, што ўсе яны засталіся, многія прыязджалі і пакідалі нашу краіну, растлумачыла генеральны сакратар.

«Каля 2400 сем'яў патрапілі ў фокус гледжання Беларускага таварыства Чырвонага Крыжа, — паведаміла Вольга Мычко. — Не ўсе тыя, хто прыехаў у рэспубліку, мелі патрэбу ў пастаяннай або часовай падтрымцы, але гэтая работа была праведзена».

Кіраўнік Прадстаўніцтва Упраўлення Вярхоўнага камісара ААН па справах бежанцаў у Беларусі Жан-Іў Бушардзі нагадаў прысутным, што на працягу апошніх дваццаці гадоў тысячы бежанцаў прыехалі ў Беларусь у пошуках прытулку. У выніку крызіснай сітуацыі ва Украіне крыху больш за тры тысячы грамадзян, якія прыехалі адтуль у Беларусь, звярнуліся з просьбай надаць ім статус бежанца і дадатковую абарону. Калі браць адлік ад 2014 года, то з той жа мэтай у беларускае Прадстаўніцтва звярнулася каля 240 грамадзян Сірыі і крыху больш за 100 грамадзян Афганістана.

«Калі казаць пра статыстыку за першае паўгоддзе бягучага года, то каля 460 замежнікаў звярнулася па прыстанішча ў Беларусі, — сказаў Жан-Іў Бушардзі. — Большасць з іх — гэта грамадзяне Украіны, Сірыі і Узбекістана. У дадатак да гэтага, калі казаць пра асобы, якія ўваходзяць у кампетэнцыю Прадстаўніцтва, у Беларусі налічваецца каля шасці тысяч чалавек без грамадзянства. Такім чынам, калі скласці ўсе катэгорыі асоб, якія знаходзяцца ў нашай кампетэнцыі, то іх колькасць ледзь перавысіць дзевяць тысяч. З улікам усяго вышэйсказанага відавочным з'яўляецца той факт, што рэакцыя на надзвычайныя сітуацыі — гэта комплексны працэс, і эфектыўная работа ў гэтай сувязі немагчымая без сумесных, узгодненых намаганняў з боку ўрада і розных арганізацый».

На мерапрыемстве закранулі і такую важную тэму, як гвалт у адносінах да жанчын, дзяцей і бежанцаў. Як расказала намеснік прадстаўніка Фонду ААН у галіне народанасельніцтва ў Беларусі Алена Каська, па статыстыцы 35 % жанчын сутыкаліся альбо з бытавым гвалтам з боку свайго партнёра, альбо з гвалтам з боку незнаёмага чалавека. «Можна меркаваць, што ў надзвычайнай сітуацыі — напрыклад, у выпадку вымушанай міграцыі, тэхнагеннай катастрофы — вышэйназваныя групы стануць ахвярамі гвалту ў яшчэ большай меры верагоднасці», — падкрэсліла спецыяліст.

Па агульным меркаванні ўдзельнікаў прэс-канферэнцыі, каб маштаб агучаных тэм не станавіўся большым, неабходная пастаянная падрыхтоўка па гэтых пытаннях, чым і займаюцца ў сёмай Міжнароднай школе. Адпрацоўка механізмаў узаемадзеяння ў выпадку масавага перасялення або міграцыі паміж валанцёрамі, нацыянальнымі таварыствамі Чырвонага Крыжа і Чырвонага Паўмесяца з арганізацыямі розных дзяржаў — несумненна, адзін з дзейсных спосабаў вырашэння гэтых праблем.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ**

■ Фестывалім

# ГАЙДА НА БАРД-РЫБАЛКУ!

**IX міжнароднае музычна-спартыўнае свята «Вялікая бард-рыбалка» пройдзе ў Быхаўскім раёне ўжо ў гэтыя выхадныя**



Тым, хто яшчэ не вырашыў, як арганізаваць свой суботні і нядзельны адпачынак, напэўна, будзе цікава акунуцца ў сяброўскую атмасферу душэўнага мерапрыемства на беразе Чыгірынскага вадасховішча. Самае галоўнае, што на яго праграму ніякім чынам не зможа паўплываць надвор'е. Бо галоўны сэнс свята — поўнае яднанне з прыродай, прапаганда здаровага ладу жыцця, спорт, экатурызм. Форма адзення пажадана спартыўная, бо тут як заўсёды будзе шмат мерапрыемстваў для актыўных — адкрыты турнір па пляжным валейболе сярод аматараў і прафесіяналаў, конкурс «Каралева бард-рыбалкі» ад адной з заснавальніц фітнес-руху ў Беларусі Наталлі Наважылавай, дабрачынны кубак «Вялікай бард-рыбалкі» па бегу. За кожны кіламетр шляху «Магатэкс» — генеральны партнёр праекта — пералічыць грошы на дабрачынны рахунак па адраджэнні мясцовай славутасці XVII стагоддзя — Быхаўскага замка. Перад стартам Наталля Наважылава правядзе масавую размінку. А яшчэ будзе шмат песенных і рыбалоўных спаборніцтваў, кулінарных паядынкаў і лазнева-аздараўленчых майстар-класаў. Адбудзецца чэмпіянат Беларусі па прыгатаванні юшкі пад кіраўніцтвам шэф-кухара Барыса Бурды, вядомага знатака, барда і тэлевядучага. Наогул, тут можна будзе пабачыць шмат медыйных асоб у амаль хатняй абстаноўцы. Аматарам спеваў пад гітару будзе дзе адвесці душу. Удзел у мерапрыемстве прымаюць музыканты і паэты з дзевяці краін: Беларусі, Расіі, Украіны, Германіі, Польшчы, Чэхіі, Славакіі, Грузіі і ЗША.

**Нэлі ЗІГУЛЯ**

■ Чулі?

# САМАЕ ДОЎГАЕ МЕСЯЦОВАЕ ЗАЦЬМЕННЕ

**Лічыцца, што яно больш за ўсё ўплывае на матэрыяльны свет**

**Згодна з папярэдняй інфармацыяй, зацьменне пачнецца 27 ліпеня ў 21.24. У 22.30 Месяц цалкам увойдзе ў цень Зямлі і стане чырвоны. Пік з'явы можна будзе назіраць у 23.22.**

Частковае зацьменне будзе працягвацца 3 гадзіны 55 хвілін. Падчас гэтай з'явы можна будзе ўбачыць на небе Марс больш яркім, чым звычайна. Упершыню за апошнія 15 гадоў чырвоная планета пройдзе так блізка ад Зямлі. Месяцовае зацьменне будзе такое доўгае, таму што спадарожнік Зямлі пройдзе непасрэдна ў цёмнай зоне ценю планеты, якая надасць Месяцу крывавае адценне.

Эксперты адзначаюць, што ў гэты дзень адбудзецца ўнікальнае месяцовае зацьменне XXI стагоддзя. Перш за ўсё, за кошт сваёй працягласці. Тым не менш яно будзе ўнікальным і ў іншым, містычным сэнсе. Прынамсі, так гавораць астролагі. Падчас зацьмення Сонца будзе знаходзіцца ў знаку Льва, а Месяц — у знаку Вадаліва. Вадалій — знак свабоды, таму ў душы кожнага чалавека на зямлі паўстане жаданне свабодна праяўляцца. Пасля гэтага зацьмення доўгі час людзей будуць хваляваць праблемы ліквідацыі разнастайных перашкод.

Асаблівасцю гэтага зацьмення з'яўляецца і тое, што яно супадае з яшчэ адной важнай астранамічнай з'явай, якая таксама ўлічваецца і ў астралогіі: супрацьстаянне Марса з Сонцам. Марс апынецца на адной лініі з Сонцам, і яго дыск будзе добра праглядацца з зямлі. Спакон вякоў Марс лічыўся планетай агрэсіі. Ён можа выклікаць у чалавеку агрэсіўнасць, жаданне вырашаць пытанні шляхам прамога сутыкнення альбо прымушаць чалавека спаборнічаць з іншымі людзьмі. Таму варта чакаць, што колькасць людзей, якія хочуць спаборнічаць адзін з адным, рэзка ўзрасце.

Марс таксама будзе правакаваць дробныя канфлікты ў грамадстве, таму калі мы хочам пазбегнуць непажаданых наступстваў, то некаторы час пасля зацьмення неабходна кантраляваць сябе. Таксама варта сказаць, што гэта зацьменне адкрые ў людзях цікавасць да эзатэрычных дысцыплін, да вывучэння незвычайных з'яў прыроды.

**Сяргей КУРКАЧ**

## КАМПЕТЭНТНЫЯ АДКАЗЫ НА АКТУАЛЬНЫЯ ПЫТАННІ

Ва ўсіх рэгіёнах краіны 28 ліпеня пройдуць рэгулярныя прамыя тэлефонныя лініі з уладамі. Некаторыя праблемы кіраўнікі вырашаюць не паклаўшы трубку тэлефона, іншыя бяруць пад уласны кантроль.

Традыцыйна тэлефонныя лініі будуць працаваць з 9.00 да 12.00, на званкі адкажуць:

намеснік старшыні БРЭСЦКАГА аблвыканкама Вадзім Іванавіч АЛЬШЭЎСКІ. Тэл. 8-016 221 31 21;

намеснік старшыні ВІЦЕБСКАГА аблвыканкама Уладзімір Мікалаевіч БЕЛАВУС. Тэл. 8-021 222 22 22;

намеснік старшыні ГОМЕЛЬСКАГА аблвыканкама Андрэй Васілевіч КАНЮШКА. Тэл. 8-023 233 12 37;

намеснік старшыні ГРОДЗЕНСКАГА аблвыканкама Уладзімір Іосіфавіч ДЗЯШКО. Тэл. 8-015 273 56 44;

кіраўнік спраў МАГІЛЁЎСКАГА аблвыканкама Рыгор Аляксандравіч ВАРОНІН. Тэл. 8-022 250 18 69;

старшыня МІНСКАГА аблвыканкама Анатоль Міхайлавіч ІСАЧАНКА. Тэл. 8-017 500 41 60;

кіраўнік спраў МІНСКАГА гарвыканкама Ганна Мар'янаўна МАЦЕЛЬСКАЯ. Тэл. 8-017 222 44 44.

■ На здароўе

# ЛЕКІ З ПАДНЯБЕСНАЙ АЙЧЫННАЙ ВЫТВОРЧАСЦІ

**У Беларусі мяркуюць выпускаць медыкаменты нетрадыцыйнай кітайскай медыцыны.**

Барысаўскі завод медпрэпаратаў сумесна са спецыялістамі з КНР плануе наладзіць у Беларусі вытворчасць медыкаментаў нетрадыцыйнай кітайскай медыцыны. Пра гэта паведаміў генеральны дырэктар прадпрыемства Віталь Дзераш.

Сучаснае фармацэўтычнае прадпрыемства плануецца пабудаваць у індустрыяльным парку «Вялікі камень» сумесна з Пекінскай фармацэўтычнай карпарацыяй. Віталь Дзераш адзначыў, што гэта будзе новым кірункам у развіцці фармацэўтыкі ў Беларусі. У хуткім часе прадстаўнікі завода і парка маюць намер адправіцца ў Кітай, каб абмеркаваць дэталі супрацоўніцтва па праекце.

Віталь Дзераш падкрэсліў, што гаворка ідзе пра прэпараты, выробленыя з натуральнай сыравіны. Прадукцыя будзе пастаўляцца на рынак Беларусі і на экспарт. Медыкаменты нетрадыцыйнай кітайскай медыцыны запатрабаваны ў заходніх краінах. У той жа час адна з першасных мэтаў праекта — насыціць беларускі рынак

■ Здарэнне

## Пад Камянцом загінула сям'я

**Раніцай у сераду страшнае ДТЗ адбылося на дарозе Брэст — Камянец — Белавежская пушча паблізу вёскі Радасць. Сутыкнуліся грузавік МАЗ і мікрааўтобус Renault, у якім ехала сям'я — муж, жонка і двое дзяцей.**

Сіла ўдару была настолькі моцная, што кабіну мікрааўтобуса скамячыла, нібы яна была зроблена не з металу, а з пластыліну. На месцы здарэння загінулі жонка кіроўцы і іх сын, якому было ўсяго тры гады. Падчас аказання медыцынскай дапамогі памёр і другі сын, пяцігадовы. Кіроўцу Renault урачы паспелі даставіць у Камянецкую цэнтральную раённую бальніцу, але праз некаторы час не стала і яго.

— Па папярэдняй інфармацыі, вадзіцель грузавіка, выязджаючы з другаснай дарогі, не даў перавагу мікрааўтобусу, які ехаў па галоўнай дарозе, — паведамілі ў ДАІ УУС Брэсцкага аблвыканкама.

Па інфармацыі Следчага камітэта, адзін з малых знаходзіўся ў спецыяльным дзіцячым крэсле, а другі — на руках у маці, якая была прышпілена.

Заведзена крымінальная справа па пункце 3 артыкула 317 Крымінальнага кодэкса — парушэнне правілаў дарожнага руху, якое пацягнула па неасцярожнасці смерць дзвюх і больш асоб.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК, Святлана ЯСКЕВІЧ.**




# «ПРАЕХАЦЬ СТАНЦЫЮ — ГРУБАЯ ПАМЫЛКА»

*(Заканчэнне.*
*Пачатак на 1-й стар.)*

Канкурэнцыя на курсы сур'ёзная. Са ста прэтэндэнтаў адбор праходзяць толькі 30. Адны адсейваюцца на сумоўі, другія — на медкамісіі.

— Здароўе ў машыніста мусіць быць, як у касманаўта. Зрок «адзінка», ціск 120/80, пульс не вышэй за 86 удараў у хвіліну. Узрост — да 40 гадоў, — пералічвае крытэрыі **Яўген ТАЛАКА, начальнік электрадэпо «Магілёўская»**, на базе якога праходзіць падрыхтоўка.

Перавага аддаецца кандыдатам з тэхнічнай адукацыяй. Ахвотных кіраваць саставам чакае таксама камп'ютарны тэст — на логіку, уважлівасць, усёдлівасць.

Цяпер у групе 17 чалавек: усе хлопцы. Траіх ужо адлічылі — за непаспяховасць.

— Жорстка ў вас.

— А як інакш? Вы ж хочаце ездзіць бяспечна.

Курсы доўжацца восем з паловай месяцаў, чатыры з паловай месяцы — тэорыя (частка заняткаў праходзіць у Мінскім дзяржаўным прафесійна-тэхнічным каледжы чыгуначнага транспарту імя Юшкевіча), паўтара тыдня — слясарная практыка і потым цягніковая практыка. Навыкі кіравання навучэнцы адпрацоўваюць на трэнажоры, які цалкам паўтарае арыгінал кабіны цягніка.

— Хочаце паспрабаваць?

Саджуся ў крэсла машыніста. На экране камп'ютара — тунэль другой лініі метро, на панэлі — мноства пераключальнікаў: для адкрыцця дзвярэй, інфармавання пасажыраў. «Наступная станцыя метро — «Трактарны завод», — аб'яўляе знаёмы голас. Кранаюся з месца. Максімальна дазволеная хуткасць цягніка — 80 кіламетраў у гадзіну. Кажуць, сапраўдныя машыністы глядзяць толькі на дарогу, бо рукі ўжо памятаюць, дзе якія пераключальнікі. Але я не адрываю вачэй ад панэлі і толькі па падказцы інструктара паспяваю сарыентавацца. А дакладней, не паспяваю — праязджаю станцыю і спыняю віртуальны састаў далей, чым трэба.

— Грубая памылка. Гэта непавага да пасажыраў, — заўважае Яўген Талака.

У выпадку пазаштатнай сітуацыі машыністу даецца максімум пяць хвілін, каб прывесці састаў у рух. Гэта — у тэорыі, у рэальнасці будзе хвіліна-дзве. На трэнажоры адпрацоўваюць, што рабіць, калі здарылася адмова абсталявання ці кінуўся пад колы пасажыр. Машыністы, якія ўжо працуюць, рэгулярна праходзяць аварыйныя гульні па выхадзе ў выпадку няспраўнасці на рухомым саставе. Тых, хто не справіўся, праз 10 дзён чакае перездача. Зноў паказаў дрэнны вынік — да пабачэння.

Крыху пра працоўныя ўмовы. Заробак машыніста — вышэйшы за сярэднестатыстычны па краіне. Змена доўжыцца не больш за сем гадзін. Паўтары-дзве гадзіны ездзіш, паўгадзіны адпачываеш. Для гэтага ў метро ёсць асобныя пакоі — з тэлевізарам і більярдам. А пасля працоўнага дня машыністы самі мыюць свой цягнік.

Каб пераначаваць паміж зменамі, супрацоўнікі спыняюцца ў службовых кватэрах. Яны знаходзяцца каля станцый метро «Каменная Горка», «Магілёўская», «Фрунзенская», «Трактарны завод», «Пушкінская».

— На кватэрах ёсць дзяжурныя. Там ужо пасцелена, падушка ўзбіта, толькі што супу няма, — жартуе начальнік дэпо. — Раніцай супрацоўнікаў будзяць, заварваюць ім гарбату.

Перавучвацца на машыністаў ідуць прадстаўнікі розных прафесій. Міліцыянеры, пагранічнікі, ахоўнікі, электрыкі... Часта перакваліфікавацца хочуць і работнікі метро. Напрыклад, Павел Карчагін дагэтуль працаваў слесарам у дэпо «Магілёўская». Але быць машыністам, кажа, — мара дзяцінства.

— Мне цягнікі цікавыя. Раней глядзеў, як яны ездзяць, зараз буду кіраваць. Работа, вядома, адказная, але і прэстыжная. У машыніста заробак прыстойны, — разважае хлопец.

Па адукацыі Павел інжынер радыёэлектронікі, заканчваў БДУІР. Заўважае, што калі вопыт працы ў метро ёсць, то крыху лягчэй вучыцца, але курсы складаныя. «Вельмі шмат інфармацыі. Трэба добра ведаць састаў — механічнае, электрычнае абсталяванне, кіраванне. Шмат правілаў і інструкцый, якія мы павінны вывучыць на памяць».

Хлопец расказвае, што іх чакае пяць экзаменаў, потым два месяцы абкаткі і кантрольны іспыт на атрыманне правоў. Тыя восем месяцаў, што цягнуцца курсы, метро захавала за Паўлам яго сярэдні заробак.

> **«Здароўе ў машыніста мусіць быць, як у касманаўта. Зрок «адзінка», ціск 120/80, пульс не вышэй за 86 удараў у хвіліну. Узрост — да 40 гадоў».**

28-гадовы Мікалай Каленік з тэхнікай ніяк не звязаны. Ён прафесійна займаўся футболам, гуляў за розныя клубы.

— Чаму сышоў са спорту? Узрост, пастаянныя траўмы. Пераглядзеў свае перспектывы і вырашыў знайсці для сябе штосьці пастаяннае. Футбольная кар'ера хвалепадобная, а хацелася стабільнасці.

— Чула, у футбалістаў нядрэнныя заробкі.

— Не ў Беларусі, — усміхаецца Мікалай.

Вакансіі ён праглядаў, але нічога не зачапіла. Спрабаваў стаць турагентам — зразумеў, што не яго. На прафесію машыніста даўно звярнуў увагу і, параіўшыся з жонкай, вырашыў, што трэба дзейнічаць. Выпускніку БДУФК і трэнеру па спецыяльнасці на курсах прыйшлося няпроста.

— Электрыка, механіка, пнеўматыка — усе прадметы цяжкія. Калі штосьці ўпусціш, не справішся з работай.

Пакуль хлопец вучыцца, служба занятасці выплачвае яму невялікую стыпендыю.

— Складаны год. Змагаемся, — усміхаецца Мікалай. — Эканомім, ад многага даволася адмовіцца. Вялікі груз на плячах жонкі, якая працуе. Плюс прыходзіцца траціць тое, што адкладалі ў скарбонку.

Менеджар па продажах Дзяніс Кажарновіч пра курсы даведаўся праз аб'яву ў метро. Прызнаецца, што зацікавіў добры заробак. Дый прафесія годная, цікавая. А паколькі быць менеджарам хлопцу больш не хацелася («вялікая канкурэнцыя, складана нешта прадаць»), вырашыў асвойваць новую спецыяльнасць. Дзяніс вучыўся на слесара ў каледжы, нейкі час працаваў на шынамантажы — яго тэхнічныя веды якраз спатрэбіліся. Здароўе таксама ў парадку: раней займаўся кікбоксінгам.

Яўген Талака курсантаў падбадзёрвае: большасць будзе ездзіць на саставах новага пакалення. А пакуль да лістапада вучоба: да машыністаў, якія за суткі перавозяць тысячы пасажыраў і, можна сказаць, адказваюць за імідж сталіцы, патрабаванні высокія.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**

# ТВОРЧЫ ПРАРЫЎ РАДЗІКА БАТЫРШЫНА

## Кіраўнік найбуйнейшай тэлерадыёкампаніі краін Садружнасці адзначае юбілей

**28 ліпеня свой юбілей святкуе старшыня міждзяржаўнай тэлерадыёкампаніі «МІР», кандыдат філалагічных навук, прафесар Вышэйшай школы эканомікі Радзік БАТЫРШЫН.**



Радзік Батыршын нарадзіўся ва Уфе ў 1968 годзе. Падчас вучобы на філолага ў Башкірскім дзяржаўным універсітэце ён упершыню спрабуе сябе ў якасці журналіста ва ўніверсітэцкай газеце. Паралельна пачынае весці праграму на башкірскім Дзяржтэлерадыё, піша для рэспубліканскіх газет. Працягваць вучобу і працу прыязджае ў Маскву: паступае ў аспірантуру журфака МДУ, пачынае працаваць аглядальнікам аддзела рэспублік у «Независимой газете».

У 1995 годзе журналісцкі шлях прыводзіць яго на федэральнае тэлебачанне. Шэсць гадоў Батыршын аддае НТБ, куды прыходзіць як кансультант праграмы «Вынікі» і дзе пасля займае пасаду намесніка выканаўчага дырэктара. У 2001 годзе пераходзіць на УДТРК (ВГТРК): кіруе дырэкцыяй інтэрнэт-вяшчання, а потым, ужо ў статусе намесніка генеральнага дырэктара, узначальвае радыёстанцыю «Маяк». На гэтай пасадзе Батыршын працуе да лістапада 2007 года, калі ў яго жыцці пачынаецца эра МТРК «МІР».

Крыху больш чым за дзесяць гадоў яго кіраўніцтва кампанія з аднаго тэлеканала і радыёстанцыі становіцца садружнасцю рэсурсаў. Зараз у мультымедыйны холдынг уваходзяць тэлеканалы «МІР», «МІР 24», «МІР HD», радыёстанцыя «МІР», інфармацыйны інтэрнэт-партал mir24.tv і сістэма спадарожнікавай сувязі «МІР-Тэлепорт».

З 2007 года ахоп аўдыторыі павялічваецца амаль у дзевяць разоў: з 17 да 150 мільёнаў чалавек. Пастаянна расце і цікавасць у гледачоў. Напрыклад, у Беларусі тэлеканал «МІР» сёлета стаў самы хуткарослы па аўдыторыі. Тэлеканал уваходзіць у абавязковы агульнадаступны пакет тэлепраграм у Беларусі (чацвёртая кнопка). Тэлепраграмы беларускага прадстаўніцтва штогод заваёўваюць прызавыя месцы на нацыянальным тэлевізійным конкурсе «Тэлевяршыня», работнікаў адзначаюць урадавымі і дзяржаўнымі ўзнагародамі.

Тэлеканалы і радыёстанцыю МТРК глядзяць і слухаюць у 20 краінах. Не толькі ў дзяржавах СНД (а менавіта для іх і задумваўся «МІР» у 1992 годзе), але і ў Германіі, Чэхіі, Швейцарыі, краінах Балтыі і іншых. У Расіі, Беларусі, Казахстане, Арменіі і Кыргызстане тэлеканал «МІР» уваходзіць у нацыянальныя мультыплексы лічбавага вяшчання.

У апошнія дзесяць гадоў кампанія ажыццяўляе як тэхнічны, так і творчы прарыў. Лічыцца, што моду на тэлемасты ўвялі журналісты «МІРа». Напрыклад, на маштабнай акцыі «Вахта памяці» ў 2011 годзе аднначасова ў эфіры «вісела», кажучы мовай тэлежурналістаў, дзевяць тэлемастоў. Звычайна — два.

Адны з першых аўтары праграм «МІРа» адкрываюць для сябе і для гледачоў унутраны турызм: праязджаюць дзевяць тысяч кіламетраў па Транссібе, даследуюць старажытныя гандлёвыя шляхі, паказваюць сучасныя Таджыкістан, Узбекістан і стэпы Казахстана.

З прыходам Батыршына тэлеканал пачынае цыкл эксклюзіўных інтэрв'ю самага высокага ўзроўню. Толькі за 2017 год у эфір выходзяць гутаркі з прэзідэнтамі Расіі, Беларусі, Казахстана, Кыргызстана, Малдовы і Арменіі. У 2015 годзе атрымліваецца пагаварыць сам-насам, але пад прыцэлам тэлекамер, з Джонам Керы, на той момант дзяржсакратаром ЗША.

Творчы прарыў заўважаюць і гледачы, і тэлеэксперты. Калектыў «МІРа» двойчы атрымлівае прэстыжную тэлевізійную прэмію «Тэфі». У 2017 годзе становіцца лаўрэатам «Тэфі-Садружнасць». На рахунку кампаніі прэмія Папова, «Хрустальны компас», «Брэнд года», «Вялікая лічба — 2017» і яшчэ цэлы шэраг розных узнагарод. У 2010 годзе прафесійная супольнасць прызнае Батыршына медыяменеджарам года, а ў 2018 годзе кіраўнік МТРК «МІР» узнагароджваецца ордэнам Аляксандра Неўскага.

Радзік Батыршын часта паўтарае: «МІР» — гэта журналістыка факта». Усё вышэйпералічанае з пункту гледжання журналістыкі — факты, але для супрацоўнікаў і кіраўніка МТРК «МІР» — гэта вынік працы.

З гэтым цудоўным вынікам віншуем Радзіка Батыршына і жадаем яму творчых перамог, вялікіх лічбаў і новых гучных поспехаў!

УНП 100824385




## ВУЧЫСЯ, НЯБОЖА, ВУЧЭННЕ ПАМОЖА

У жыцці — гэта маё цвёрдае перакананне — кожнаму з людзей маладых патрэбен свой аксакал, чалавек, які падтрымаў бы, штосьці параіў, падказаў нейкія рашэнні. Бо розум, ён, як правіла, прыходзіць у сталым узросце, ды і то не заўсёды... І не да ўсіх.

...У той час гэта нікога не здзіўляла: працаваць я пачаў у 15 гадоў, аднachасова паступіў на вячэрняе аддзяленне ў тэхнікум. А там азірнуцца не паспеў — вучоба скончана, трэба паступаць у інстытут альбо служыць у войску. Я чамусьці выбраў другое і апынуўся ў зенітна-артылерыйскім палку.

На тое, каб асвоіць ваенную спецыяльнасць, часу ў мяне пайшло няшмат, можа з месяц.

Адзін раз я выстраліў з аўтамата Калашнікава (болей, шчыра кажучы, не хацеў), а далей толькі чысціў яго і... сумаваў.

Так-так, сумаваў, бо са мной, «такім граматным» (была ж адукацыя, прычым радыётэхнічная), не толькі сяржанты, але і афіцэры не ведалі, што рабіць.

А мне свой час марнаваць не хацелася, таму я стаў шукаць заняткі. Па-першае, узяўся чытаць мастацкую і гістарычную літаратуру, па-другое, вывучаў (хоць і з меншым поспехам, бо практыкі ніякай...) англійскую мову, па-трэцяе, вырашыў павысіць свой разрад па шахматах. А паралельна — бегаў, штурхаў штангу, падцягваўся на перакладзіне... Прычым не без поспеху, бо змог удасканаліць свой знешні выгляд, фігуру і на ўласнай скуры адчуць, што Гіпакрат меў рацыю: гімнастыка, хадзьба, фізічныя практыкаванні — гэта сіла, гэта здароўе.

А вось спорт — ужо трохі іншае. Гэта я таксама на сабе праверыў, калі з прыцэлам на трэці разрад стаў цягаць штангу і досыць хутка адчуў, дзе знаходзіцца сэрца і як яно можа балець.

Загрымеў, карацей, у шпіталь, два тыдні палячыўся.

...Адтуль, помню, вярнуўся позна: саслужыўцы мае даўно павячэралі. А я — галодны, злы... Да таго ж — каўнер не зашпілены, шапка ў руках... І, як на ліха, камандзіра ўзвода насустрач нясе.

Ён, вядома ж, зрабіў мне заўвагу наконт знешняга выгляду. Я ў адказ (забыў, дзе знаходжуся)... пажартаваў: маўляў, як клічуць, так і адклікаюцца, то-бок, калі не кормяць, дык і службы няма...

Ён мне — трое сутак гаўптвахты!

На тым і разышліся: трое дык трое...

Я кніжак з сабою набраў — паўстаў перад старшыной, а потым — перад капітанам, які на «губе» прымаў папаўненне.

Той загадаў мне зняць рэмень, «ачысціць» кішэні і ўзяўся за кнігі:

— Карл Маркс? — вылупіў вочы ён, — «Крытыка гоцкай праграмы»? Фрыдрых Энгельс? «Дыялектыка прыроды»? Ты што — здзекуешся? На «губе» будзеш Маркса чытаць? — пазелянеўшы ад злосці, пытаўся ён.

— ...І Леніна, — дадаў я, бо капітан узяўся за ягоную кнігу:

— «Ма-тэ-ры-я-лізм і...» Што? — учытваўся ў назву, — «эм-пі-ры...»

Слова «эмпірыякрытыцызм» не давалася яму нават па складах. (Ён чытаў «...крэтынізм». Не верыў, падобна, што Ленін пра яго пісаў, пачынаў чытаць спачатку... А ўжо як пры тым мацюкаўся!..)

Злавіўшы паўзу, я хацеў сказаць капітану, што пасля службы збіраюся паступаць у інстытут, што там, відаць, прыйдзецца вывучаць вось гэтыя творы, таму вырашыў хоць пазнаёміцца... Але адчуў, што ніхто мяне тут не пачуе, і прамаўчаў.

Капітан тым часам згроб усе мае (дакладней — бібліятэчныя) кнігі і некуды з імі пайшоў.

Дзе быў, не ведаю, а вярнуўся недзе праз гадзіну і, на шчасце, з кніжкамі. Сказаў, калі коратка, што такіх «мудрацоў», як я, ён ніколі не бачыў.

Але ж чытаць не перашкаджаў. Так што я не сумаваў, вучыўся жыццю — нават на гаўптвахце.

**Я. Кавальчукоўскі,**
*г. Мінск.*

## ДОБРАЯ БЫЛА ГУЛЬНЯ!

Часам, ужываючы пэўныя словы, мы нават не задумваемся пра іх паходжанне. Вось кажам «злыдзень», «хапун», «воспа», «чума», «трасца», «халера» і лічым, што ўсё гэта хваробы альбо нейкая ляянка. А вось і не: першапачаткова так называліся злыя духі.

Іх, агульнавядомых, або, скажам так, «афіцыйных», шмат, а дадайце сюды мясцовых...

Не ведаю, як у іншых вёсках, а ў нас была сярод іх свая, «фірменная» пачвара. Звалі яе трохі дзіўна — Баба Бяскішкая, і «служыла» яна самай страшнай пужалкай. Усе дзеці ведалі, што тая з ранняга ранку да позняга вечара толькі і ведае, што высочвае непаслухмяных малых. І калі хто з іх нашкодзіць, то літасці не чакай — з канцамі, як той казаў, бо ні ўцячы, ні адпрасіцца ўжо немагчыма. Карацей, Баба Яга ў параўнанні з ёй — проста душка ці сястрыца Алёнка.

Шчасце яшчэ, што гэта Бяскішкая па хатах не хадзіла, пасялялася там, куды дзецям нельга: у чужых садах ды гародах (бо малыя любілі лазіць туды па... усё. Чыпсаў жа не было), у пасадках акацыі бліз чыгункі (дзе хадзіць цягнікі), у алешніку (дзе балота і дрыгва), ля Дняпра (дзе глыбокая вада)... Усюды спраўлялася! (Ці, можа, і не адна такая была: можа, з хеўрай сабе падобных?)

А дзіцячых садкоў жа тады ніякіх, малыя ў вёсцы, можна сказаць, без нагляду — бацькі цэлы дзень на працы.

У некага, праўда, дзядулі-бабулі былі, але ж ці ўпільнуюць яны тых жэўжыкаў, ці «ўпасуць», калі іх магнітам цягне да той жа рэчкі?

Вось жанкі і надумалі на беразе «пасяліць» жывую Бабу Бяскішкую.

На гэтую ролю падыходзіла цётка Кулёза (у сэнсе — Куліна). Жыла яна паблізу ракі, трохі прамышляла варажбой ды чараўніцтвам, хадзіла з кійком, але ж досыць жвавенька.

Дык жанчыны да яе: маўляў, бабачка Кулінaчка, папужала б ты нашых паршывцаў... Ім кажы ці не кажы — да Дняпра бягуць. Дык можа, пасядзела б ты ў кустах, пераняла б іх, каб пагібелі якой не знайшлі? А мы табе зранку аладачак прынясём — са смятанкай, з варэннечкам...

Баба Кулёза трохі падумала і згадзілася. Бо што ёй: хоць які ды занятак (да таго ж карысны!), хоць якая ды плата, бо аладачкі ёй якраз па зубах (дакладней — па іх поўнай адсутнасці).

Аднак есці штось на дармаўшчыну баба Кулёза не збіралася і дaручэнне прыняла ўсур'ёз. На благі бок вывернула стары, сем разоў парваны кажух, растрапала рэшткі сівых валасоў (ну каму, як не ёй, ці не самай старэйшай, ведаць, як павінна выглядаць Баба Бяскішкая?), на галаву адзін рог прыстроіла, кіёк у рукі ўзяла. Зірнула ў вялікае люстэрка — сама жахнулася.

Назаўтра заступіла на дзяжурства: гэта значыць, ва ўсёй «красе» затаілася ў кустах, аладачкі з місачкі есць і, падслепаватая, але ж бачыць — з правулку дзець пакаваліся. Баба місачку ўбок, падпусціла іх трохі бліжэй, кій-рог уверх і грозна ім:

— Ме-е-е!..

Дзеці так хутка зроду не бегалі! І, вядома ж, далекавата спыніліся...

Але потым, адсопшыся, думаць пачалі: «А чаму гэта Бяскішкая іх не пахапа́ла — нікога? Чаму яны ўцяклі, калі тое ў прынцыпе немагчыма? Можа, гэта не яна была?.. Ці яна, але ўжо састарэлая? Ну, як баба Кулёза?

На наступны дзень, як ні страшна было, хлопчыкі рашылі гэта праверыць: дружнай бандай падаліся ў бок тых самых кустоў. Толькі падышлі, — адтуль зноўку:

— Ме-е-е...

Дзеці ходу!

Праўда, самаму маленькаму не пашчасціла: зачапіўся ножкай за купіну, упаў, моцна пабіўся, але ж нават не пікнуў: запоўз у вялікі куст, сядзіць там у крапіве і не дыхае, бо зараз жа тая Бяскішкая...

А яна і сапраўды тут як тут: вылезла, сцягнула з галавы рог і... зарагатала.

Хлопчык вачам не паверыў: баба Кулёза?!

Ён з ёй гусей не пасвіў, то-бок кантактаў не меў, таму з хованкі не вылез: пачакаў, пакуль тая нарагочацца ды пойдзе дадому. А ўжо тады і ў слёзы, і ў вёску — кулём, да сваіх.

...Сябры, убачыўшы малога жывым (а яны ўжо і «развіталіся»!), што называецца, выпалі ў асадак, а потым, пачуўшы, як і што там было, вырашылі... адпомсціць. Назаўтра стварылі «войска», набралі ў кішэні камянёў і рушылі да «ахоўнага пункта».

Як і трэба было чакаць, насустрач ім зноў данеслася «Ме-е-е...», у адказ на якое са свістам, нібы з гарматы, паляцелі камяні, пачуліся крыкі: «Авоечкі, авой! А я ж вам зараз, паршыўцам...»

12.4. Победители, претендующие на получение призов, обязуются заполнить и подписать все необходимые для их получения документы, предоставляемые Организатором, выполнить все условия, предусмотренные правилами, а также формальности, необходимые для получения призов.

**13. Наименование печатного издания средства массовой информации для публикации правил и результатов розыгрыша, сроки публикации**.

13.1. Правила Рекламной игры подлежат публикации в газете «Звязда» до начала Рекламной игры.

13.2. Результаты розыгрыша Рекламной игры подлежат публикации в газете «Звязда» не позднее 18 декабря 2018 года, а также размещению на сайте mmbank.by.

14. Общие положения.

14.1. Все возможные вопросы и претензии участников в отношении организации и условий передачи призов должны быть адресованы Организатору Рекламной игры.

14.2. Информацию об условиях участия и проведения Рекламной игры можно получить по телефону 5 222 111 (МТС, Velcom, Life), а также на сайте mmbank.by.

14.3. Организатор не вступает в споры между участниками относительно определения собственника выигранного приза и/или претендентов на получение приза.

14.4. Организатор не несет ответственности за качество работы почтовых служб, в частности за недоставку либо несвоевременную доставку почтовой корреспонденции.

Свидетельство о государственной регистрации рекламной игры № 3332 от 25.07.2018 г. выдано Министерством антимонопольного регулирования и торговли Республики Беларусь



Центр Промышленной Оценки

- Организация аукционов
- Оценка всех видов имущества

**Извещение о проведении повторного аукциона**

| | | | |
|---|---|---|---|
| **Организатор аукциона** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа 5/2, пом. 1703, оф. 4б | | |
| **Продавец** | СООО «Белавтотранзит», г. Минск, пр-т Победителей, 31-1 | | |
| **Предмет аукциона** | | | |
| **Месторасположение предмета аукциона:** г. Брест, ул. Писателя Смирнова, 68 | | | |
| Наименование | Назначение | Общ. пл. | Инв. номер |
| **Контора** | Здание административно-хозяйственное | 273,0 кв. м | 100/С-60213 |
| **Здание склада** | Здание специализир. складов, торговых баз, баз материально-технич. снабжения, хранилищ | 1325,1 кв. м | 100/С-47349 |
| **Котельная** | Здание специализированное иного назначения | 35,8 кв. м | 100/С-47347 |
| **Гаражи** | Здание специализир. автомоб. транспорта | 568,7 кв. м | 100/С-60212 |
| Составные части и принадлежности: три забора, ворота | | | |
| Имущество, входящее в состав лота: **асфальтированная площадка**, **две металлические емкости** по 6 куб. м, **стоянка для автомобилей, дорожка тротуарная с бордюрным камнем** | | | |
| **Сведения о земельном участке**: пл. **0,6789** га, предоставлен продавцу на праве аренды сроком по 12.07.2050 для размещения объектов иного назначения | | | |
| **Начальная цена с НДС 20 % – 532 776,20 бел. руб.** (снижена на 30 %) | | | |
| **Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона перечисляется на счет BY92BELB30120048350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; ОКПО 378531865000, получатель платежа ООО «ИПМ-Консалт оценка», УНП 191224638 | | | |
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **15** рабочих дней после проведения аукциона | | |
| **Условия оплаты предмета аукциона** | | | |
| Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5%) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после подписания договора купли-продажи | | | |
| Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by | | | |
| Предыдущие извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 07.06.2018 | | | |
| Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия | | | |
| **Дата и время проведения аукциона** | 16.08.2018 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, оф. 4б, ООО «ИПМ-Консалт оценка» | | |
| **Дата и время окончания приема документов** | 14.08.2018 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, оф. 4б, ООО «ИПМ-Консалт оценка» | | |
| **Тел.: +375 17 280-24-41; +375 29 317-95-42. Email: auction@ipmconsult.by** | | | |

## ПС ООО «Термоблок» извещает о проведении аукциона по продаже имущества в связи с ликвидаций

Продавец и организатор торгов: производственно-строительное общество с ограниченной ответственностью «Термоблок», г. Минск, ул. Освобождения, 9а-101,

Ликвидатор – Марковец Татьяна Леонидовна, тел. +375 17 285 16 52.

Требования и порядок проведения торгов определяются Положением о порядке проведения продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов, утвержденным Постановлением Совета Министров Республики Беларусь № 16 от 08.01.2013 г. «О некоторых вопросах продажи имущества ликвидируемого должника».

Дата проведения аукциона: 27 августа 2018 г. в 11.00.

Место проведения аукциона: г. Минск, ул. Освобождения, 9а.

Место нахождения продаваемого имущества:

1) г. Минск, ул. Бехтерева, 5 (лоты 1-5, 7,17,18).

2) г. Минск, ул. Освобождения, 9а (лоты 6, 8-16, 19).

Заявления в соответствии с законодательством на участие принимаются с 9.00 до 13.00 в будние дни по адресу: г. Минск, ул. Освобождения, 9а-101 с 25.07.2018 по 25.08.2018 г.

Шаг аукциона – 5 % от начальной цены лота.

Порядок ознакомления: в будние дни с 9.00 до 13.00. Ответственное лицо Т. Л. Марковец, тел. +375 17 285 16 52.

Задаток 0,01 % от начальной цены предмета аукциона перечисляется по следующим реквизитам р/с № BY77BLBB30120101001531001001, КОД БАНКА: BLBBBY2X, в ОАО «БЕЛИНВЕСТБАНК», г. Минск.

Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по лоту (указывается № лота, дата аукциона).

Задаток перечисляется не позднее срока окончания приема документов на участие в аукционе.

Участник, желающий участвовать в аукционе в отношении нескольких лотов, вносит задатки в размере, установленном для каждого из лотов.

Победитель аукциона возмещает Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона в течение 5 (пяти) дней с даты проведения аукциона.

Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять) рабочих дней после проведения аукциона.

Срок оплаты: не более 5 (пяти) рабочих дней со дня заключения договора купли-продажи.

В случае признания торгов несостоявшимися в связи с тем, что заявление на участие было подано только одним участником, либо для участия в них явился только один участник, возможна продажа предмета торгов этому участнику по начальной цене, увеличенной на 5 %.

Список имущества:

| № лота | Наименование объекта | Начальная стоимость (с НДС), руб |
|---|---|---|
| 1 | Автомобиль Форд-Транзит гр/пассаж. (гос. № АА 0155-7), 1992 | 2800 |
| 2 | Автомобиль ГАЗ-2752 (грузо- пассажирский) (гос. № АЕ 8878-7), 2008 | 3000 |
| 3 | Автомобиль ГАЗ 3110 5 (легковой) (гос. № 9135 НН-7), 2005 | 3000 |
| 4 | Автомобиль Форд-Транзит (легковой) (гос. № 41К Т/BY 9234), 1998 | 5200 |
| 5 | Автомобиль Форд-Транзит (г/борт. двухкабинник) (гос. № АА 9911-7), 1993 | 3000 |
| 6 | Сейф 140/2 Т-4, 1998 | 366 |
| 7 | Контейнер металлический профилированный, 2009 | 426 |
| 8 | Компьютер ALM 1H33/2L111, 2004 | 207 |
| 9 | Компьютер ALM 1H33/2L111, 2004 | 190 |
| 10 | Монитор LG Flatron L1717S, 2006 | 125 |
| 11 | Монитор Samsung 740N, 2006 | 91 |
| 12 | Системный блок ПЭВМ А-1-Pentum4, 2006 | 270 |
| 13 | Мониторинг Philips 170S7, 2007 | 74 |
| 14 | Мониторинг Philips 170S7, 2007 | 74 |
| 15 | Принтер HP Лазерный P2035, 2010 | 114 |
| 16 | Монитор 22 Samsung B2230N, 2010 | 82 |
| 17 | Лебедка МТМ – 16,7,2000 | 39 |
| 18 | Лебедка МТМ – 16,7 2003 | 143 |
| 19 | Принтер HP LaserJet P2015, 2014 | 96 |

УНП 101001531

Свидетельство о государственной регистрации СП «ГЕЙРИВ» ООО, зарегистрированного решением Министерства иностранных дел от 03.03.2000 г. № 1053/2 (УНП 100710474), считать недействительным в связи с его утерей.

# Усходні гараскоп на наступны тыдзень



**АВЕН.** Лепш за ўсё пайсці ў адпачынак ці хоць бы знізіць нагрузку і тэмп працы. Вам будзе ўласцівая залішняя прасталінейнасць, але паспрабуйце ўсё ж такі не пасварыцца з сябрамі і калегамі. Абвострыцца пачуццё гумару. Калі не будзеце залішне прынцыповыя, то ва ўсіх бітвах з апанентамі атрымаеце перамогу. Паездка на дачу ці ў лес па грыбы дазволіць развеяцца і ўбачыць сітуацыю, якая склалася, збоку.



**ЦЯЛЕЦ.** На гэтым тыдні можа паўстаць толькі адна праблема, якая ўскладняе ўзаемаадносіны з навакольным светам, — імкненне ахапіць неабсяжнае. Практычна ў любой сферы вас чакаюць змены ў бок павелічэння. Пашырыцца кола зносін, узнікнуць новыя абавязкі і даўгі. Магчыма, з'явіцца прычына, якая пакліча ў дарогу. Не выключана, што ў пятніцу давядзецца патраціць час і грошы, каб дапамагчы сябрам. У нядзелю старайцеся захоўваць разважлівасць і спакой падчас сямейных рознагалоссяў.



**БЛІЗНЯТЫ.** Вы будзеце асабліва мілыя і вытанчаныя. Захочацца больш прыгажосці, мастацтва, музыкі і менш прозы жыцця. Сувымярайце свае сілы і магчымасці, а таксама свае амбіцыі і планы па заваяванні новых вяршынь у кар'еры, творчасці або ў бізнесе. У сераду нарэшце зможаце вырашыць некалькі самых розных спраў адным махам. У пятніцу ваша настойлівасць паспрыяе станоўчым зрухам. Чакайце прыбытку і поспеху.



**РАК.** Не пераацэньвайце сваёй значнасці, каб не парушыць баланс з навакольным светам. Асабліва вялікая небяспека сапсаваць адносіны з калегамі. Калі знойдзецца магчымасць адправіцца ў падарожжа, ён абавязкова трэба скарыстацца — яно акажацца прыемным і займальным. У асабістым жыцці праявіце ўсю сваю дыпламатычнасць. Будзьце ўважлівыя, клапатлівыя, навучыцеся слухаць.



**ЛЕЎ.** Найвышэйшую каштоўнасць на гэтым тыдні набудуць бескарыслівасць і чысціня намераў. Вам практычна нічога не ўдасца зрабіць для сябе, аднак дзеянні альтруістычнага характару будуць мець ашаламляльны поспех. У аўторак варта як мага менш трапляцца на вочы начальству, вам жа не патрэбныя новыя заданні і дадатковая нагрузка? Субота — прыдатны дзень для наводзін парадку як у справах, так і ў думках.



**ДЗЕВА.** Не перагружайце сябе звышурочнай працай, яна ўсё роўна не ўцячэ ад вас. А вось лета трэба лавіць за хвост. Можаце апынуцца перад выбарам, па якой дарозе пайсці, але які б шлях вы не выбралі, ён прывядзе да вызначанай мэты, толькі, магчыма, не хутка. У панядзелак і аўторак на вас абрынецца лавіна разнастайных спраў і клопатаў. Калі не будзеце з імі спраўляцца, то папрасіце дапамогі ў сяброў. У чацвер чакаецца канструктыўная размова з начальствам, вас пачуюць і ацэняць па заслугах. Выхадныя пажадана правесці ў коле блізкіх людзей.



**ШАЛІ.** На гэтым тыдні цэнтр сусвету будзе знаходзіцца дзесьці ў непасрэднай блізкасці. Вы прыцягваеце да сябе ўвагу, часта позіркі захаплення. Аднак ад гэтага можна хутка стаміцца. У чацвер можаце адкрыць для сябе штосьці новае і выгаднае ў дзелавым партнёрстве, атрымаць дапамогу і вызваленне ад мінулых даўгоў, як фінансавых, так і кармічных. Ганіце прэч няўпэўненасць і сумненні, бо наступіў час, калі вы можаце многае паспець рэалізаваць і ўвасобіць у жыццё.



**СКАРПІЁН.** Калі паверыце ў сябе і ва ўласныя магчымасці, атрымаецца ажыццявіць свае жаданні і мары. Час хаатычнасці і неразбярыхі падышоў да канца, яму на змену прыходзіць сітуацыя, якая дазваляе навесці парадак у думках, справах і ўчынках. Прафесійныя зносіны і кантакты акажуцца вельмі карыснымі. Вас чакаюць радасныя падзеі і прыемныя навіны.



**СТРАЛЕЦ.** Дзеля дасягнення мэты давядзецца ахвяраваць вольным часам і планамі. Але вас павінна падтрымаць тая акалічнасць, што ўсё, што вы робіце, можа абярнуцца дабром. У сераду варта ўзяць адказнасць на сябе, у вас будзе шмат магчымасцяў бліснуць талентамі. У пятніцу лепш весці справы сумленна і адкрыта: толькі такім чынам зможаце пазбегнуць праблем. У нядзелю, калі блізкія людзі будуць сварыцца, захоўвайце нейтралітэт, і тады перамір'е наступіць значна хутчэй, чым звычайна.



**КАЗЯРОГ.** Усе падзеі тыдня будуць праходзіць даволі мякка і павольна. Вам жа важна плыць па цячэнні і не шукаць для сябе дадатковай нагрузкі. У аўторак лепш заняцца паўсядзённымі справамі, у чацвер не варта прымаць паспешлівых рашэнняў, перш неабходна ўсё старанна прадумаць. Зносіны з сябрамі і аднадумцамі парадуюць новымі ідэямі і нядрэннымі перспектывамі ў выхадныя.



**ВАДАЛІЎ.** Магчымыя нестандартныя сітуацыі, справіцца з якімі зможаце дзякуючы знаходлівасці і рашучасці. Імаверны поспех у творчай і навуковай дзейнасці. Старайцеся сумленна выконваць службовыя абавязкі. Спрэчкі і разборкі ў сям'і не прынясуць вынікаў, лепш проста на час забыцца пра праблему. У канцы тыдня да вашых слоў можа прыслухацца начальства, але толькі ў тым выпадку, калі яны будуць карэктна сфармуляваны. Выхадныя прысвяціце дому і дзецям, але вылучыце дастаткова часу для адпачынку.



**РЫБЫ.** Пажадана сувымяраць свае жаданні з магчымасцямі і не абяцаць таго, чаго вы не зможаце зрабіць. Гэтыя дні могуць прынесці шмат праблем і непаразуменняў тым, хто не схільны думаць пра наступствы сваіх дзеянняў. Паспрабуйце засяродзіцца на самым галоўным, і не распыляцца і не марнаваць час на пустыя размовы. Надыходзіць новы этап вашага духоўнага развіцця. Не выключана рамантычнае знаёмства.

# СЁННЯ

## Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 5.15 | 21.17 | 16.02 |
| Віцебск — | 4.58 | 21.12 | 16.14 |
| Магілёў — | 5.05 | 21.07 | 16.02 |
| Гомель — | 5.08 | 20.56 | 15.48 |
| Гродна — | 5.31 | 21.31 | 16.00 |
| Брэст — | 5.39 | 21.24 | 15.45 |

## Месяц

*Першая квадра 19 ліпеня.*
*Месяц у сузор'і Вадаліва.*

## Імяніны

*Пр.* Антона, Гаўрылы, Івана, Сцяпана, Юльяна.
*К.* Ганны, Гражыны, Міраславы, Аўхіма, Лаўрэнція.



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

# ЗАЎТРА




## Даты | Падзеі | Людзі

**27 ЛІПЕНЯ**




**1898** год — нарадзіўся (Полацкі раён) Сцяпан Пятровіч Сямашка, беларускі пісьменнік. У 1926—1929 гадах — рэдактар газеты «Чырвоная Полаччына», з 1930-га — супрацоўнік часопіса «Шляхі калектывізацыі», газет «Калгаснік Беларусі», «Звязда». У 1945—1946-м быў адказным сакратаром Камісіі па гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. Аўтар вершаў, апавяданняў, аповесцяў. Памёр у 1965 годзе.

**1938** год — нарадзіўся (вёска Рачэнь Любанскага раёна) Леанід Васілевіч Кукраш, беларускі вучоны ў галіне раслінаводства, селекцыянер, акадэмік НАН Беларусі, доктар сельскагаспадарчых навук, прафесар, заслужаны дзеяч навукі Беларусі. Аўтар больш як 180 навуковых прац у галіне селекцыі, земляробства і раслінаводства. Унёс уклад у распрацоўку тэхналогіі вырошчвання зернебабовых культур, вырашэнне праблем вытворчасці расліннага бялку, павышэнне прадукцыйнасці збожжавай гаспадаркі. Пад яго кіраўніцтвам і пры непасрэдным удзеле ў краіне шырока разгарнуты работы па селекцыі гароху і яравой вікі.

**1990** год — Вярхоўны Савет БССР прыняў Дэкларацыю аб дзяржаўным суверэнітэце Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі. У Дэкларацыі гаворыцца, што Вярхоўны Савет абвясціў «поўны дзяржаўны суверэнітэт БССР як вяршэнства, самастойнасць і паўнату дзяржаўнай улады ў межах яе тэрыторыі, правамоцнасць яе законаў, незалежнасць рэспублікі ў знешніх адносінах» і заявіў аб імкненні стварыць прававую дзяржаву. Такім чынам Канстытуцыя і законы рэспублікі набылі прыярытэт над заканадаўствам СССР, хоць не адпрэчвалі знаходжанне Беларусі ў яго складзе.




**1853** год — нарадзіўся Уладзімір Караленка, рускі пісьменнік, публіцыст, грамадскі дзеяч, ганаровы акадэмік Пецярбургскай АН (у 1902 годзе адмовіўся ад звання). З 1894 года член рэдакцыі, рэдактар народніцкага часопіса «Русское богатство». Аўтар нарысаў і апавяданняў «Сон Макара», «У дурным грамадстве», аповесці «Сляпы музыка», мемуараў «Гісторыя майго сучасніка», літаратурна-крытычных артыкулаў. Быў знаёмы з Я. Купалам. Яго творы друкаваліся ў беларускіх газетах. У 1922 годзе ў тэатры імя Я. Купалы (БДТ-1) інсцэніраваны яго твор «Лес шуміць». Памёр у 1921 годзе.



**1918** год — СНК РСФСР прыняў Дэкрэт аб недапушчальнасці сумеснай службы сваякоў у савецкіх установах.

**1953** год — у мястэчку Пханмунджом галоўнакамандуючым Карэйскай народнай арміі і камандуючым кітайскімі народнымі добраахвотнікамі, з аднаго боку, і галоўнакамандуючым войскамі ЗША ад імя ўзброеных сіл 16 дзяржаў, якія ўдзельнічалі ў агрэсіі супраць КНДР, з другога, было падпісана Пагадненне аб перамір'і. Дзень заканчэння Карэйскай вайны 1950—1953 гадоў.

## УСМІХНЕМСЯ

Мужык пасля доўгай спрэчкі з цешчай звяртаецца да сына:
— Сынок, прынясі, калі ласка, бабулі крэм для вуснаў.
— Які крэм?
— Такі ў цюбіку, на ім «Мамант» напісана.

**Каб пахудзець, вырашыла не есці тлушч, маянэз, каўбасу, сыр і дэльфінаў.
Пакуль удалося цалкам выключыць з рацыёну толькі дэльфінаў.**

Віця і Надзя адправілі свае імёны для тэсту на сумяшчальнасць, і ім прыйшоў адмоўны адказ. Вырашылі разводзіцца, хоць іх адгаворвалі і дзеці, і ўнукі, і праўнукі.

**Як можна лічыць мяне баязліўцам, калі я п'ю лекі, прачытаўшы пра ўсё іх пабочныя эфекты?!**




ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.
РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: В. АНУФРЫЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Передрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by
ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by
Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 2696.
Нумар падпісаны ў 19.30 26 ліпеня 2018 года.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА

27 ліпеня 2018 г. № 30 (463)



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

# СЭРВІС І КОШТЫ ЯК У ГОРАДЗЕ

## Дзяржава і бізнес працягваюць сумесна вырашаць праблемныя пытанні вясковага гандлю

**ЗАБЕСПЯЧЭННЕ сельскага насельніцтва адпаведнай гандлёвай інфраструктурай доўгі час з'яўляецца складаным пытаннем, якое спрабуюць вырашыць у многіх раёнах краіны. У адных — квітнее спажыўкааперацыя, у іншых на змену дзяржаўным сеткам прыходзяць прыватнікі. Перад тымі і іншымі стаіць складаная задача па забеспячэнні высокай якасці абслугоўвання і падтрымання шырокага асартыменту тавараў. У сельскай мясцовасці гэта досыць праблематычна, бо пакупная здольнасць там ніжэйшая, ды і тавараабарот значна меншы, чым у горадзе, а прадукты людзям патрэбныя. Дык што ж рабіць?**

стар. 3



НАД ЧЫМ ПРАЦУЕМ

# НОВЫ ПОГЛЯД НА СТАРЫЯ ПРАБЛЕМЫ ВОДАЗАБЕСПЯЧЭННЯ

**Яшчэ ў канцы мінулага года на пасяджэнні Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання, прысвечаным праблемам жыллёва-камунальнай гаспадаркі, старшыня Савета Рэспублікі Міхаіл МЯСНІКОВІЧ даручыў старанна вывучыць усе болевыя пункты, звязаныя з забеспячэннем жыхароў краіны якаснай пітной вадой. Зараз ідзе дапрацоўка паправак у Закон Рэспублікі Беларусь «Аб пітным водазабеспячэнні», які быў прыняты яшчэ ў 1999 годзе і патрабуе карэкціроўкі з улікам патрабаванняў часу і сітуацыі, якая склалася ў воднай гаспадарцы краіны.**

Спецыялісты спадзяюцца, што новае заканадаўства дасць магчымасць вырашыць найбольш вострыя праблемы, якія наспелі ў сістэме забеспячэння насельніцтва якаснай пітной вадой.

### Праект закона чакае папраўкі

Па словах **старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Аляксандра ПАПКОВА,** была праведзена вялікая работа па дапрацоўцы праекта закона «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у некаторыя законы Рэспублікі Беларусь па пытаннях пітнога водазабеспячэння».

З улікам глыбокага вывучэння найбольш уразлівых месцаў сістэмы водазабеспячэння ва ўсіх рэгіёнах краіны праект закона будзе прадстаўлены са значнымі зменамі.

Напрыклад, у новым заканадаўстве будзе прадугледжана магчымасць будаўніцтва вулічных сетак пітнога водазабеспячэння для жыллёвага фонду з прыцягненнем сродкаў грамадзян.

Таксама прапануецца ўстанавіць абмежаванні для будаўніцтва прамысловымі прадпрыемствамі ведамасных водазаборных збудаванняў, калі ў існуючых сістэм водазабеспячэння ёсць тэхнічныя магчымасці для іх абслугоўвання.

стар. 3

## Інстытут для экспертаў



Хто павінен заказваць кадры? стар. 2

## «Мэтанакіраваны» партал





У Беларусі ствараецца сайт для 17 Мэт устойлівага развіцця стар. 2

## Рытэйлер ідзе





Як на Аршаншчыне змяняецца сельскі гандаль стар. 3

## Мясцовы час



Новы праект «МС» аб рэгіянальных ініцыятывах стар. 15

## Юбіляр на ўсе 100!



Пашпарт для стагадовай жыхаркі Ганцавіцкага раёна стар. 16

ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЯ, 9



# Гатовы падтрымаць жанчын

## *Старшыня БСЖ узяла ўдзел ва ўстаноўчай канферэнцыі аднаго з падраздзяленняў арганізацыі*

**Намеснік старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі, старшыня Беларускага саюза жанчын Мар'яна ШЧОТКІНА ўзяла ўдзел ва ўстаноўчай канферэнцыі Саюза жанчын Міністэрства надзвычайных сітуацый.**

«Мы заўсёды гатовыя прыняць у свае шэрагі жанчын, якія хочуць удзельнічаць у жыцці краіны. Будзем больш актыўна вылучаць свае кандыдатуры на кіраўнічыя пасады, прымаць удзел у заканатворчай дзейнасці, падтрымліваць жаночае прадпрымальніцтва», — адзначыла ў інтэрв'ю журналістам Мар'яна Шчоткіна.

Яна таксама расказала аб праектах, якія рэалізуюцца саюзам: «Што датычыцца асноўных напрамкаў дзейнасці, у Год малой радзімы БСЖ рэалізуе праекты, звязаныя з гісторыяй і культурай краіны. Шмат увагі ўдзяляецца сямейнай праблематыцы, аказанню дапамогі дзецям, маладым сем'ям, культываванню ў грамадстве сямейных каштоўнасцяў. У прыватнасці, па традыцыі ў час рэспубліканскай акцыі «Збярэм партфель разам» будзе аказана дапамога сем'ям у падрыхтоўцы дзяцей да школы. Развіваецца міжнароднае супрацоўніцтва, умацоўваюцца сувязі з жанчынамі свету. Мэты жаночых арганізацый — па-за палітыкай. Гэта мір, стабільнасць, здароўе, магчымасці для жанчын у плане прафесійнага росту, самарэалізацыі».



# «Мэтанакіраваны» партал

## *Сайт, на якім будзе размешчана інфармацыя аб 17 Мэтах устойлівага развіцця, распрацуе Белстат*

**У Беларусі да канца года створаць партал з інфармацыяй аб дасягненні краінай Мэт устойлівага развіцця. Пра гэта намеснік старшыні Савета Рэспублікі, нацыянальны каардынатар па дасягненні МУР Мар'яна Шчоткіна заявіла ў эфіры тэлеканала «Беларусь 1».**

«У нас няма адзінага органа, які збіраў бы ўсю інфармацыю, стварыў адзіны партал, дзе б уся гэтая інфармацыя акумулявалася, усімі вывучалася, узбагачалася, правяралася, і быў бы адзіны інфармацыйны рэсурс, якім можна было б карыстацца, — сказала Мар'яна Шчоткіна. — Гэтую працу каардынуе Белстат, які да канца года створыць адпаведны нацыянальны партал».

Многія краіны працуюць над стварэннем падобных парталаў. «Калі ён будзе створаны ва ўсіх дзяржавах, можна будзе заходзіць туды і атрымліваць інфармацыю», — заўважыла нацыянальны каардынатар.

Мар'яна Шчоткіна дадала, што ў Беларусі прыняты эфектыўныя меры для арганізацыі і сістэматызацыі работы па дасягненні Мэт устойлівага развіцця. Усе 17 МУР разбітыя на паказчыкі і замацаваныя за дзяржаўнымі органамі. «Гэта значыць, што кожны ведае зону сваёй адказнасці», — звярнула ўвагу яна.

«І вельмі важна, каб ад нацыянальнага ўзроўню мы перайшлі на рэгіянальны: распрацавалі паказчыкі для абласцей, горада Мінска. Гэтым таксама займаецца Белстат», — сказала намеснік старшыні Савета Рэспублікі.

Парадак дня ў галіне ўстойлівага развіцця на перыяд да 2030 года дзяржавы — члены ААН прынялі 25 верасня 2015 года. Ён уключае спіс з 17 мэт, накіраваных на ліквідацыю беднасці, барацьбу з няроўнасцю і несправядлівасцю, а таксама на вырашэнне праблем, звязаных са змяненнем клімату.

Беларусь ужо распачала шэраг важных крокаў для дасягнення МУР. Урадам адобрана Нацыянальная стратэгія ўстойлівага сацыяльна-эканамічнага развіцця на перыяд да 2030 года. Выбудавана Нацыянальная архітэктура па дасягненні МУР. У яе складзе — Савет па ўстойліваму развіццю, парламенцкая група па МУР, а таксама партнёрская група ўстойлівага развіцця.

У ЦЭНТРЫ ЎВАГІ

# ІНСТЫТУТ ДЛЯ ЭКСПЕРТАЎ

**Міхаіл МЯСНІКОВІЧ, старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі, здзейсніў рабочую паездку ў Савецкі раён Мінска. Падчас яе спікер наведаў навукова-тэхналагічны парк БНТУ «Палітэхнік», сустрэўся з рэктарамі ВНУ, кіраўнікамі ўстаноў сярэдняй спецыяльнай і прафесійна-тэхнічнай адукацыі. Пасля гэтага адбыўся прыём грамадзян Савецкага раёна. Яны цікавіліся магчымасцю выплаты мінімальнай сацыяльнай стыпендыі ўсім студэнтам, правам прысвяення вучоных званняў, будаўніцтвам студэнцкага кампуса.**

> Што датычыцца падрыхтоўкі кадраў, то заказ навуцы і адукацыі ў першую чаргу павінна даваць прамысловасць.



Фота БелТА.

Старшыня Савета Рэспублікі Міхаіл Мясніковіч ініцыяваў стварэнне інстытута дзяржаўных экспертаў у Беларусі, які даваў бы аб'ектыўную ацэнку навуковым і інавацыйным праектам, што прэтэндуюць на фінансаванне падтрымку дзяржавы або рэальнай сферы эканомікі. У першую чаргу гаворка ідзе аб навуковых распрацоўках інавацыйнага характару, для рэалізацыі якіх прыцягваецца бюджэтнае фінансаванне або фінансаванне прадпрыемстваў.

Каб гэтыя праекты сапраўды працавалі, павінна быць вельмі сур'ёзная экспертыза. Яе трэба зрабіць больш жорсткай, асабліва для тых праектаў, якія рэалізуюцца за кошт бюджэтных сродкаў. «Для гэтага трэба стварыць інстытут дзяржаўных экспертаў, — лічыць сенатар. — Магчыма, яны павінны зацвярджацца рашэннем кіраўніка дзяржавы. Калі эксперт ставіць свой подпіс,

> Чалавек, які атрымлівае дыплом, павінен быць інавацыйным, харызматычным. Ён у тым ліку кіраўнік, які будзе не толькі добрым спецыялістам і экспертам, але і арганізатарам вытворчасці.

гэта будзе казаць пра тое, што канкрэтная навуковая тэматыка або інавацыйная распрацоўка з'яўляецца сапраўды новай не толькі для айчыннай эканомікі, але і на сусветным узроўні. У гэтым выпадку менш будзе дробных тэм і патэнтаў і навукова-тэхнічных справаздач, якія ляжаць на паліцы», — падкрэсліў старшыня Савета Рэспублікі.

Акрамя таго, прамысловыя прадпрыемствы Беларусі не заўсёды гатовыя да ўкаранення інавацый, якія распрацоўваюцца ў сценах вышэйшай школы і акадэмічных устаноў. На думку спікера верхняй палаты парламента, у гэтым не варта вінаваціць тых ці іншых асоб, бо патрэбны механізмы, каб напрацоўкі, якія даюць навука і ўстановы адукацыі, неслі мінімальныя рызыкі для работнікаў вытворчасці.

Што датычыцца падрыхтоўкі кадраў, то заказ навуцы і адукацыі ў першую чаргу павінна даваць прамысловасць. «Не зусім аптымальнае рашэнне, калі заказ на падрыхтоўку кадраў фарміруе Міністэрства працы і сацыяльнай абароны. Яны працуюць з тым, што ўжо ёсць, а варта падумаць пра тое, што трэба. Таму ў большай ступені гэта Міністэрства эканомікі, а інфармацыя туды сцякаецца з месцаў», — канстатаваў ён.

Міхаіл Мясніковіч адзначыў, што поспех эканомікі краіны шмат у чым залежыць і ад таго, як і каго рыхтуюць вышэйшая школа і сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы. «Мы вядзём размову з прадстаўнікамі Міністэрства адукацыі, Мінгарвыканкама і гарсавета, кіраўнікамі ВНУ, а таксама кіраўнікамі сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў і прафесійна-тэхнічных устаноў у духу тых патрабаванняў, якія вылучае кіраўнік дзяржавы наконт неабходнасці павышэння якасці адукацыі. Чалавек, які атрымлівае дыплом, павінен быць інавацыйным, харызматычным. Ён у тым ліку кіраўнік, які будзе не толькі добрым спецыялістам і экспертам, але і арганізатарам вытворчасці», — падкрэсліў старшыня Савета Рэспублікі.

«Сёння адбылося падпісанне дагавора аб супрацоўніцтве паміж аддзяленнем фізіка-тэхнічных навук НАН і БНТУ. Гэта тыя інструменты, звёны, якія дазваляюць гаварыць пра сувязь навукі, адукацыі і вытворчасці», — падкрэсліў ён.

# ГРОШЫ НА ІНІЦЫЯТЫВУ

**У Беларусі ўпершыню пройдзе нацыянальны этап міжнароднага конкурсу «Экалагічна дружалюбны фермер Балтыйскага рэгіёна — 2018». Конкурс традыцыйна праводзіць Сусветны фонд дзікай прыроды (WWF), аднак беларускія сельгасвытворцы могуць удзельнічаць у ім сёлета ўпершыню. Ініцыявала правядзенне конкурсу ў Беларусі ўстанова «Цэнтр экалагічных рашэнняў» (Беларусь) і кааліцыя «Чыстая Балтыка» (Швецыя), паведамляецца на сайце ЦЭР.**

Вось ужо дзесяць гадоў гэты конкурс праводзіцца для таго, каб папулярызаваць перадавыя практыкі сельскай гаспадаркі, якія з'яўляюцца дружалюбнымі для Балтыйскага рэгіёна. Ёсць і яшчэ адна мэта — падтрымаць фермераў і вытворцаў, якія імкнуцца зніжаць экалагічную нагрузку.

— Не сакрэт, што сельская гаспадарка з'яўляецца адной з асноўных крыніц забруджвання навакольнага асяроддзя, у прыватнасці водных рэсурсаў. Асабліва распаўсюджанае забруджванне вады ўгнаеннямі з азотам і фосфарам, што выклікае эўтрафікацыю — «брасненне» вадаёмаў, уключаючы само Балтыйскае мора. Я спадзяюся, што правядзенне гэтага конкурсу ў Беларусі стане адным з крокаў да прасоўвання і падтрымкі тых фермерскіх гаспадарак, якія ўдзяляюць увагу экалагічным пытанням у сваёй працы, — каментуе **дырэктар Цэнтра экалагічных рашэнняў Яўген ЛАБАНАЎ.**

У конкурсе могуць удзельнічаць прадстаўнікі фермерскіх і іншых невялікіх сельскагаспадарчых вытворчасцяў, якія знаходзяцца ў зоне вадазбору Балтыйскага мора ў Беларусі (Гродзенская, Віцебская і частка Мінскай абласцей). Больш падрабязныя ўмовы ўдзелу, а таксама заяўка на конкурс даступныя па спасылцы ecofermer.tilda.ws.

Пераможца конкурсу атрымае прыз у 1000 еўра. Заяўкі на конкурс прымаюцца да 26 жніўня 2018 года.

**Матэрыялы падрыхтавала Веранiка ПУСТАВІТ.**

# СЭРВІС І КОШТЫ ЯК У ГОРАДЗЕ

## ЗНАЙСЦІ НОВЫЯ ФОРМЫ

Шырока гэтыя важныя для малых гарадоў моманты абмяркоўвалі падчас пасяджэння Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання ў лютым у Паставах. Падчас яго члены Савета Рэспублікі сумесна з прадстаўнікамі буйных прыватных і дзяржаўных гандлёвых сетак разглядалі перспектывы развіцця сельскага гандлю. Прайшло амаль паўгода, карэспандэнты «МС» задаліся пытаннем: «Ці змянілася штосьці за гэты час?»

> Сёння няма тых рашэнняў, якія б правільна абмяжоўвалі буйны бізнес для падтрымкі дробнага.

Варта адзначыць, што шмат у чым раней гандлёвае абслугоўванне насельніцтва ў вёсцы залежала ад «Белкаапсаюза». Сёння спажывецкая кааперацыя з'яўляецца важным сектарам эканомікі краіны, які абслугоўвае больш за 3,4 млн чалавек і практычна ўсё сельскае насельніцтва. Дробны гандаль з'яўляецца галоўным кірункам працы кааперацыі, доля якога ў агульным аб'ёме яе дзейнасці складае 70 %. Акрамя таго, «Белкаапсаюзу» належыць 19 % гандлёвых плошчаў крамаў краіны.

У той жа час наяўны патэнцыял спажывецкая кааперацыя выкарыстоўвае недастаткова. Сёння ў сельскай мясцовасці асаблівую

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)*


Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

значнасць набывае збліжэнне інтарэсаў насельніцтва, дзяржавы і бізнесу, для чаго патрабуецца стварэнне эфектыўнага механізма ўзаемадзеяння.

За паўгода былі зроблены некаторыя крокі, якія ўжо атрымалі адабрэнне ў сельскага насельніцтва Аршанскага раёна. Там, дзе не справілася кааперацыя, прыйшоў буйны рытэйлер. Кампанія «Еўрагандаль» напярэдадні змагла рэалізаваць праект па перадачы больш як 30 гандлёвых пунктаў, якія раней належалі «Белкаапсаюзу» пад стварэнне сваіх крамаў. Гэты вопыт палічылі паспяховым і ў перспектыве могуць ужыць для падтрымання ўзроўню гандлю ў вёсцы.

## У ПОШУКАХ ЗДАРОВАЙ КАНКУРЭНЦЫІ

Разам з тым у бізнес-супольнасці лічаць, што прыход буйных кампаній можа не толькі станоўча вырашыць пытанне з развіццём гандлю на вёсцы, але і стварыць умовы для нездаровай канкурэнцыі для малога і сярэдняга бізнесу, якому прыйдзецца пакінуць свае нішы.

**Сустаршыня саюза юрыдычных асоб «Рэспубліканская канфедэрацыя прадпрымальніцтва» Віктар МАРГЕЛАЎ** лічыць, што праблема канкурэнцыі прыватнага і буйнога бізнесу заключаецца ў тым, што буйныя гандлёвыя сеткі краіны, дзякуючы недасканаласці дзяржаўнага рэгулявання, як мінімум у некалькі разоў больш канкурэнтаздольныя, чым увесь астатні гандаль у любым раёне.

«Зараз дзелавая супольнасць фарміруе пакет прапаноў па развіцці малога і сярэдняга прадпрымальніцтва ў сферы гандлю. Прадпрымальнікі, якія працуюць у сферы гандлю, штогод губляюць 5-10 % рынку ў агульнай долі тавараабароту. Сёння няма тых рашэнняў, якія б правільна абмяжоўвалі буйны бізнес для падтрымкі дробнага», — лічыць Віктар Маргелаў.

Таксама, на яго думку, у малым бізнесе складана быць канкурэнтаздольным. Важна аб'ядноўвацца і каардынаваць лагістыку, закупкі. Эксперт лічыць, што беларускія прадпрымальнікі ўсё яшчэ цяжкія на пад'ём.

«Але толькі ў каардынацыі па некаторых пазіцыях можна наблізіцца да буйных сетак. Для гэтага патрэбна празрыстае і ўзаемавыгаднае супрацоўніцтва», — растлумачыў Віктар Маргелаў.

У дадатак, кажучы пра тое, наколькі сёння лёгка невялікаму прыватнаму прадпрыемству ўвайсці на рынак сельскага гандлю, ён адзначыў, што, каб арганізаваць у населеным пункце свой невялікі магазін, складана знайсці добрае памяшканне. Часцей за ўсё прыйдзецца ўкладвацца ў будоўлю ці перапрафіляваць тое, што ёсць.

Разам з тым эксперт лічыць, што іншыя моманты, якія звязаны з тэхнічнымі, санітарнымі правіламі, зараз з'яўляюцца вырашальнымі для прадпрымальнікаў.

«З улікам Дэкрэта № 7 прайсці гэтыя працэдуры значна прасцей. Аформіць дакументы ўжо не праблема», — адзначыў Віктар Маргелаў.

Такім чынам, сёння пытанні стварэння добрай канкурэнцыі застаюцца адкрытымі. Але ў першую чаргу важнымі яны з'яўляюцца для бізнесу незалежна ад формы і памеру. Грамадзянам жа істотна, каб іх якасна абслугоўвалі і прапаноўвалі шырокі спектр тавараў. За тое, што ім спадабаецца больш, яны прагаласуюць рублём.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ.**

## НАША ДАВЕДКА

**Паводле звестак Белстата, з 2015-га па 2017 год колькасць рознічных гандлёвых аб'ектаў у сельскай мясцовасці павялічылася на 5 % і на 1 студзеня 2018 года склала 10 764 адзінкі, ці 17,3 % ад агульнай колькасці гандлёвых аб'ектаў у краіне.**

У сваю чаргу, гандлёвая плошча магазінаў у сельскай мясцовасці за аналагічны перыяд зменшылася на 3,4 % і на 1 студзеня 2018 года склала 726 тысяч кв. м (13,1 %).

Паводле аператыўных даных Гандлёвага рэестра, дробны гандаль у сельскай мясцовасці ажыццяўляюць 5308 суб'ектаў гандлю. З іх 2692 юрыдычныя асобы (50,7 %) і 2616 індывідуальных прадпрымальнікаў (49,3 %).

Зараз гандлёвыя аб'екты, размешчаныя ў сельскай мясцовасці, прадстаўлены наступнымі формамі:

крамы — 49,4 %;
павільёны — 12,6 %;
кіёскі — 5,6 %;
аўтамагазіны — 5,7 %;
неізаляваныя гандлёвыя аб'екты, палаткі, перасоўныя сродкі разноснага гандлю — 26,7 %.

Гандаль на вёсцы ажыццяўляюць такія буйныя гандлёвыя сеткі, як Белкаапсаюз (4077 рознічных гандлёвых аб'ектаў, размешчаных у сельскай мясцовасці), РУП «Белпошта» (2101), «Беларуснафта» і «Лукойл» (111 і 17 крам на АЗС адпаведна), ААТ «ДарОрс» (30), «Еўраопт» (98), «Белмаркет» (6), «Міла» (10), Гандлёвы дом «Лагуна» (7).

# НОВЫ ПОГЛЯД НА СТАРЫЯ ПРАБЛЕМЫ ВОДАЗАБЕСПЯЧЭННЯ



*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)*

Парламентарыі прапануюць удакладніць паўнамоцтвы Савета Міністраў Беларусі, дэталізаваць кампетэнцыю Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі. У новым праекце закона з'явяцца асобныя артыкулы, якія рэгламентуюць паўнамоцтвы Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя і Міністэрства аховы здароўя.

Новы праект закона дапоўнены часткай «Эканамічны механізм рэгулявання ў галіне пітнога водазабеспячэння».

## Гаспадарскі падыход да пітной вады

Прыйшоў час падысці да праблемы выкарыстання пітной вады ў нашай краіне па-гаспадарску. Зараз Савет Рэспублікі адстойвае ў зацікаўленых ведамствах чатыры прынцыповыя пазіцыі.

На думку парламентарыяў, у першую чаргу трэба знайсці правільнае рашэнне па забеспячэнні вадой буйных прадпрыемстваў. Бо да гэтага часу ў тэхнічных мэтах у нашай краіне выкарыстоўваецца вада з падземных крыніц.

Па даных Дзяржаўнага воднага кадастра ў 2017 годзе асноўны аб'ём расходу падземнай вады прыходзіўся на сферу жыллёва-камунальнай гаспадаркі (66 % або 537,5 млн $м^3$), на прамысловасць 12,4 % (100,9 млн $м^3$), сельская гаспадарка 14,4 % (116,6 млн $м^3$).

Сітуацыя, калі прадпрыемствы спажываюць пітную ваду для тэхнічных патрэб, пры гэтым забруджваючы навакольнае асяроддзе, скідваючы вытворчыя адходы ў рэкі, недапушчальная.

Пастаянная камісія Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні прапануе заканадаўча ўстанавіць неабходнасць укаранення паралельнай сістэмы трубаправодаў з пітной і тэхнічнай вадой.

Прапануецца таксама ўпарадкаваць адносіны, звязаныя з работай ачышчальных збудаванняў сцёкавых вод. Пакуль на ўзроўні заканадаўчага акта яны не ўрэгуляваныя. Канцэпцыяй удасканалення і развіцця жыллёва-камунальнай гаспадаркі да 2025 года замест існуючых палёў фільтрацыі планууецца будаўніцтва ў рэгіёнах ачышчальных збудаванняў. Прапануецца прыняць законапраект, які будзе рэгуляваць адносіны як у галіне водазабеспячэння, так і водаадвядзення.

## Стварыць сістэму кантролю якасці вады

Яшчэ адна праблема, якая патрабуе заканадаўчага рашэння, — бескантрольнае бурэнне свідравін уласнікамі і арандатарамі зямельных участкаў. Гэтае пытанне ініцыявана Міністэрствам прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя. На думку ведамства, у Беларусі неабходна стварыць сістэму кантролю рацыянальнага водакарыстання, якая выключае свідраванне водазаборных свідравін і забор вады без адпаведнага дазволу ўпаўнаважанага дзяржаўнага органа, і ўстанавіць парадак выдачы такіх дазволаў.

Сёння ўсе аб'екты і прадпрыемствы сістэмы водазабеспячэння насельніцтва знаходзяцца ў падпарадкаванні жыллёва-камунальнай гаспадаркі. Пасля ліквідацыі Міністэрства меліярацыі і воднай гаспадаркі БССР у рэспубліцы няма дзяржаўнага органа кіравання гэтай галіной, што прывяло да сітуацыі, калі ў краіне няма адзінай і зладжанай палітыкі далейшага развіцця сістэмы воднай гаспадаркі. Пастаянная камісія Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні прапануе стварыць навукова-практычны цэнтр воднай гаспадаркі Беларусі, які будзе каардынаваць усе праблемы водагаспадарчай галіны, у тым ліку і пытанне забеспячэння насельніцтва якаснай пітной вадой.

Плануецца, што з улікам усіх заўваг абноўлены праект Закона Рэспублікі Беларусь «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у некаторыя законы Рэспублікі Беларусь па пытаннях пітнога водазабеспячэння» будзе разгледжаны на восеньскай сесіі парламента.

**Наталля БІТЭЛЬ.**

**У Ваўкавыску, што на Гродзеншчыне, сёння нікога не здзівіш разнастайнымі таварамі. Як кажуць прадстаўнікі раённай улады, гандаль развіваецца і за першае паўгоддзе тут адкрыта яшчэ тры новыя гандлёвыя аб'екты агульнай плошчай больш за 100 квадратных метраў. Але мы вырашылі даведацца, як працуюць тыя крамы, гісторыя якіх налічвае не адно дзесяцігоддзе. Што стала сёння з былымі ўнівермагамі-ўніверсамамі? Як выжываюць мясцовыя гандлёвыя прадпрыемствы, калі з усіх бакоў растуць аб'екты вядомых сетак, а пакупнікоў вабяць бонусамі і зніжкамі?**



# ПА-НОВАМУ, ПА-ГАСПАДАРСКУ...

## Крамы савецкіх часоў знайшлі сваю нішу і канкурыруюць з вядомымі сеткамі

### «Сцяну прыходзілася выбіваць ноччу...»

На пытанне, ці засталіся ў Ваўкавыску крамы, што некалі былі цэнтрамі гандлю, у райвыканкаме адказалі аднaзначна: такія аб'екты ёсць. І адразу далі адрас: былы ўніверсам па вуліцы Гарбатава. У сярэдзіне 90-х гадоў гэта быў адзін з цэнтральных гандлёвых аб'ектаў горада, але паступова ён згубіў прывабнасць. У такой сітуацыі апынуліся многія крамы, бо тавараў было мала і паліцы пуставалі. Будынак усё ж не сталі перапрафіляваць, а занялiся рэарганізацыяй гандлёвага прадпрыемства. І гадоў праз пяць замест універсама з'явілася раённае ўнітарнае прадпрыемства з прыгожай касмічнай назвай «Аэліта». А калі яно стала налічваць некалькі аб'ектаў, назвалі «Аэліта Люкс». Дарэчы, доля дзяржавы тут складае больш за 50 %. **Дырэктар прадпрыемства Галіна АПАНОВІЧ** прызнаецца, што час станаўлення быў даволі складаны. Былы універсам трэба было зрабіць сучасным гандлёвым аб'ектам.

— Мы пачалі мадэрнізацыю, прычым усе работы вялі за ўласныя сродкі — нават крэдытаў не бралі, — расказвае Галіна Якаўлеўна. — А каб не страціць пакупнікоў, працавалі па начах. Мянялі абсталяванне і нават сцяну ноччу выбілі, каб пашырыць плошчы.

Па словах дырэктара, працоўны калектыў не хацеў здавацца. Нягледзячы на цяжкасці, ніхто з работнікаў не звольніўся. Тады і сфарміравалася каманда, дзякуючы якой удалося давесці справу да канца. Зараз на прадпрыемстве працуе каля 200 чалавек і асноўны касцяк складаюць тыя работнікі, якія пачыналі рэарганізацыю.

— У мяне працуюць у асноўным жанчыны, у якіх ёсць малыя дзеці, састарэлыя бацькі ці наогул розныя праблемы. І трэба ставіцца да гэтага са спачуваннем. Пайсці насустрач. Гэта таксама дае свой плён, бо людзі не ўцякаюць, не ідуць шукаць, дзе лепш, а стабільнасць — вялікая справа. Калі толькі патрабаваць, аддачы добрай не будзе. Бо задача кіраўніка — не толькі атрымліваць прыбытак, але і клапаціцца аб людзях, — лічыць Галіна Апановіч.

Яна прызнаецца, што зацікаўленая ў павышэнні зарплаты, якая пакуль не вельмі высокая. Сярэдні заробак летась складаў 580 рублёў, сёлета вырас — і складае каля 700 рублёў у месяц. Тавараабарот за мінулы год склаў 15,7 мільёна рублёў, чысты прыбытак — амаль 80 тысяч. Значная частка сродкаў ідзе на аднаўленне гандлёвых магутнасцяў.

### «Тут ні разу не нагрубілі»

Былы універсам зараз з'яўляецца сучасным гандлёвым аб'ектам, які ўдала ўпісаны ў інфраструктуру добраўпарадкаванага гарадскога цэнтра. Адрамантаваны фасад, вялікая зала насычана шырокім асартыментам тавараў. Як расказала **намеснік дырэктара па камерцыйных пытаннях Тацццяна ТАРАНЕЎСКАЯ,** прадпрыемства мае шырокае кола пастаўшчыкоў — іх больш за 400. Камерцыйны аддзел працуе напрамую з вытворцамі і толькі па замежнай групе тавараў — з іх прадстаўніцтвамі ў рэспубліцы. Асноўны прынцып у рабоце — адпавядаць запросам пакупнікоў.

> Калі толькі патрабаваць, аддачы добрай не будзе. Бо задача кіраўніка — не толькі атрымліваць прыбытак, але і клапаціцца аб людзях.

— Напрыклад, запытаў хтосьці ў прадаўца аб нейкіх відах прадукцыі, хлеба ці яшчэ чаго, і мы адразу шукаем вытворцаў і наладжваем пастаўку. Мы ідзём на эксперыменты і пастаянна вывучаем попыт, — кажа Тацццяна Таранеўская.

Прыход гандлёвых сетак з іх агрэсіўнай палітыкай, вядома, паўплываў на работу прадпрыемства. Тавараабарот знізіўся. Летась не хапіла некалькі працэнтаў да выканання плана. Затое ў першым квартале гэтага года ўсё нармалізавалася, з'явіўся прыбытак, што дазволіла выканаць план на 110 %. Многія пакупнікі ў рэшце рэшт вярнуліся ў «Аэліту Люкс».

Сярод іх сацыяльны работнік Алена Міхальская. Мы сустрэлі жанчыну на выхадзе з крамы. Яна расказала, што даўно ходзіць сюды па пакупкі, выконвае заказы сваіх падапечных. Гандлёвыя сеткі таксама наведвае, але ўсё роўна вяртаецца ў «сваю» «Аэліту». Чаму? Кажа, што ёй падабаецца шырокі асартымент і ветлівы персанал.

— Мае бабулі і дзядулі любяць свежае печыва, а тут вялікі выбар прадукцыі ўласнай вытворчасці, — прыводзіць аргумент Алена. — І што важна, тут ні разу не нагрубілі, а дзяўчаты на касе так акуратна складаюць тавар у карзінку, што нават я так не ўмею.

### Суседства з сеткавікОм не пужае

Рэарганізацыя закранула і краму сістэмы ваеннага гандлю, якая ў той час апынулася ў крытычным стане. Каб не вешаць на аб'ект замок і не чакаць, пакуль будынак разбурыцца, яго далучылі да акцыянернага таварыства «Аэліта Люкс». І тая ж каманда, што «падымала» былы універсам, занялася ваеннай крамай. Аднёўлены аб'ект вырашылі назваць «Арыён».

Нягледзячы на сваю касмічную назву, тут даволі «зямныя» цэны. Кажуць, што яны самыя нізкія ў горадзе... Загадчыца Вольга Данілевіч праводзіць па зале, дзе значная частка тавару прадаецца па акцыях.

— Вельмі часта ў нас танней за іншыя крамы можна купіць рыбу, каўбасныя вырабы, бакалейныя тавары. Людзі ведаюць аб гэтым і едуць да нас. Зараз, у летні сезон, дзейнічаюць зніжкі на марожанае. У нашым раёне многа дзяцей, яны часта сюды заходзяць, — кажа Вольга Мікалаеўна.

Між іншым заўважаю, што непадалёку знаходзіцца буйны сеткавы маркет. Загадчыца крамы згаджаецца з тым, што канкурэнцыя ёсць. Але і «Арыён» вядзе сваю палітыку нізкіх цэн і акцыйных тавараў. У мінулым годзе тут перайшлі на самаабслугоўванне. Да таго ж і горад развіваецца. Паблізу ёсць дзіцячы садок і школа. А хутка ў мікрараёне пачнецца будаўніцтва некалькіх шматпавярховых дамоў. Новыя жыхары атрымаюць гандлёвы аб'ект, што называецца, у крокавай даступнасці.

### Замест бара — утульнае кафэ

З дапамогай гандлёвага прадпрыемства ўцягнуты ў абарот яшчэ адзін аб'ект, плошчы якога раней пуставалі. Зараз іх запоўнілі гаспадарчыя і будаўнічыя тавары, а таксама бытавая тэхніка.

Руплівыя гаспадары набылі не толькі пункты гандлю, але і кафэ. Раней тут быў бар, але з-за стратнасці мясцовыя ўлады перадалі яго гандлёваму прадпрыемству. Пачалася татальная мадэрнізацыя, і зноў жа за ўласныя сродкі. Аднавілі залу, купілі прыгожыя люстры, мэблю, кухоннае абсталяванне.

> Напрыклад, запытаў хтосьці ў прадаўца аб нейкіх відах прадукцыі, хлеба ці яшчэ чаго, і мы адразу шукаем вытворцаў і наладжваем пастаўку. Мы ідзём на эксперыменты і пастаянна вывучаем попыт.

Кафэ можа прыняць адразу 80 чалавек. Штодзень яно прываблівае кліентаў недарагімі комплекснымі абедамі. Кулінарная прадукцыя паступае адсюль у дзве крамы прадпрыемства і буфет райвыканкама. Дарэчы, цэх, як і кандытарскі, працуе кругласутачна, каб забяспечыць пакупнікоў свежымі вырабамі. Уласная прадукцыя дапамагае заставацца прадпрыемству канкурэнтаздольным.

У райвыканкаме паведамілі, што ў горадзе ёсць некалькі пляцовак пад будаўніцтва аб'ектаў гандлю. З пачатку года адкрыліся тры крамы агульнай плошчай 116 квадратных метраў, а яшчэ з'явіўся новы аб'ект грамадскага харчавання. Будуюцца і сеткавыя маркеты. Усё гэта, безумоўна, добра для спажыўца, бо не трэба ехаць у буйныя гарады па тавар. Але не менш важна і тое, што другое жыццё атрымалі былыя гандлёвыя аб'екты. Яны не толькі трымаюцца на плаве, але і маюць сваё адметнае месца ў гандлёвым асяроддзі.



**Маргарыта УШКЕВІЧ.**
**Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.**

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

## Тэлесеткі

### «ДЗІЦЯЧАЕ ЕЎРАБАЧАННЕ» Ў МІНСКУ СТАНЕ РЭКОРДНЫМ

16-ы міжнародны дзіцячы конкурс песні «Еўрабачанне-2018», што пройдзе 25 лістапада ў беларускай сталіцы, збярэ рэкордную колькасць удзельнікаў за ўсю гісторыю творчага форуму. Як паведамілі ў Белтэлерадыёкампаніі, удзел афіцыйна пацвердзілі ажно 19 краін.

Поўны і канчатковы спіс выглядае так: Азербайджан, Албанія, Арменія, Аўстралія, Беларусь, Грузія, Ізраіль, Ірландыя, Італія, Казахстан, Македонія, Мальта, Нідэрланды, Польшча, Партугалія, Расія, Сербія, Уэлс і Францыя. Гэта ліўба пераcягнула самыя смелыя чаканні арганізатараў: паводле рэгламенту, у дзіцячым конкурсе могуць удзельнічаць да 18 краін, аднак Еўрапейскі вяшчальны саюз зрабіў выключэнне для Ізраіля, як краіны-пераможцы дарослага шоу, і дазволіў перавысіць ліміт.

### СВЕТ, ЯКІМ МЫ ЯГО НЕ БАЧЫЛІ

Добрая навіна для аматараў падарожнічаць па розных краінах, не выходзячы з дома: тэлеканал «Беларусь 2» пачынае паказ ужо 9-га сезона папулярнага ўкраінскага трэвэл-шоу «Свет навыварат».



Першая вандроўка, якая будзе ў эфіры 29 ліпеня, раскажа пра адваротны бок Японіі. Вядучы Дзмітрый Камароў паднімецца на Фудзіяму і паўдзельнічае ў барацьбе сумо, адчуе гарачы подых актыўнага вулкана і ўбачыць спаборніцтвы ў басейне з гразззю, а таксама квітнеючыя палі «травяной сакуры» і адзіноту сярэднестатыстычнага японца ў перанаселеным мегаполісе...

## Наш фармат

### БЛІЖЭЙ ДА ЗОРАК



Ужо ў верасні ў Мінскім планетарыі адкрыецца першы кінатэатр тыпу IMAX: глядзець сферычныя фільмы можна будзе на вялізным экране па тэхналогіі «поўнага купала». Падобнага абсталявання няма больш нідзе ў Беларусі. Сродкі на новую праекцыйную сістэму — больш як 13 тысяч рублёў — сабралі праз інтэрнэт-платформу з дапамогай амаль 500 неабыякавых беларусаў і вядомага брэнду тавараў для сну.

Акрамя таго, у планетарыі з'явіцца паслуга «Неба для дваіх». Паглядзець на зоркі цяпер можна літаральна лежачы, бо пад самым купалам устаноўленыя два спальных месцы — ложкі з артапедычнымі матрасамі.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК**

## ШАШКІ («звязда») Выпуск № 68

У пачатку ліпеня ў польскім г. Журомін адбыўся XVIII міжнародны турнір «Польская гульня» па шашках-100. На старт выйшлі 43 шашысты з 10 краін. Ва ўпартай барацьбе перамогу атрымаў беларускі гросмайстар Аляксандр Булатаў — 14 ачкоў з 18 магчымых. Такі ж вынік у кітайскага шашыста Ду Іфу, які саступіў пераможцу па дадатковых крытэрыях. На трэцім месцы — польскі шашыст Караль Ціхоцкі — 13 ачкоў. Пераможцы атрымалі кубкі ў выглядзе фігур старажытных рыцараў.

Паглядзіце цікавы фрагмент гульні.

№ 48 В. Варушыла — Л. Іткін.

Белыя простыя шашкі: 12, 44, 45, 48 (4)

Чорныя простыя шашкі: 1, 13, 24, 30 (4)

Здаецца «ражон» на поле 12 павінен забяспечыць белым перамогу 1.4540, аднак чорныя адчайна абараняюцца 1 ... 2429 2.4035 3034 3.4439 3443 4.4839 0106 5.1207 0611! 6.0716 1318 7.1611 1822 8.1107 2227 9.0702 2731? (Вырашальная памылка, да нічыёй трэба было зрабіць адзін крок 9 ... 2732.) Зараз белыя перамагаюць, выкарыстоўваючы пятлю 10.0219 2933 11.3928 3137, здавалася, белая дамка перакрытая і чорныя лёгка выслізгваюць на нічыю, але 12.1924! 3741 13.2447 4146 14.4724, і чорная дамка злоўлена.

Для самастойнага рашэння прапануюцца кампазіцыі ў шашкі-64 міжнароднага майстра па шашачнай кампазіцыі Віктара Шульгі (Мінск).

№ 49

Белыя простыя шашкі: g3, белыя дамкі: g7, h4 (3)

Чорныя простыя шашкі: d4, e5, g5, h8, чорныя дамкі: f6 (5)

№ 49



№ 50

Белыя простыя шашкі: a7, d2, e3, f2, f4 (5)

Чорныя простыя шашкі: d8, f8, h2, h4, h6 (5)

Мініяцюра ў шашкі-100 складзена ўкраінскім майстрам па шашачнай кампазіцыі Іванам Івацкам.

№ 51

Белыя простыя шашкі: 6, 29, 33, 38, 44, 48 (6)

Чорныя простыя шашкі: 7, 10, 13, 21, 31, 35, 37 (7)

Ва ўсіх пазіцыях белыя пачынаюць і выйграюць.

Прозвішчы чытачоў, якія дашлюць правільныя адказы, будуць апублікаваныя.

Праверце свае рашэнні: выпуск № 67 ад. 13.07.2018.

№ 45 29. 29-23 20x18 30. 38-32 27x29 31. 34x01+

№ 46 h8(d2),c3,ed4,d8(e1),c3,a7(b6),c5(c7),b6,d2(g5),e3(h4), f4x

№ 47 f6(e5),b4,a7(b2,f4,b6,d6,b2),g5,e3,a1x

Правільныя адказы даслалі В. Дударэвіч (в. Новая Мыш, Баранавіцкага р-на), Ф. Карпей (Мядзел), В. Статкевіч (п. Зялены бор, Івацэвіцкі р-н), В. Панько (Камянец), І. Ананіч (Гродна), А. Шурпін (Івянец), В. Ваўчкоў (Маладзечна), П. і В. Шульгі, А. Ліцьвінаў (усе Мінск), В. Таўкачоў (Клімавіцкі р-н), В. Бандарык (Мінскі р-н).

**Пішыце на адрас: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а, газета «Звязда»; e-mail: info@zviazda.by або vorush@yandex.ru**

**Віталь ВАРУШЫЛА, майстар спорту.**

## Сядзі і глядзі

# ЛЮДЗІ СУПРАЦЬ АБСТАВІН



### «Алегра з агнём» «Беларусь 3», 31 ліпеня

Чэрвень 1941-га. Фашысты спрабуюць заблакаваць Чарнаморскі флот, для чаго закідваюць фарватар новымі магнітна-акустычнымі мінамі. Каб абясшкодзіць іх, створана група добраахвотнікаў-мінёраў — але за расkрыццё загадкі сакрэтнай зброі ім давядзецца заплаціць уласным жыццём... Як у баявых умовах раскрываюцца людзі, ніводны з якіх не лічыць сябе героем, на якія ўчынкі здатныя сапраўдныя сябры і пры чым тут першая частка знакамітай пятай сімфоніі Бетховена? Усе адказы — у гэтай ваеннай драме Уладзіміра Стралкова.

### «Карціна алеем» МІР, 31 ліпеня — 1 жніўня



У пецярбургскага бізнесмена ўкралі рарытэтную карціну "Дзяўчына з загадкавай усмешкай". Праўда, хутка высвятляецца, што знікла копія. Арыгінал яшчэ раней вынесла з дому жонка прадпрымальніка — у якасці помсты за развод. А каб не падстаўляцца самой, даручыла найлепшай сяброўцы ў суправаджэнні былога аховіка мужа адвезці каштоўнае палатно ў Лас-Вегас, каб прадаць замежнаму антыквару. Парачка выпраўляецца ў вандроўку, не падазраючы, якія небяспекі чакаюць іх у сталіцы азартнага жыцця.



### «Персанаж» «Кінакамедыя», 31 ліпеня і 5 жніўня

Падатковы інспектар Гаральд Крык вядзе звычайнае манатоннае жыццё, пакуль аднекуль не з'яўляецца голас, які пачынае каментаваць усе яго дзеянні. Доктар падазрае шызафрэнію, але сам Гаральд разумее, што адбываецца нешта надзвычайнае, і звяртаецца па дапамогу... да прафесара літаратуры. Але ці магчыма паверыць, што ты — толькі плод уяўлення іншага чалавека, а твайго героя ў канцы кнігі чакае смерць? Таму тэрмінова трэба ўзяць лёс у свае рукі.

### «Не дыхай» «Беларусь 2», 3 жніўня



Да самотнага і сляпога старога збіраюцца рабаўнікі, каб украсці вялізную суму грошай. Здавалася б, што можа быць прасцейшым, чым абследаваць дом практычна бездапаможнага чалавека? Але нечаканна ахвяра сама становіцца праследнікам, замкнёная прастора ператвараецца ў пастку, а сакрэт, схаваны ў доме, дзіўна далёка не скарбаў пад падлогай... Словам, для аматараў глядзець фільмы затрымліваючы дыханне — самае тое, каб не заснуць ноччу.



### «Памылка Тоні Вэндзіса» «Культура», 4 жніўня

Унутры добрага мужа, былога тэнісіста і плэйбоя Тоні Вэндзіса хаваецца зусім іншы чалавек — скнара і эгаіст, які ажаніўся з багатай жанчынай, але баіцца, што тая выбера іншага. Каб вырашыць усе праблемы разам, ён шукае наёмнага забойцу. Аднак, абараняючыся, жанчына выпадкова забівае таго. Падкінуўшы следчым фальшывыя доказы, Тоні крывадушна спачувае жонцы, якой пагражае турма. Аднак тут за справу бярэцца ўедлівы дэтэктыў і знаходзіць адзіны доказ, што дапаможа раскрыць праўду...




# Папіхіч не пабяжыць наўзахапкі

**Штотыдзень у эфіры тэлеканала «Беларусь 3» віктарына «Размаўляем па-беларуску». Для таго каб стаць яе ўдзельнікамі, неабходна зайсці на сайт tvrgomel.by або 3belarus.by і праз банер «Размаўляем па-беларуску» запоўніць заяўку на каманду з трох чалавек. Ну а праверыць сваё веданне роднай мовы пасля таго, як праграма выйшла ў эфір, можна з дапамогай «Звязды». Ці ведалі вы, што:**

**кавяла́** — самаробны драўляны пратэз для нагі;

**лоўж** — галлё, скінутае ў кучу;

**наўза́хапкі** — стараючыся зрабіць што-небудзь першым;

**за́саб** (прысл.) — запар, без перапынку;

**сліма́к** — малюск, які мае ракавіну;

**папі́хіч** — чалавек, якім панукаюць;

**ля разбітага карыта** — застацца без анічога, страціць увесь набытак (беларусы яшчэ скажуць: *без штаноў, без ботаў;* рускія: *на бобах, остаться с носом);*

**не сёння — заўтра** — хутка, у найбліжэйшы час (беларускія сінонімы: *не цяпер, дык у чацвер;* рускія адпаведнікі: *со дня на день, рано или поздно).*

**Чарговыя выпускі тэлевіктарыны глядзіце ў эфіры «Беларусь 3» раніцай кожную суботу.**

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

## Беларусь 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00** (з сурдаперакладам), **9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00, 0.35** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 18.15, 0.15** «Зона Х». (16+).
**9.10, 22.10 Серыял «След». (16+).**
**10.50, 12.10, 18.35, 19.20 Серыял «Шлюб па завяшчанні». (12+).**
**13.05** Дзіцячы доктар.
**13.35 Меладрама «Ад першага да апошняга слова». 1-я серыя. (16+).**
**14.30, 15.25, 17.05 Серыял «Двайная суцэльная». (16+).**
**15.15, 18.00** Навіны рэгіёна.
**21.00** Панарама.
**21.50** Спецыяльны рэпартаж. (12+).
**23.55** Сфера інтарэсаў.
**0.55** Дзень спорту.

## Беларусь 2

**7.00** Тэлераніца. (12+).
**9.00, 19.35** Тэлебарометр.
**9.05, 19.40 Серыял «Сляпая». (16+).**
**10.05, 17.40 Серыял «Мароза-ва». (16+).**
**11.55** «Панаехалі-2. Канікулы ўсляпую». (16+).
**12.55** «Спатканне з будучыняй». (16+).
**13.50** «Арол і рэшка. Курортны сезон». (16+).
**14.45** М/с «Кунг-фу панда: захапляльныя легенды». (12+).
**15.10, 22.05 Серыял «Жаночы рай». (16+).**
**16.15** Нічога сабе ньюз. (12+).
**16.20** «Пін_код». Інтэрактыўны маладзёжны праект. (12+).
**17.05** Камень, нажніцы, папера. (16+).
**20.35** «Вяселле ўсляпую». (16+).
**22.00** Спортлато 6 з 49, КЕНО.
**23.10** «ЛавЛавСар». (16+).
**0.05** «Не злуйце дзяўчынак». Скетчкам. (16+).

## Беларусь 3

**7.00** «Дабранакан».
**7.35, 12.25** «Беларуская кухня». Локшыны.
**8.05, 12.00, 19.55** Навіны культуры.
**8.20, 12.20, 20.10** «Гэты дзень».
**8.25, 18.35 «Маргарыта Назарава». Маст. фільм (16+).**
**9.20, 18.00** «Апошні дзень». Фрунзік Мкртчан (12+).
**10.00** «Гарады Беларусі». Брэст.
**10.25, 16.30 «Пелагія і белы бульдог». Маст. фільм (12+).**
**12.50** «Наперад у мінулае».
**13.20, 21.05 «Алегра з агнём». Маст. фільм (12+).**
**14.45, 22.55** «Вызваленне». «Усходне-Пруская аперацыя. Разведка» (12+).
**15.10** Госці «Славянскага базару». Вячаслаў Дабрынін.
**19.30** «Ваша лато», «Пяцёрачка».
**20.20** «Твар у твар». Граніца да пачатку вайны (12+).
**20.40** «Калыханка» (0+).
**22.55** «Святло далёкай зоркі». Памяці дырыжора, народнага артыста Беларусі Юрыя Яфімава.

## Беларусь 5

**7.10, 12.35, 15.45** Спорт-мікс.
**7.20, 15.55** Тэніс. WTA. Сан-Хасэ.
**9.25** Час спорту.
**10.10** Футбол. Міжнародны Кубак чэмпіёнаў. ПСЖ (Францыя) — «Атлетыка Мадрыд» (Іспанія).
**12.05** Легенды сусветнага спорту.
**12.45** Гульні «навырост».
**13.15** Трэніровачны дзень.
**13.45** Футбол. Міжнародны Кубак чэмпіёнаў.
**18.00** Фактар сілы.
**18.30** Змешаныя адзінаборствы. UFC.
**20.50** Спорт-кадр.
**21.20** Спорт-цэнтр.
**21.30** Тэніс. WTA. Сан-Хасэ. Вашынгтон.

## АНТ

**6.00, 6.30, 7.00** (з субцітрамі), **7.30, 8.00** (з субцітрамі), **8.30, 9.00** (з субцітрамі), **11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
**6.10, 7.10, 8.10** «Наша раніца».
**9.10** «Бачылі відэа?» (12+).
**10.00** «Жыць здорава!» (12+).
**11.10** «Кантрольная закупка» (12+).
**11.50** «Модны прыгавор» (12+).
**13.10 Серыял «Вольф Месінг: які бачыў скрозь час» (12+).**
**14.05** «Легенды цырка» (6+).
**14.40** «Давай пажэнімся!» (16+).
**15.35, 16.20, 23.10** «Мужчынскае/Жаночае» (16+).
**16.55, 0.05** «На самай справе» (16+).
**18.20** «Удача ў прыдачу! з «Еўраопт».
**19.05** «Няхай гавораць» (16+).
**20.00** «Час».
**21.10 Серыял «Алхімік» (12+).**
**1.00** «Начныя навіны».

## СТБ

**5.30** «Цэнтральны рэгіён».
**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** Навіны «24 гадзіны».
**6.10, 20.15** «Міншчына».
**6.20, 7.45** «Раніца». Студыя добрага настрою» (6+).
**7.40, 19.55, 23.00** «СТБ-спорт».
**9.00, 23.05** «Загадкі чалавецтва» (16+).
**10.40, 20.25 «Бацькі». Серыял (16+).**
**12.15** «Вадзіць па-руску» (16+).
**12.45, 0.35** «Самыя шакіруючыя гіпотэзы» (16+).
**13.45** «Сакрэтныя тэрыторыі» (16+).
**14.40, 22.00** «Глядзець усім!» (16+).
**15.05** «Ежа багоў» (16+).
**15.55, 16.50 «Знахар-2. Паляванне без правілаў». Серыял (16+).**
**20.05** «Сталічныя падрабязнасці».

## МІР

**6.00, 4.55 Серыял «АСА» (16+).**
**6.20, 8.05, 10.05, 13.15 Серыял «Варажба пры свечках». (16+).**
**8.00, 10.00, 16.00, 19.00, 0.00** Навіны (бягучы радок).
**14.00, 3.55** «Справы сямейныя. Бітва за будучыню» (16+).
**15.00** «Справы сямейныя. Новыя гісторыі» (16+).
**16.15, 2.35** «Гульня ў кіно» (12+).
**17.10 Серыял «Вяртанне Мухтара-2». (16+).**
**19.20 Серыял «Пад прыцэлам». (16+).**
**22.55, 0.10 Маст. фільм «Карціна алеем» (12+).**
**0.45 Маст. фільм «Шукаю цябе» (16+).**
**3.25** «Іншы свет» (12+).

## РТР—Беларусь

**7.00** «Раніца Расіі».
**9.25, 11.35, 20.40, 23.10 Серыял «Чорная кроў». (12+).**
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**13.35** «Наша справа». (16+).
**13.50, 16.50, 19.50, 23.00** Навіны — Беларусь.
**14.35** «Пра самае галоўнае». Ток-шоу. (12+).
**15.45** «60 хвілін». Ток-шоу.
**17.35** «Лёс чалавека». (12+).
**18.45** «Андрэй Малахаў. Прамы эфір». (16+).
**0.15 Серыял «Скліфасоўскі. Рэанімацыя». (12+).**

## НТБ—Беларусь

**5.55** «Астрапрагноз».
**6.00, 7.00, 8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**6.10, 7.10** «Дзелавая раніца НТБ». (12+).
**7.55, 8.05 Серыял «Вяртанне Мухтара». (16+).**
**9.40, 23.15** «НЗ.by».
**10.25 Серыял «Дарожны патруль». (16+).**
**12.05** «Суд прысяжных». (16+).
**13.25, 16.30** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**14.10 Серыял «Мянтоўскія войны». (16+).**
**17.05** «ДНК». (16+).
**18.10, 19.5 Серыял «Марскія д'яблы». (16+).**
**21.25 Серыял «Ляснік. Свая зямля». (16+).**
**23.40 Серыял «Сведкі». (16+).**

## 8 канал

**7.00, 15.55, 19.45, 21.00, 0.05** «Надвор'е».
**7.05** «Сябры дзядулі Марка» (0+).
**7.15, 23.20 Серыял «Камісар Рэкс» (12+).**
**8.10 Серыял «Крык савы» (16+).**
**9.10, 19.50 Серыял «Кандзіс Рэнуар» (16+).**
**10.10** «Майстар-клас».
**10.30** «Мой любімы гадаванец» (0+).
**11.00, 18.10 Серыял «Сакратар» (16+).**
**12.30** Рэтра-дэтэктыў «Самая гучная справа Мегрэ».
**14.15 «Героі коміксаў на экране». Камедыя «Сын Маскі» (12+).**
**15.55** Для дзяцей «Адказвайка» (0+).
**16.00** «Мультпарад» (0+).
**16.10** Дак. фільм «Малыя».
**16.55** «Сад і агарод».
**17.10 Серыял «Турэцкая для пачаткоўцаў».**
**20.50** «Вечарніца» (0+).
**21.05** «Даведнік па краінах і кантынентах (0+).
**21.15 Драма «Выкупленне» (16+).**



## ВТБ

**6.00** «Турбаміксер» (16+).
**7.00** Скетч-шоу «6 кадраў» (16+).
**8.00** Серыял «Татавы дочкі» (12+).
**9.00, 3.10** М/ф «Ліга Watchcar» (0+)
**9.30, 3.35** М/ф «Джынглікі» (0+)
**9.55, 3.55** М/ф «Машчыны страшылкі» (0+)
**10.20, 3.45** «Ералаш» (6+).
**10.50** Анімацыйны фільм «Кароль сафары» (0+).
**12.35** «Вакол свету пад-час дэкрэта» (12+).
**13.10** Серыял «Кухня-5» (16+).
**15.15** Трылер «Ілюзія падману» (12+).



**17.40** Трылер «Ілюзія падману-2» (12+).
**20.10** Містыка «Легіён» (16+).
**22.10** «Уральскія пельмені» (16+).
**0.00** Камедыя «Вельмі рускі дэтэктыў» (18+).
**2.00** «Хачу верыць!» (16+).
**4.20** «Лаві момант» (16+).
**5.00** «Дурні і дарогі» (16+).

## Культура

**6.30** Біблейскі сюжэт.
**7.05** «Сон у пачатку тумана». Маст. фільм.
**8.30** «У гасцях у лета». «Футбольныя зоркі». «Талент і прыхільнікі». «Прыходзь на каток». М/ф.
**9.40** «Звычайны канцэрт».
**10.10** «Ружовая пантэра». Маст. фільм.
**12.00, 1.30** «Экзатычная Шры-Ланка». Дак. серыял.
**12.50** «Перадзвіжнікі. Васіль Паленаў».
**13.20** Марлен Дзітрых. Канцэрт у Лондане. Запіс 1972 года.
**14.10** «Памылка Тоні Вендзіса». Маст. фільм.
**16.20** З калекцыі тэлеканала «Расія—Культура». Вялікі балет — 2016.
**18.20** Вечар-прысвячэнне Андрэю Дзяменцьеву. «І ўсё-ткі жыццё цудоўнае!»
**20.15** Каханне ў мастацтве. «Пабла Пікаса і Дора Маар». Дак. фільм.
**21.00** Да 70-годдзя Івара Калныньша. «Тэатр». Маст. фільм.
**23.20** Летні гала-канцэрт у Графенэгэ.
**0.45** «Шукалькіні». «Куды знік савецкі Дыснэйлэнд?»
**2.25** «Ключы ад часу». «Пумс». М/ф для дарослых.

## Настальгія

**6.00** «Быў час» з Аляксандрам Паліткоўскім: «Яны былі дармаедамі». 2007 год (16+).
**6.50, 8.10, 13.20, 14.40, 15.45, 17.00, 19.50, 23.25, 2.00, 3.45, 5.25** Музычная настальгія (12+).
**7.10, 13.40, 1.00** Маст. фільм «Бронзавая птушка». (6+).
**9.00, 15.00, 3.00** «Мінулы час». (12+).
**10.00, 16.00, 4.00** «Народжаны ў СССР». (12+).
**11.15** Фільм-спектакль «Тэатральныя гісторыі». 1976 год (12+).
**12.10** «Да і пасля...» з Уладзімірам Малчанавым. Год 1973. 1-я частка. (12+).
**18.00** «Што? Дзе? Калі?» Фінал. 1982 год. (12+).
**20.25** «Ранішняя пошта». 1986 год. (12+).
**21.00** «Быў час». 2009 год. (16+).
**22.00** «Вакол смеху». «Кірмаш смеху». 1983 год. (12+).
**0.00** «Спяем, сябры!» з Тацццянай Візбар. 2008 год. (12+).
**5.00** Серыял «33 квадратныя метры. Дачныя гісторыі». (16+).

## EuroSport 1

**4.00, 6.30, 8.30, 10.30, 18.45** Плаванне. Чэмпіянат Еўропы.
**5.00** Стральба з лука. Кубак свету.
**5.30, 9.30, 23.00, 1.30** Чэмпіянаты Еўропы.
**7.30, 14.15, 20.50, 2.30** Веласпорт (трэк). Чэмпіянат Еўропы.
**0.00** Конны спорт. Global Champions Tour.
**1.20** Watts.

## Кінакамедыя

**0.20** Вяселле. (16+).
**2.05** Месяцавая афёра. (18+).
**3.55, 4.55, 6.00, 7.00** Тата напракат (12+).
**8.00** Няўдачлівыя. (16+).
**9.35** Прышэльцы. (12+).
**11.40** Прышэльцы-2: калідоры часу. (12+).
**14.00** Я худзею. (16+).
**15.55** Стаўка на каханне. (12+).
**17.40** Любоўны менеджмент. (16+).
**19.30** Лепей не бывае. (12+).
**22.05** Маленькая чорная кніжка. (16+).

## ТБ3

**6.00** М/ф (6+).
**10.00** «Школа доктара Камароўскага» (6+).
**11.00** «Хронікі маскоўскага побыту» (16+).
**11.50, 1.45** «Дзяўчына сярэдніх гадоў». Серыял (16+).
**15.15** «Неверагодныя прыгоды італьянцаў у Расіі». Камедыя (12+).
**17.10** «Звярыны атрад». Анімацыйны фільм (0+).
**18.40, 5.30** «10 самых» (16+).
**19.15** «Вокладка» (16+).
**19.50** «Сола на саксафоне». Драма (12+).
**21.55** «Нябачны бок». Драма (16+).
**0.15** «Грань». Серыял (16+).
**4.45** «Нераскрытыя тайны» (12+).

## ТБ1000

**6.10, 18.00** Вяселле найлепшага сябра (12+).
**8.15** Трусіная нара (16+).
**10.05** Прыгоды Шаркбоя і Лавы (12+).
**12.00** Фантастычнае каханне і дзе яго знайсці (16+).



**13.55** Шакалад (12+).
**16.15** Хаціка: самы верны сябар (6+).
**20.10** Паляўнічыя на прывідаў (12+).
**22.15** Персанаж (12+).
**0.25** Дар (16+).
**2.30** Арбіта-9 (16+).
**4.05** Усё або нічога (16+).

## ТБ1000 Рускае кіно

**6.20** Кур'ер з «Раю» (12+).
**8.10** Я хачаць цябе буду, можна? (12+).
**9.20** Нявеста любой цаной (16+).
**11.20** Калектар (16+).
**12.45** Змяіная крыніца (12+).
**14.30** Уцякачкі (12+).
**16.30** Кухня ў Парыжы (12+).
**18.35** Дзеткі напракат (12+).
**20.20** Цёмны свет (16+).
**22.25** Іронія лёсу. Працяг (12+).
**0.40** Чорныя кошкі (16+).
**2.35** Кухня. Апошняя бітва (12+).
**4.30** Пасажырка (16+).

## National Geographic

**6.00** Аўта-SOS. (12+).
**6.45** Зона будаўніцтва. (12+).
**7.15, 5.10** Навуковыя недарэчнасці. (12+).
**8.00** Тайвань — свету. (16+).
**8.45, 12.35** Золата Юкана. (12+).
**9.30, 1.50** Дзікі тунец. (12+).
**10.20** Неверагодны доктар Пол. (16+).
**11.50** Сіла племені. (16+).
**13.20** Пачатак. (16+).
**14.55** Больш, чым тыраназаўр. (12+).
**15.40** Сапраўдны геній. (12+).
**18.00, 22.00, 1.05** Суперзбудаванні Трэцяга рэйха. (16+).
**18.50, 22.45** Другая сусветная вайна: пекла пад вадой. (16+).
**19.35** Шаўковы шлях. (16+).
**20.25, 0.15** Інстынкт выжывання. (16+).
**23.30** Дзіўная Другая сусветная. (16+).
**3.30** Цуды інжынерыі. (12+).
**4.20** Вядомы Сусвет. (12+).

## Discovery

**8.00, 14.00** Гісторыі Крамянёвай даліны (12+).
**9.00** Ратавальнікі-цяжкавагавікі (16+).
**10.00, 0.00** Узрываючы гісторыю (12+).
**11.00, 2.55** Ратавальнікі Эверэста (16+).
**12.00, 2.00** Праўда пра вірусныя відэа (16+).
**13.00, 7.10** Бітвы робатаў (12+).
**15.00** Разбуральнік (16+).
**16.00, 19.00** Паляўнічы на антыкварыят (12+).
**20.00** Салдаты няўдачы (16+).
**22.00** Маланкавыя катастрофы (16+).
**1.00** Хакер у дзікай прыродзе (16+).
**3.50, 6.20** Голыя і напалоханыя (16+).

## Беларусь 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00** (з сурдаперакладам), **9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00, 1.15** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 18.15** «Зона Х». (16+).
**9.10 Серыял «След». (16+).**
**10.50, 12.10, 18.40, 19.20 Серыял «Шлюб па завяшчанні». (12+).**
**13.05** Дзіцячы доктар.
**13.35 Меладрама «Ад першага да апошняга слова». Заключная серыя. (16+).**
**14.30, 15.25 Серыял «Двайная сусьльная». (16+).**
**15.15, 18.00** Навіны рэгіёна.
**17.05** «Сваты. Жыццё без грыму». (12+).
**21.00** Панарама.
**21.50 Меладрама «Бяжы, не азірайся!» (16+).**
**1.35** Дзень спорту.

## Беларусь 2

**7.00** Тэлераніца. (12+).
**9.00, 19.35** Тэлебарометр.
**9.05, 19.40 Серыял «Сляпая». (16+).**
**10.05, 17.40 Серыял «Марозава». (16+).**
**12.00** «Панаехалі-2. Канікулы ўсляпую». Заключны выпуск. (16+).
**13.00, 21.05** «Чалавек-невідзімка». (16+).
**13.55** М/с «Кунг-фу панда: захапляльныя легенды». (12+).
**14.20 Серыял «Жаночы рай». Заключныя серыі. (16+).**
**16.15** Нічога сабе ньюз. (12+).
**16.20** «Пін_код». Інтэрактыўны маладзёжны праект. (12+).
**17.05** Камень, нажніцы, папера. (16+).
**20.30** «Сям'я 3D». Скетчкам. (12+).
**22.00** Спортлато 5 з 36, КЕНО.
**22.05** «Бітва экстрасэнсаў. 16-ы сезон». (16+).
**0.05 Трылер «Не дыхай». (18+).**

## Беларусь 3

**7.00** «Дабрараначак».
**7.35** «Беларуская кухня». Бігас. Халодны суп.
**8.05, 12.00, 19.55** Навіны культуры.
**8.20, 12.20** «Гэты дзень».
**8.25, 18.35 «Маргарыта Назарава». Маст. фільм, заключная серыя (16+).**
**9.20, 17.50** «Апошні дзень». Спартак Мішулін (12+).
**10.00** «Гарады Беларусі». Полацк.
**10.30, 16.15 «Кур'ер». Меладрама (12+).**
**12.25** «Сіла веры».
**12.50** «Наперад у мінулае».
**13.20, 21.05 «У зоне асобай увагі». Маст. фільм (12+).**
**14.55, 22.40** «Вызваленне». «Вісла-Одэрская аперацыя. Прарыў» (12+).
**15.20** Госці «Славянскага базару». Надзея Бабкіна.
**19.25** «Камертон». Акцёр, педагог, прафесар, заслужаны артыст БССР Уладзімір Мішчанчук.
**20.10** «Беларуская кухня». Боршч з клёцкамі.
**20.40** «Калыханка» (0+).
**23.05 «Чароўная краіна». Маст. фільм (12+).**

## Беларусь 5

**7.20, 14.10, 14.50** Спорт-мікс.
**7.30** Футбол. Ліга Еўропы. 2-і кваліфікацыйны раўнд.
**9.25** Хакей. Таварыскі матч. «Дынама» (Мінск) — «Сібір» (Навасібірск).
**11.25, 19.35** Чэмпіянат Еўропы па водных відах спорту. Плаванне.
**14.20** Легенды сусветнага спорту.
**15.00** Чэмпіянат Еўропы па водных відах спорту. Сінхроннае плаванне.
**16.40** Гульні «навырост».
**17.10** Пляжны футбол. Еўраліга. Італія — Польшча.
**18.25** Пляжны футбол. Еўраліга. Беларусь — Турцыя.
**20.50** Спорт-цэнтр.
**21.00** Тэніс. WTA. Сан-Хасэ. Вашынгтон.

## АНТ

**6.00, 6.30, 7.00** (з субцітрамі), **7.30, 8.00** (з субцітрамі), **8.30, 9.00** (з субцітрамі), **11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
**6.10, 7.10, 8.10** «Наша раніца».
**9.10** «Бачылі відэа?» (12+).
**10.00** «Жыць здорава!» (12+).
**11.10** «Кантрольная закупка» (12+).
**11.50** «Модны прыгавор» (12+).
**13.10 Серыял «Вольф Месінг: які бачыў скрозь час» (12+).**
**14.20** «Легенды цырка» (6+).
**15.00** «Мужчынскае/Жаночае» (16+).
**16.20, 18.20 Маст. фільм «Ганна Карэніна» (12+).**
**18.55** «Удача ў прыдачу!» Дзённік (12+).
**19.00** «Поле цудаў» (16+).
**20.00** «Час».
**21.10** «Удача ў прыдачу!» Дзённік. Спецвыпуск (12+).
**21.15** Міжнародны музычны фестываль «Спёка» (12+).
**23.40 Камедыя «Законы прывабнасці» (12+).**
**1.25** «Начныя навіны».

## СТБ

**5.30** «Усім па катку» (16+).
**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** Навіны «24 гадзіны».
**6.10, 20.15** «Міншчына».
**6.20, 7.45** «Раніца». Студыя добрага настрою» (6+).
**7.40, 19.55, 23.00** «СТБ-спорт».
**9.00, 23.05** «Загадкі чалавецтва» (16+).
**10.40 «Уцякач». Серыял (16+).**
**12.30** «Вадзіць па-руску» (16+).
**12.45, 0.35** «Самыя шакіруючыя гіпотэзы» (16+).
**13.45** «Сакрэтныя тэрыторыі» (16+).
**14.40, 22.15** «Глядзець усім!» (16+).
**15.00** «Ежа багоў» (16+).
15.55, 16.50 «Знахар-2. Паляванне без правілаў». Серыял (16+).
**20.05** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.25** «Скардзіцца дазваляецца».
**20.45 Камедыя «Таксі-3». (16+).**

## МІР

**6.00 Серыял «АСА» (16+).**
**6.20, 8.05, 10.05, 13.15 Серыял «Пад прыцэлам». (16+).**
**8.00, 10.00, 16.00, 19.00** Навіны (бягучы радок).
**14.00, 3.55** «Справы сямейныя. Бітва за будучыню» (16+).
**15.00** «Справы сямейныя. Новыя гісторыі» (16+).
**16.15, 2.35** «Гульня ў кіно» (12+).
**17.10, 19.20 Серыял «Шлях да сябе». (16+).**
**21.05 Маст. фільм «Пра беднага гусара закіньце слова» (12+).**
**0.25 Маст. фільм «Лекцыі для хатніх гаспадынь» (12+).**
**2.35** «Наша кіно. Гісторыя вялікага кахання» (12+).
**3.00 Маст. фільм «Цырк» (0+).**
**4.50** М/ф (0+).

## РТР—Беларусь

**7.00** «Раніца Расіі».
**9.30, 11.35 Серыял «Чорная кроў». (12+).**
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**13.50, 16.50, 19.50, 23.00** Навіны — Беларусь.
**14.35** «Пра самае галоўнае». Токшоу. (12+).
**15.45** «60 хвілін». Ток-шоу.
**17.35** «Лёс чалавека». (12+).
**18.45** «Андрэй Малахаў. Прамы эфір». (16+).
**20.40** «Петрасян-шоу». (16+).
**23.10** «Вясёлы вечар». (12+).

## НТБ—Беларусь

**5.55** «Астрапрагноз».
**6.00, 7.00, 8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**6.10, 7.10** «Дзелавая раніца НТБ». (12+).
**7.55, 8.05 Серыял «Вяртанне Мухтара». (16+).**
**9.40, 23.15** «НЗ.by».
**10.25 Серыял «Дарожны патруль». (16+).**
**12.05** «Суд прысяжных». (16+).
**13.25, 16.30** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**14.10 Серыял «Мянтоўскія войны». (16+).**
**17.05** «ДНК». (16+).
**18.10, 19.5 Серыял «Марскія д'яблы». (16+).**
**21.25 Серыял «Ляснік. Свая зямля». (16+).**
**23.50 Серыял «Свекдкі». (16+).**

## 8 канал

**7.00, 15.50, 19.45, 21.00, 0.05** «Надвор'е».
**7.05** «Сябры дзядулі Марка» (0+).
**7.15, 23.20 Серыял «Камісар Рэкс» (12+).**
**8.10 Серыял «Крык савы» (16+).**
**9.10, 19.50 Серыял «Кандзіс Рэнуар» (16+).**
**10.10** «Майстар-класс».
**11.00, 18.20 Серыял «Сакратар» (16+).**
**12.30** Рэтра-дэтэктыў «Памылка рэзідэнта».
**15.00** Дак. фільм «Акцёр Георгій Жжонаў».
**15.55** «Мультпарад» (0+).
**16.05** Дак. фільм «Малыя» (0+).
**16.45 Серыял «Турэцкая для пачаткоўцаў».**
**17.40** «Здароўе».
**20.50** «Вечарніца» (0+).
**21.05 Драма «Целаахоўнік» (12+).**





## ВТБ

**6.00, 15.10** «Супермамачка» (16+).
**7.05, 16.15** Серыял «Вароніны» (12+).
**8.40** М/ф «Скубі Ду» (6+)
**9.10, 4.05** М/ф «Ліга Watchcar» (0+)
**9.40, 4.35** М/ф «Джынглікі» (0+)
**10.00, 4.55** М/ф «Машчыны страшылкі» (0+).
**10.20, 3.35** «Ералаш» (6+).
**10.50** Камедыя «Усё могуць каралі» (12+).
**13.00, 1.50** Серыял «Маладзёжка» (12+).
**17.50** Серыял «Івановы-Івановы» (16+).
**20.00** Камедыя «Каханне прэт-а-партэ» (12+).
**21.40** «Уральскія пельмені» (16+).
**0.00, 5.10** Серыял «Псіхалагіні» (16+).
**1.00** Серыял «Бязмоўны сведка» (16+).

## Культура

**6.30, 17.35** «Палонная лёсу». Лізавета Гейнрых-Ратоні.
**7.05, 18.00** «У лясах і на гарах». Серыял.
**7.50** «Пешшу...» Касімаў ханскі.
**8.20** Канікулы! «Цырк прыехаў». Маст. фільм.
**9.30, 1.30** «Атланты. У пошуках ісціны». «Ці пагражае нам новае абледзяненне або..?»
**10.00, 15.00, 19.30, 23.40** Навіны культуры.
**10.15** Эпохі музычнай гісторыі. «Класіцызм». Дак. фільм.
**11.50, 22.05** «Следства вядуць знатакі». Маст. фільм.
**13.20** «Надзея Казанцава. Парадоксы лёсу». Дак. фільм.
**13.50** «Медныя трубы». Мікалай Ціханаў.
**14.15** Штучны адбор.
**15.10** «Лісты з правінцыі». Кургальскі паўвостраў.
**15.40, 19.45** «Егіпецкі паход Напалеона Бапанарта». Дак. фільм. 1-я серыя.
**16.30** Юрый Башмет і ансамбль салістаў Маскоўскай філармоніі. Запіс 1989 года.
**17.15, 23.20, 2.40** Сусветныя скарбы.
**18.45** «Сунічная паляна Святаслава Рыхтэра». Дак. фільм.
**20.40** «Добрай ночы, малыя!»
**20.55** Штучны адбор.
**21.35** Легендарныя дружбы. «Майстэрня духу. Еўтушэнка пра Эрнста Невядомага».
**0.00** Эпохі музычнай гісторыі. «Рамантызм». Дак. фільм.
**2.00** «Вадзім Карастылёў». Дак. фільм.

## Настальгія

**6.00** «СеўАлогія» з Севам Наўгародцавым: «Масквічы». 2005 год (18+).
**7.00, 8.25, 9.45, 11.00, 12.40, 14.25, 15.45, 17.00, 18.40, 20.00, 21.45, 23.25, 0.35, 3.45** Музычная настальгія (12+).
**7.20** Маст. фільм «Абяцанне шчасця». (16+).
**9.00, 15.00, 21.00** «Мінулы час» (12+).
**10.00, 16.00, 22.00** «Народжаны ў СССР». (12+).
**12.00** «Акулы пяра». Леанід Якубовіч. 1996 год (18+).
**13.20** «Ала Пугачова ў сустракае сяброў». 1994 год (12+).
**18.00** «Спяем, сябры!» з Таццянай Візбар. 2008 год (12+).
**19.00** Маст. фільм «Бронзавая птушка». 1-я серыя. (6+).
**23.00** Серыял «33 квадратныя метры. Дачныя гісторыі». (16+).
**0.00** «Акулы пяра». Гурт «Парк Горькога». 1995 год (16+).
**0.55** «Замежная эстрада». 1988 год (12+).
**2.15** «Тэма» з Уладзіславам Лісцьевым: «Ала Пугачова». 1992 год (12+).
**4.00** Маст. фільм «Вам тэлеграма...» (16+).
**5.10** Фільм-канцэрт «Зімовы вечар... у Лужніках!» 1989 год. 2-я частка (12+).

## EuroSport 1

**4.00, 22.00** Веласпорт. «Тур Валоніі».
**5.30, 10.30, 14.00, 23.00** Снукер. «Мастэрс». Фінал.
**7.00, 12.20, 21.15, 1.30** Скачкі з трампліна. Летні Гран-пры.
**8.00, 15.30, 22.00** Веласпорт. «Тур Валоніі».
**9.30, 13.30** Мотагонкі. EWC. «All Access».
**10.00** Аўтагонкі. Суперкубак Porsche.
**13.20, 2.30** Watts.
**18.00, 20.00, 0.30** Алімпійскія гульні. «Зала славы».
**19.00** Алімпійскія гульні. «Жывыя легенды».
**2.45** Футбол. Зоркі MLS — «Ювентус».

## Кінакамедыя

**1.25** Ідэаль. (18+).
**3.10** Паспецъ за 30 хвілін. (16+).
**4.45** Гітлер капут! (16+).
**6.35** Наша Russia. Яйкі Лёсу. (16+).
**8.15** Я худзею. (16+).
**10.10** Прышэльцы-3: узяцце Бастыліі. (12+).
**12.20** Прышэльцы ў Амерыцы. (0+).
**14.00** Гэта ўсё яна. (16+).
**15.50** На мора! (16+).
**17.45** Ідэаль. (18+).
**19.30** Шэф. (12+).
**21.05** Няўдачлівыя. (16+).
**22.45** Без тармазоў. (16+).

## ТБ3

**6.00** М/ф (6+).
**7.40** «Заўтра сёння» (12+).
**8.10** «Доктар І...» (16+).
**8.40, 19.00, 1.55** «Асколкі». Серыял (16+).
**10.15, 3.10** «Судовыя страсці». Дак. серыял (16+).
**11.55, 17.15** «Варажбітка» (12+).
**13.00, 16.15** «Містычныя гісторыі» (12+).
**14.00** «Адкрыта» з Аксанай Байрак» (16+).
**14.55** «Простыя склада-насці» (12+).
**15.25** «Натуральны адбор» (12+).
**20.35** «Неразрэзаныя старонкі». Дэтэктыў (12+).
**21.35** «90-я» (16+).
**22.30, 5.30** «Лінія абароны» (16+).
**23.05** «Грань». Серыял (16+).
**23.55** «Сахара». Баявік (12+).
**4.40** «Нераскрытыя тайны» (12+).

## ТБ1000

**6.10, 17.35** Ідэальны шторм (12+).
**8.45** Шакалад (12+).
**11.05** Вяселле найлепшага сябра (12+).
**13.15** Міс Кангеніяльнасць-2: прыгожая і небяспечная (12+).
**15.30** Асцярожна, дзверы зачыняюцца! (16+).
**20.10** 2 + 1 (16+).
**22.25** Усё або нічога (16+).
**0.40** Арбіта-9 (16+).
**2.30** Сур'ёзны чалавек (16+).
**4.15** Заўсёды гаварь «Так» (16+).

## ТБ1000 Рускае кіно

**6.20** Кухня ў Парыжы (12+).
**8.25** Дзеткі напракат (12+).
**10.10** Уцякачкі (12+).
**12.05** Якая цудоўная гульня (12+).
**14.00** Ледакол (12+).
**16.20, 4.20** Дзядуля (12+).
**18.20** СуперБабровы (12+).
**20.20** ПазаКЛАСНАЕ чытанне. Пасажырка (16+).
**22.20** Кухня. Апошняя бітва (12+).
**0.35** Блукаючыя (12+).
**2.30** Наша Russia. Яйкі лёсу (16+).

## National Geographic

**6.00** Зона будаўніцтва. (12+).
**7.15** Навуковыя недарэчнасці. (12+).
**8.05, 13.25** Неверагодны доктар Пол. (16+).
**8.50, 17.15, 21.10, 2.45** Аўта-SOS. «(12+).
**9.35** Віні Джонс: самыя крутыя сюжэты пра Расію. (16+).
**10.20, 14.55** Асушыць акіян. (12+).
**11.05, 15.40** Асушыць Вялікія Азёры. (12+).
**11.55, 1.55** Золата Юкана. (12+).
**12.40, 16.25, 20.20** Інстынкт выжывання. (16+).
**14.10, 18.10, 22.00, 1.05, 4.20** Дзікі тунец. (12+).
**18.45, 22.45** Навука будучыні. (12+).
**19.30, 0.20** Расследаванні авіякатастроф. (16+).
**23.30** Эвакуацыя Зямлі. (16+).
**5.10** Інжынерныя ідэі. (12+).

## Discovery

**8.00, 17.00, 22.00, 4.40** Махінатары (12+).
**9.00, 16.00, 23.00, 5.30** Бітвы за кантэйнеры (12+).
**10.00, 15.00** Як гэта ўстроена? (12+).
**11.00, 19.00** Склады: бітва ў Канадзе (12+).
**12.00, 18.00** Маланкавыя катастрофы (16+).
**13.00** Ратавальнікі-цяжкавагавікі (16+).
**14.00, 2.55** Праўда пра вірусныя відэа (16+).
**19.00, 1.00** Узрываючы гісторыю (12+).
**20.00** Залатая ліхаманка (16+).
**21.00** Як гэта зроблена? (12+).
**0.00** Паляўнічыя на склады (16+).
**2.00** Не спрабуйце паўтарыць (16+).
**3.50** Вулічныя гонкі (16+).
**6.20** Хуткія і гучныя (12+).
**7.10** Эд Стафард: які выжыў (16+).

АСАБІСТЫ ПРЫКЛАД

# І ДЛЯ ДАЧКІ, І ДЛЯ ЛЮДЗЕЙ



**АДНЫ з самых танных цукерак прадаюцца ў Быхаве ў Дзяніса Назарэвіча. Гэта ведаюць усе жыхары раёна, якія прывыклі абслугоўвацца ў крамах свайго земляка. На сёння іх ужо пяць, апошняя — «Зніжачка» — пачала працаваць усяго месяц таму. Цукеркі і печыва там нават таннейшыя, чым у гіпермаркеце. А прадпрымальнік марыць адкрыць яшчэ адзін гандлёвы пункт у родным раёне. Трэба сабраць неабходную суму на лячэнне дачкі Вары. У дзяўчынкі СЦА (спінальная цягліцавая атрафія) 2-га тыпу. Некалькі месяцаў таму наша газета звярталася да гэтай тэмы. Прыклад унікальны. Гора не разбурыла сям'ю, а толькі мацней яе згуртавала. Дзяніс Назарэвіч, калі даведаўся пра дыягназ дачкі, не кінуўся на заробкі за мяжу, не стаў павышаць цэны, каб любымі сродкамі сабраць грошы на дарагія лекі, а зрабіў усё, каб прывабіць спажыўца зніжкамі і разнастайнасцю тавару.**

Першую краму ён адкрыў яшчэ да з'яўлення на свет дачкі — у аграгарадку Мокрае Быхаўскага раёна, дзе нарадзілася яго маці і прайшло яго дзяцінства. Не тое, што там не было гандлёвага аб'екта. Але ў краме ад райспажыўкаапераці меўся вельмі сціплы асартымент. Дзяніс жа прапанаваў аднавяскоўцам шырокі выбар.

**❍ ТОЛЬКІ ЛІЧБЫ**

На 1 студзеня ў Магілёўскай вобласці пражывала 1 058 746 чалавек, з якіх 207 223 — у сельскай мясцовасці. Сельскую частку насельніцтва абслугоўвала на гэтую дату 964 крамы ўсіх формаў уласнасці, 684 з якіх належалі сістэме Белспажыўсаюза.

— Каб адкрыць краму, прыйшлося браць крэдыт у банку. Але вырашыў рызыкнуць, і справа пайшла, — успамінае пра той перыяд Дзяніс. — Цяпер там рэалізуецца каля сямі тысяч найменняў тавару. Калі гэта масла, то відаў 5-7, калі марожанае — 20—25, печыва — 20—30, цукерак — больш за 40. І цэны ніжэйшыя, чым у суседніх крамах. Хоць там, дзе мы бралі тавар, ніхто асабліва не хацеў рабіць зніжкі.

**❍ АЎТАКРАМА АД «ЕЎРАГАНДЛЮ»**

Напоўніць авоську прадуктамі вяскоўцам вобласці дапамагаюць і аўтакрамы ад «Еўрагандлю», або, як яшчэ народ называе гэтага сеткавіка, — Еўраопта. У Магілёўскай вобласці пакуль такіх аўтакрамаў 2, яны працуюць у Магілёўскім і Круглянскім раёнах. Кожная з машын аб'язджае па сваім маршруце каля 60 вёсак. У **галоўным упраўленні гандлю і паслуг Магілёўскага аблвыканкама** паведамілі, што гэта першы сеткавік, які прапануе такія паслугі. Сярод больш чым 240 аўтакрамаў, якія ездзяць па дарогах вобласці, большасць належыць Белспажыўсаюзу і частка працуе ад Белпошты.

На той момант, калі нарадзілася Вара, у Дзяніса было ўжо дзве крамы. Дыягназ прагучаў як прысуд. Адзінае лякарства ад СЦА — Спінраза. Першы этап лячэння каштуе больш за паўмільёна еўра — непад'ёмная сума для звычайнай беларускай сям'і. Але гора можа зрабіць чалавека моцным. І Дзяніс прыняў рашэнне — павялічыць колькасць крамаў і адначасова тавараабарот. Яго гандлёвыя аб'екты з'явіліся ў аграгарадках Новы Быхаў і Смаліца. Для гэтага прыйшлося браць новыя крэдыты. Але бізнес рухаецца. «Зніжачка» працуе ўсяго месяц і ўжо карыстаецца вялікім попытам. Гандлёвая надбаўка там зусім міззэрная. Наогул, прыватнае гандлёвае прадпрыемства «Назарэвіч Стандарт» існуе ўсяго чатыры гады, але мае вельмі добрую рэпутацыю.

— Нам важна, каб падаткі ад работы нашых крамаў заставаліся ў раёне, — удакладняе Дзяніс, і ў яго словах няма ніякага пафасу. — Я вельмі люблю свой раён. Калі была магчымасць, заўсёды ўдзельнічаў у жыцці горада. Для мяне гонар, што наша прадпрыемства за апошнія два гады на раённым узроўні двойчы станавілася пераможцам у намінацыі «Найлепшы прадпрымальнік года».

Дзяніс не цешыць сябе надзеяй, што нехта спецыяльна пойдзе ў яго краму, каб сваёй пакупкай дапамагчы сабраць грошы на лячэнне дачкі. Але ён на гэта не вельмі і разлічвае. Ведае, што народ можна прывабіць толькі цаной і якасцю. Найбольш удзячны пакупнік на вёсцы, лічыць ён. І прыводзіць у прыклад аграгарадок Новы Быхаў.

— Калі мы там адкрыліся, нам усе былі вельмі рады, — усміхаецца прадпрымальнік. — Людзі там выключна добрыя. Выручка ад гандлю невялікая, але ж адносіны — гэта таксама важна. Плюс працоўныя месцы. Дзе сёння на вёсцы знойдзеш работу? У нас, дарэчы, па прадпрыемстве створана больш за 30 працоўных месцаў.

Дзяніс вельмі ўдзячны за тое, што раённыя ўлады падтрымліваюць з вядзеннем бізнесу.

— У нас зацікаўлены ў тым, каб падтрымаць менавіта жыхароў раёна, — кажа суразмоўнік. — Мы на вачах, можна не сумнявацца, што падаткі застануцца ў мясцовым бюджэце, і нас падтрымліваюць. І не толькі мяне — усіх, хто працуе ў малым і сярэднім бізнесе.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

**P. S.**

*Дарэчы, на сённяшні дзень на лячэнне маленькай Вары сям'я Назарэвічаў сабрала амаль палову неабходнай сумы. На першыя некалькі ўколаў, адзін з якіх каштуе 95 тысяч еўра без уліку ПДВ, грошы ўжо ёсць. Надзею падтрымлівае яшчэ і дабрачынная міжнародная арганізацыя «ЮніХэлп», якая дапамагае хворым дзецям. Там паабяцалі пералічыць на лячэнне Вары 100 тысяч еўра. Дапамагчы Дзянісу можна, зрабіўшы пакупку ў яго краме або ахвяраваўшы на дабрачынны рахунак (па спасылцы varvara.by).*

**❍ ПЕРШЫЯ Ў КРАІНЕ**

Па выніках працы за мінулы год **таварыства спажыўкаапераці Магілёўскага раёна** занесена на рэспубліканскую Дошку пашаны. Па словах **першага намесніка старшыні гэтага прадпрыемства Аксаны ЛІХУТЫ,** высокіх вынікаў атрымалася дасягнуць у рознічным гандлі. На балансе арганізацыі 96 крамаў, з якіх 25 знаходзяцца ў аграгарадках. Усе сельскія гандлёвыя пункты плануецца ў хуткім часе перавесці на самаабслугоўванне. Такая форма работы больш падабаецца вяскоўцам. Дадаткова тавары першай неабходнасці дастаўляе на вёску 10 аўтакрамаў. Для павышэння якасці абслугоўвання насельніцтва таварыства плануе набыць больш прасторную сучасную аўтакраму з дадатковым халадзільным абсталяваннем. Гэта значыць, што ў жыхароў аддаленых і маланаселеных вёсак будзе магчымасць выбару большага асартыменту тавару, падкрэсліла суразмоўнік.

# ГОД МАЛОЙ РАДЗІМЫ І ВЯЛІКІХ КРАМАЎ

## У адміністрацыі Аршанскага раёна расказалі пра першыя вынікі работы буйнога рытэйлера ў сельскай мясцовасці

**З комплексным абслугоўваннем вяскоўцаў Аршанскага раёна з красавіка сочыць буйны рытэйлер «Еўрагандаль». Там, дзе спажывецкая кааперацыя не змагла, нішу заняла прыватная кампанія. Рытэйлер абяцаў стварыць аднолькавыя цэнавыя ўмовы з буйнымі гарадскімі крамамі, бо не сакрэт, што цэннік у горадзе значна меншы за той, што на вёсцы. З заробкамі ж справа адваротная. Акрамя таго, важна прадстаўніцтва і шырокі асартымент, якім крамы на сяле пахваліцца могуць далёка не заўсёды. Пра тое, як змяніўся гандаль на сяле і наколькі павысілася яго якасць, расказаў першы намеснік старшыні Аршанскага райвыканкама Сяргей ПАЦ.**

### Там, дзе кааперацыя не змагла

Гандлёвае абслугоўванне сельскага насельніцтва Аршанскага раёна сёння забяспечваюць 24 кампаніі і восем індывідуальных прадпрымальнікаў. Усяго з гэтай мэтай функцыянуюць 89 гандлёвых аб'ектаў.

Яшчэ нядаўна больш за траціну крамаў, якія абслугоўвалі вяскоўцаў, належалі «Белкаапсаюзу». Аднак жыхароў вёсак і малых населеных пунктаў не задавальнялі ні цэны, ні асартымент, і з гэтым трэба было нешта рабіць — Год малой радзімы абавязвае.

«У сельскай мясцовасці, на жаль, спажывецкая кааперацыя не справілася з абслугоўваннем жыхароў. Мы добра разумеем, што ўзровень заработнай платы ў сельскіх жыхароў ніжэйшы, чым у горадзе. У сваю чаргу, цэны на многія харчовыя тавары былі вышэйшыя за гарадскія. Такога диспарытэту быць не павінна», — адзначыў Сяргей Пац.

У выніку ў адміністрацыі раёна прапрацавалі магчымасць прыходу прыватнага рытэйлера на тыя аб'екты, якія раней займала спажывецкая кааперацыя.

«Там мы заключылі дагаворы арэнды. Цяпер ужо 32 аб'екты «Еўрагандлю» працуюць у сельскай мясцовасці», — растлумачыў Сяргей Пац.

Як вынік, задача цалкам змяніць якасць гандлю ў сельскай мясцовасці была выканана ў самыя кароткія тэрміны.

«Але мы на гэтым не спыняемся і ўжо вызначылі населеныя пункты, куды запросім буйны прыватны рытэйл. У хуткім часе яшчэ шэсць гандлёвых аб'ектаў будуць створаны ў вёсцы. Да канца гэтага года ў нас будзе мінімум 38 крамаў «Еўрагандлю», — расказаў першы намеснік старшыні райвыканкама.

### Прадукты даедуць нават у цяжкадаступныя месцы

Аднак у раёне ёсць і невялікія мястэчкі, у якіх жыве менш за 200 жыхароў. Праблему іх абслугоўвання таксама практычна вырашылі. Цяпер 225 населеных пунктаў сельскай мясцовасці раёна, дзе пражывае каля 7 тысяч чалавек, абслугоўваюцца аўтакрамамі. Арганізавана і абслугоўванне жыхароў дачных участкаў.

«Для іх мы прапрацавалі пытанне па наяўнасці аўтамагазінаў. Цяпер у нас працуе восем аўтакрамаў па 18 маршрутах. Мы цалкам наладзілі ўзаемаадносіны з рытэйлерамі і бачым станоўчы вынік: нашы сельскія жыхары задаволеныя цэнамі і асартыментам», — паведаміў Сяргей Пац.

Гандлёвыя павільёны да канца года з'явяцца ў населеных пунктах Брухава, Андрэеўшчына, Дачная, Магераўка, Загарадная.

### А што прыватнікі?

Як правіла, з прыходам буйных сеткавых кампаній могуць пацярпець крамы індывідуальных прадпрымальнікаў, якім складана канкураваць з цэнавай палітыкай і шырокім асартыментам. Аднак, як адзначыў суразмоўнік, у раёне з пачатку работы кампаніі «Еўрагандаль» такіх пытанняў пакуль не ўзнікала. Канкурэнцыя з'явілася, але яна здаровая.

«Напрыклад, у аграгарадку Бабінічы, нягледзячы на прысутнасць трох крамаў «Еўрагандлю», паспяхова працуюць невялікія прыватныя крамы. З іх боку няма наракання. Зваротаў па нездаровай канкурэнцыі не было з самага пачатку, калі «Еўрагандаль» прыйшоў у раён», — растлумачыў першы намеснік старшыні райвыканкама.

Акрамя таго, ён адзначыў, што з прыходам буйнога рытэйлера тавараабарот стаў большы. Павялічылася і заработная плата ў прадаўцоў, у параўнанні з той, што была ў спажывецкай кааперацыі.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ.**

# «Усё, што ёсць у супермаркетах, прывязуць да парога»

## Як арганізавана гандлёвае абслугоўванне ў адным з тыповых сельсаветаў глыбінкі

**У Дамашах пастаянна пражываюць 38 чалавек, хоць зарэгістравана крыху больш. Магазін тут закрылі гадоў сем таму. Першай, каго сустрэлі, была Марыя Фёдараўна ПРОНЬКА. Аказалася — на ўсе Дамашы гаспадыня. У яе да кожнага свята пякуцца свае пірагі. Вось і цяпер яшчэ не з'елі тыя, што пякла да Пятрова дня. Мы са старшынёй сельскага Савета Нінай Булатай саступаем яе настойлівай просьбе і каштуем пятроўскага пірага. А ён з печы — духмяны, з яркай скарыначкай, пальчыкі абліжаш! Тое, што ў гэтай сям'і па выпечку ў краму не ходзяць, становіцца зразумела. Але ж прашу Марыю Фёдараўну расказаць пра гандлёвае абслугоўванне ў вёсцы.**



Марыя ПРОНЬКА чакае аўтакраму.

### «Ваня прывязе»

— Купіць нешта можна, лічы, кожны дзень, — разважае Марыя Пронька. — Пошта да нас штодня прыязджае, акрамя выхадных. Муж штодзённую газету выпісаў, дык паштальёнка кожную ранічку заязрае. А пошта цяпер, як вядома, на колах. Там можна цукеркі-пячэнне, макароны, крупы, алей, яшчэ шмат чаго купіць. Тыя ж крышкі ў сезон нарыхтовак патрэбныя ці цукар. Так што пошта, бывае, нас выручае.

А ў панядзелак і чацвер у нас гандлёвыя дні, мы загадзя збіраемся ў прызначаных месцах ды чакаем нашага Ваню. Тут ужо купляем і хлеб, і малако, і каўбасы — усё што ёсць у вашых гарадскіх супермаркетах, — прывозяць нам проста да парога, — кажа Марыя Фёдараўна.

Цікава, што ў Ляхавічах вадзіцелі аўтакрамаў самі з'яўляюцца і прадаўцамі. Напрыклад, на Пружаншчыне, у іншых раёнах, аб чым даводзілася пісаць на старонках «МС», гандаль на колах ажыццяўляюць два чалавекі — кіроўца і прадавец. Тут склалася іншая практыка, калі па маршруце ездзіць адзін супрацоўнік райспажыўтаварыства. Напрыклад, у Дамашы прыязджае Іван Багдановіч. Згодна з раскладам, у яго тут два прыпынкі, але прыпыняецца Іван чатыры альбо і пяць разоў.

Вёска цягнецца ў адну вуліцу прыкладна на кіламетр. «Многія ў нас старыя, нямоглыя, збяруцца тры бабулькі каля нечай хаты, вось ён і прыпыніцца, каб змаглі купіць прадукты, — кажа Марыя Фёдараўна — праедзе крышку, зноў людзі стаяць, і там прыпынак робіць. Таму мы вельмі ўдзячныя Івану, што такі ўважлівы і цярплівы. Ведаеце, якія пакупнікі са старых людзей: нехта дрэнна бачыць цэннікі, трэба кожны раз тлумачыць, паўтараць. Яшчэ бывае, выйшла бабулька, а грошы забылася, значыць, трэба пачакаць».

— Лічу, што нам пашанцавала з гандлёвым работнікам, — гаворыць **старшыня Жарабковіцкага сельскага Савета Ніна БУЛАТАЯ.** — Другі мог бы стаць у позу, маўляў, у мяне два прыпынкі ў раскладзе, якіх я прытрымліваюся, каб не выбівацца з графіка. У кожнай машыны вялікі маршрут, важна прыязджаць па вызначаным раскладзе. Але Іван Багдановіч з пашанай ставіцца да пажылых людзей. У гэтай вёсцы адны пенсіянеры, якія па 30—40 гадоў адпрацавалі на калгаснай вытворчасці. І хіба яны вінаватыя, што вёска іх стала маланаселенай? Тая ж Марыя Пронька, калі была звеннявой палiводчай брыгады, у яе звяне сто чалавек працавала. Потым яны з мужам Мікалаем Сідаравічам перайшлі на ферму. Праца жывёлавода была надзвычай цяжкая. Цяпер у абаіх ногі баляць, ды і іншыя іх аднавяскоўцы на здароўе скардзяцца. Таму і любяць у вёсцы Івана Вячаслававіча, што спачувае пажылым людзям.

Падчас размовы пра гандаль згадалі, што два разы на месяц у Дамашы прыязджае індывідуальны прадпрымальнік з Баранавіч, прывозіць прамысловы шырспажыў. У яго купляюць сродкі аховы раслін, угнаенні для агарода, танны абутак, бялізну. Людзі задаволеныя. А яшчэ тут расказалі, што па старой звычцы замаўляюць дзецям па мяху цукру, солі, мукі, каб было ў запасе. «Цяпер усё ёсць, абы грошы былі», — гавораць вясковыя гаспадыні.

### План, і звыш плана

Вёска Канюхі значна большая за Дамашы, там пражывае каля 190 чалавек. Ёсць свая крама раённага спажывецкага таварыства. Ала Данільчык працуе тут 37 гадоў. Яна нават спрабавала выйсці на пенсію, але ўседзела дома ўсяго паўгода ды вярнулася на ранейшае месца. Працуе тут адна. Рэжым работы склаўся даўно: з 9 да 18 з гадзінным перапынкам на абед. Людзі прывыклі, такі расклад іх задавальняе. Толькі падчас уборкі, пасяўной даводзіцца рабочы дзень працягваць. «Ды і ў любы дзень, бывае патэлефануюць, папросяць затрымацца, калі не паспяваюць з работы. Таксама чакаеш, усе ж свае людзі, знаёмыя», — расказвае прадавец.

Асартымент у Канюхах даволі разнастайны, малочныя і каўбасныя вырабы на вітрыне ад розных вытворцаў, ёсць свежыя агародніна, фрукты, нядрэнна прадстаўлена прамысловая група. Мы зайшлі літаральна за некалькі хвілін да абедзеннага перапынку, пакупнікоў ужо амаль не было.

— План на папярэдні месяц быў вызначаны ў 12 тысяч рублёў, — гаворыць Ала Данільчык. — Выручка крамы склала амаль 12 800 рублёў. Думаю, што і ў гэтым месяцы будзе не менш, пачалася пара канікулаў, водпускаў, час, калі насельніцтва ў вёсцы дасягае максімальнай адзнакі.

Старшыня сельскага Савета адзначыла, што магазін у Канюхах добра спраўляецца з абслугоўваннем насельніцтва. Скаргаў няма. Прадавец падтрымлівае памяшканне ў належным стане. Усё, што трэба штодня, вяскоўцы могуць купіць у сваёй краме.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

*Ляхавіцкі раён.*

**Леанід КАЛБАСА, старшыня Ляхавіцкага раённага Савета дэпутатаў:**

— У плане гандлёвага абслугоўвання насельніцтва Жарабковіцкі сельсавет можна лічыць тыповай адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкай глыбінкі. У 17 вёсках пражываюць 2700 чалавек. На тэрыторыі працуе 12 крамаў розных формаў уласнасці. Дзесяць маланаселеных вёсак абслугоўваюць аўтакрамы. Нават у тыя населеныя пункты, дзе засталіся тры альбо чатыры чалавекі, два разы на тыдзень заходзіць гандлёвая машына. Такая ж сітуацыя і ў цэлым па раёне. Сем аўтамагазінаў абслугоўваюць 90 населеных пунктаў раёна. Працуюць таксама 68 сельскіх стацыянарных крамаў.


**Уважаемые акционеры открытого акционерного общества «Дорожно-строительного треста № 1, г. Витебск»**

9 августа 2018 года в 14.30 состоится внеочередное общее собрание акционеров открытого акционерного общества «Дорожно-строительный трест № 1, г. Витебск».

Собрание пройдет по адресу Общества: г. Витебск, ул. Суворова,16, актовый зал.

**Повестка дня собрания:**
о выплате дивидендов за 1-е полугодие 218 года.

С материалами, подготовленными к собранию, можно ознакомиться у председателя наблюдательного совета по адресу: г. Витебск, ул. Суворова, 16, с 31 июля по 8 августа 2018 г. (время работы с 8.30 до 17.30), либо 9 августа 2018 г. по месту проведения собрания, контактный телефон (8-0212) 67-45-66.

Дата формирования реестра владельцев акций и список лиц, имеющих право на участие во внеочередном общем собрании акционеров, 30 июля 2018 г.

Регистрация участников собрания – с 13.45 до 14.15 по месту проведения собрания. Для регистрации при себе иметь следующие документы: акционеру общества – паспорт, представителю акционера – паспорт и доверенность.

Наблюдательный совет. УНП 300000398



**РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о проведении открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Промагролизинг»**

| Описание | Начальная цена с НДС, бел. руб. | Задаток, бел. руб | Шаг аукциона, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| **Лот № 1.** Магазин «Универсам «Сельмашевский» с инв. № 350/С-55967. Назначение: здание специализированное розничной торговли. Площадь – 4079,0 кв. м. Количество этажей – 2. Составные части и принадлежности: две кирпичные пристройки. Местонахождение: Гомельская область, г. Гомель, ул. Дворникова, 7 | 3 965 000,00 | 250 000,00 | 20 000,00 |
| **Лот № 2.** Санаторий-профилакторий с инв. № 600/С-46902, 1982 г. п. Назначение: здание специализированное для лечебно-профилактических и санаторно-курортных целей. Площадь – 3349,5 кв. м. Количество этажей – 3. Количество подземных этажей – 1. Составные части и принадлежности: трехэтажный кирпичный санаторий-профилакторий с подвалом (А3/к), двумя навесами 1, 2, входом в подвал, крыльцами. Местонахождение: 223028, Республика Беларусь, Минская обл., Минский р-н, Ждановичский с/с, 72, район д. Подгорье | 1 300 000,00 | 100 000,00 | 15 000,00 |

ЗЕМЕЛЬНЫЙ УЧАСТОК

**Лот № 1** расположен на земельном участке площадью 0,6205 га с кадастровым номером 340100000003000069. Целевое назначение земельного участка: для эксплуатации и обслуживания магазина-универсама № 53. Право аренды. Срок действия: по 06.03.2019. Переход права на земельный участок осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь.

**Лот № 2** расположен на земельном участке площадью 1,2240 га с кадастровым номером 623681700001000535. Целевое назначение земельного участка: земельный участок для лечебно-профилактических и санаторно-курортных целей. Право аренды. Срок действия: по 25.12.2110. Переход права на земельный участок осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь

УСЛОВИЯ

1. Победитель аукциона либо в случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в аукционе подано только одним участником и он согласен приобрести Лот № 1, Лот № 2 по начальной цене, увеличенной на 5 % (пять процентов), – Претендент на покупку должен подписать с Продавцом договор купли-продажи Лота № 1, Лота № 2 в течение 20 (двадцати) дней с даты подписания протокола о результатах аукциона.
2. Условия оплаты приобретенного на аукционе Лота № 1, Лота № 2 согласовываются Победителем аукциона (Претендентом на покупку) и Продавцом при подписании договора купли-продажи.
3. Договором купли-продажи предусматривается возможность рассрочки платежа с минимальным первоначальным взносом с учетом суммы задатка, в размере:
– 1 000 000,00 (один миллион белорусских рублей 00 копеек) по Лоту № 1;
– 250 000,00 (двести пятьдесят тысяч белорусских рублей 00 копеек) по Лоту № 2.
4. Победитель аукциона (Претендент на покупку) оплачивает Организатору аукциона вознаграждение в размере 0,5 % (ноль целых пять десятых процента) от цены продажи Лота № 1, 1,5% (одна целая пять десятых процента) от цены продажи Лота № 2 в течение 3 (трех) банковских дней со дня подписания протокола о результатах аукциона.
5. На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством для Победителя аукциона

**Аукцион состоится 27.08.2018 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4**

Порядок оформления участия в аукционе содержится на сайте Организатора аукциона ino.by.
**Продавец:** ОАО «Промагролизинг», 220035, г. Минск, пр-т Победителей, 51/2, пом. 30, тел. (017)334-34-35.
**Организатор аукциона**: РУП «Институт недвижимости и оценки» 220030, г. Минск, ул. Комсомольская, д.11, пом. 9, тел. (017) 306-00-57
Задаток перечисляется на р/с BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», BIC банка BPSBBY2X, 220004, г. Минск, ул. Кальварийская, д. 4а. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по продаже имущества (Лот №__), принадлежащего ОАО «Промагролизинг», проводимом 27 августа 2018 г. Участник, желающий участвовать в аукционе в отношении нескольких лотов, вносит задатки в размере, установленном для каждого из лотов.
Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 8.30 до 12.00, с 13.30 до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 7. **Окончание приема заявлений:** 23.08.2018 в 11.00.
Контактное лицо для осмотра Объектов: Сикорский Денис Геннадьевич, тел.: (017) 203-07-23, (044) 588-30-21.
Организатор аукциона вправе снять Лот с торгов до объявления его проданным без объяснения причин снятия

**Организатор аукциона: 8 (017) 306-00-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52 • www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**

# ДОБРАЎПАРАДКАВАННЕ, ПРАЦАЎЛАДКАВАННЕ, РЭГІЯНАЛЬНЫЯ ПРАГРАМЫ



## Праект «Мясцовы час»

**Сёння мы распачынаем новы праект, у якім дэталёва пазнаёмім з рэгіёнамі нашай краіны, іх штодзённымі клопатамі, спосабамі вырашэння мясцовых праблем, ініцыятыўным актывам раёнаў.**
**А дапамогуць нам у гэтым нашы калегі — рэдакцыі раённых газет. Спадзяёмся, такая сумесная праца пойдзе на карысць усім: творчым калектывам, героям публікацый і, галоўнае, — нашым чытачам.**

А распачне праект «Мясцовы час», які будзе выходзіць штомесяц, Ганцавіцкі раён, размешчаны на паўночным усходзе Брэсцкай вобласці.

Мяжуе ён з Лунінецкім, Пінскім, Івацэвіцкім, Ляхавіцкім раёнамі Брэсцкай вобласці, Салігорскім, Клецкім раёнамі Мінскай вобласці.

У яго складзе 36 сельскіх населеных пунктаў, аб'яднаных у восем сельскіх Саветаў: Агарэвіцкі, Дзяніскавіцкі, Любашаўскі, Люсінскі, Малькавіцкі, Нацкі, Хатыніцкі, Чудзінскі.

Раённы цэнтр — горад Ганцавічы — размешчаны за 250 км ад Брэста і за 180 км ад Мінска.

Колькасць насельніцтва складае 27 560 чалавек, з якога 13 925 чалавек пражывае ў Ганцавічах, 13 635 чалавек — у сельскай мясцовасці.

Большая частка раёна знаходзіцца ў межах паўднёва-ўсходняй часткі Прыпяцкага Палесся.

Плошча раёна складае 1,71 тысячы квадратных кіламетраў. 82,6 тысячы гектараў займаюць лясныя ўгоддзі. Лясістасць раёна — 54,7 працэнта. Землі — тарфяна-балотныя і дзярнова-падзолістыя, 13,2 тысячы гектараў займаюць балоты.

**Юрый ШАПЕЛЬ узначаліў Ганцавіцкі раённы Савет дэпутатаў пасля сёлетніх выбараў. Раней ён кіраваў раённай інспекцыяй прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя, а да гэтага працаваў у органах унутраных спраў. Цяпер свой багаты жыццёвы і працоўны вопыт прымяняе ў сферы самакіравання. З ім наша сённяшняя гутарка.**



Фота Галіны ПУПАЧ.

## Зверыць пазіцыі

***— Прайшло сто дзён вашага знаходжання на пасадзе старшыні раённага Савета. Што зроблена, якія формы праведзены, што паказалі сустрэчы з дэпутатамі і на месцах?***

— Пачну з лічбаў: мясцовае самакіраванне Ганцавіцкага раёна складаецца з аднаго Савета базавага ўзроўню і васьмі Саветаў пярвічнага тэрытарыяльнага ўзроўню, таксама абраны 32 старасты. У складзе раённага Савета працуе 27 дэпутатаў, у васьмі сельскіх Саветах — 88 дэпутатаў. Гэта наш актыў. За час пасля выбараў прайшло знаёмства і тое, што можна было б вызначыць словазлучэннем «зверыць пазіцыі». У шырокім сэнсе мы вызначаем сваю галоўную задачу як удзел у рэгіянальных праграмах развіцця. А мэтай гэтых праграм, як і ўсёй нашай работы, становіцца паляпшэнне жыцця грамадзян — нашых выбаршчыкаў. Райсавет ужо правёў пяць сесій, адно пасяджэнне прэзідыума і чатыры камісіі. На ўсіх пасяджэннях гаворыцца пра штодзённыя справы. Таму важна рыхтаваць да сесій рэалістычныя рашэнні, а потым дабівацца іх выканання. Што мы і стараемся рабіць з самага пачатку.

## Культура вясковага жыцця

***— Якія задачы па добраўпарадкаванні тэрыторый трэба вырашаць у першую чаргу?***

Парадак патрабуе намаганняў. І добраўпарадкаванне гэта не толькі комплекс мерапрыемстваў па ўтрыманні дарог, месцаў адпачынку, могілак ды іншай інфраструктуры горада і сельскіх населеных пунктаў. Гэта ў першую чаргу стаўленне людзей да навакольнага, прывычка і традыцыя жыць у чысціні, якую трэба напрацоўваць. Добры гаспадар штодня сочыць за сваім домам, гэтак жа трэба ставіцца і да дома агульнага. Але на справе так не заўсёды бывае. Узяць хоць бы тыя стыхійныя звалкі, што ўсім уеліся ў косці. Іх прыбіраем, а яны зноў то там, то тут з'яўляюцца. Здараецца, знаходзім вінаватых, караем, але не ўсім гэта служыць урокам. Альбо парадак на могілках. Нават передача іх на баланс ЖКГ не вызваляе ад абавязку кожнага сачыць за магіламі родзічаў. Усё пералічанае і ёсць клопаты дэпутатаў на месцах.

Ва ўяўленні жыхара вялікага горада вёска нярэдка бачыцца мілым куточкам з прыгожай прыродай, утульнымі дамамі, ранішнім крыкам пеўняў. Гэтую ідылію здольныя моцна сапсаваць пустыя старыя дамы, што зеўраюць пустымі аканіцамі. Таму вядзецца іх знос. Працягнем работу і ў гэтым скліканні. Складаюцца спісы такіх дамоў, праводзяцца неабходныя працэсуальныя працэдуры, выдзяляюцца сродкі.

Заўважу, што ў раёне пастаянна працуе камісія па добраўпарадкаванні, старшынёй якой я з'яўляюся. Дык вось, названая камісія ініцыюе, праводзіць і вызначае пераможцаў раённага конкурсу па азеляненні і добраўпарадкаванні тэрыторый. Сёлета мы падводзілі вынікі спаборніцтва 3 ліпеня. Адзначылі ўстановы і арганізацыі, а таксама гаспадароў прыватных падворкаў. Многія з іх парадавалі створанай сваімі рукамі прыгажосцю і крэатывам у падыходах да яе стварэння.

## Грамадская ініцыятыва

***— Што можна сказаць пра работу дэпутатаў раённага і сельскіх Саветаў? Можа, ёсць прыклады, калі нехта працуе, нестандартна. Гэта ж датычыцца і старастаў вёсак.***

— Пачну са старастаў, якія заслугоўваюць асаблівай пашаны, бо займаюцца грамадскай работай на карысць іншых. Назаву найлепшых, такіх як Мікалай Мікалаевіч Хілюціч з Малькавічаў, Ванда Іванаўна Чабатарэнка з Вялікіх Круговічаў, Іван Іосіфавіч Муха, староста адразу трох вёсак Кукава, Перадзелы і Дубнякі. На шчасце, спіс можна доўжыць.

Прыемна адзначаць, што дэпутаты райсавета маюць актыўную жыццёвую пазіцыю, некаторыя з іх ужо паспелі стаць ініцыятарамі добрых спраў і акцый. Скажам, узніклі праблемы ў матэрыяльным забеспячэнні дзіцячага аздараўленчага лагера «Астравок», і дэпутаты ініцыявалі акцыю па зборы сродкаў. Грошы пайшлі на закупку спартыўнага інвентару, настольных гульняў, набыццё спецадзення для работнікаў сталовай. Літаральна на апошняй сесіі зайшла гаворка пра аказанне дапамогі шматдзетным сем'ям да навучальнага года. Дык дэпутат Іван Набешка, камерцыйны дырэктар швейнага прадпрыемства, адразу прапанаваў 15-працэнтную зніжку на сваю прадукцыю для сем'яў гэтай катэгорыі.

Да дэпутатаў прыходзяць людзі з самымі рознымі пытаннямі. Часцей за ўсё просяць паспрыяць з рамонтам дарог, асвятленнем вуліц, добраўпарадкаваннем сельскіх населеных пунктаў, працаўладкаваннем.

## Занятасць на першым плане

***— Ці ёсць праблемы з працаўладкаваннем у раёне?***

— Так, праблемы ёсць, і прычыны іх розныя. У цэлым сітуацыя на рынку працы застаецца пад кантролем. За паўгода колькасць беспрацоўных, якія стаяць на ўліку ў службе занятасці, вырасла на два чалавекі. Было на пачатак года 56 чалавек, цяпер — 58. Вакансій у нас значыцца 114, у студзені было 75. З пачатку года садзейнічання ў працаўладкаванні папрасілі 420 чалавек, 373 з іх атрымалі работу. Але ж не ўсё так проста на рынку працы. Часта там запатрабаваныя рабочыя высокай кваліфікацыі і спецыялісты з вопытам работы. А нашы беспрацоўныя часцей за ўсё хочуць знайсці работу дворніка, прыбіральшчыцы, санітаркі, вартаўніка, падсобнага рабочага. Такіх прапаноў не хапае. З іншага боку, назіраецца нежаданне прайсці хоць бы мінімальнае навучанне і атрымаць прафесію. Напрыклад, адна швейная фірма ў горадзе шукае швачак. Упраўленне па працы і сацыяльнай абароне гатовае на базе мясцовага ліцэя правесці навучанне беспрацоўных па названай прафесіі з гарантыяй працаўладкавання. Але ніхто з іх не выказаў жадання навучыцца і пайсці на працу. Акрамя таго, названая фірма можа адкрыць 20 новых вакансій, але няма сэнсу гэта рабіць, бо і ранейшыя не запоўнены. І разам з тым новыя рабочыя месцы ў раёне ствараюцца. На іх з пачатку гэтага года было прынята 54 чалавекі.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**


**Извещение о внесении изменений в текст извещения**

Извещение по продаже недвижимого имущества ОАО ««Миноблавтотранс» филиал «Автобусный парк № 4, опубликованное 13.07.2018 в газете «Звязда», дополнить следующим содержанием:

Победитель аукциона (единственный участник аукциона) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов в размере 5 (пяти) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона в течение 5 (пяти) банковских дней со дня проведения аукциона.

УНП 690324015

**Открытый аукцион № 34/16/4 по продаже роботизированного сварочного комплекса**

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| Организатор аукциона | ООО «Реалконсалтинг», адрес: ул. Пономаренко, 35А, пом. 701, каб. 8, г. Минск, 220015, Республика Беларусь, телефон/факс: + 375 (17) 256-61-35 | | | |
| **Аукцион состоится 30.08.2018 в 11.00, по адресу: г. Минск, ул. Пономаренко, 35А, пом. 701.** Продавец – ЗАО Банк ВТБ (Беларусь) | | | | |
| № лота | Предмет аукциона | Местонахождение | Начальная цена продажи с учетом НДС, руб. | Сумма задатка по лоту, руб. |
| 1 | Роботизированный сварочный комплекс РТК-102.09, 2013 года выпуска, заводской № 375/054А | Гомельская область, Мозырьский район, Козенский сельский совет, 15 | 93 209 руб. 38 коп. | 8 000 |
| Порядок проведения и выбора победителя | Открытый аукцион на повышение начальной цены проводится с шагом аукциона в размере **5 процентов** от начальной стоимости предмета аукциона. Победителем объявляется участник аукциона, предложивший наиболее высокую цену. В случае, когда в аукционе примет участие один участник либо на аукцион явится один участник (далее – единственный участник), предмет аукциона продается этому участнику по начальной цене, увеличенной на 5 процентов, с его согласия | | | |
| Прием заявлений | Заявления на участие в аукционе принимаются в рабочие дни с 9.00 до 18.00, по адресу: г. Минск, ул. Пономаренко, 35А, пом. 701, каб. 8. **Последний день приема заявлений: 27.08.2018 до 17.00** | | | |
| Задаток | Для участия в аукционе необходимо внести задаток (задатки) в вышеуказанном размере (в случае участия в торгах в отношении нескольких лотов – задаток вносится для каждого из предметов аукциона). Банковские реквизиты:<br>– для резидентов РБ задаток перечисляется в белорусских рублях Организатору аукциона на расчетный счет BY70SLAN30124358100130000000 в ЗАО Банк ВТБ (Беларусь), г. Минск, ул. Московская, 14, БИК SLANBY22;<br>– для нерезидентов РБ задаток перечисляется в валютном эквиваленте по курсу НБ РБ на дату платежа на следующие счета: в долларах США (USD) – расчетный счет BY28SLAN30124358150210000000 в ЗАО Банк ВТБ (Беларусь), г. Минск, ул. Московская, 14, БИК SLANBY22.<br>Получатель платежа: ООО «Реалконсалтинг», УНП 191302068.<br>Назначение платежа: «Задаток согласно Извещению о проведении аукциона № 34/16/4 по лоту №__» | | | |
| Затраты | Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона осуществляется победителем аукциона (единственным участником) по фактическим затратам, определенным в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукциона № 34/16/4. Победитель аукциона (единственный участник) обязан перечислить на текущий (расчетный) счет Организатора сумму затрат на организацию и проведение аукциона в белорусских рублях в течение 3 рабочих дней со дня его проведения | | | |

1. Участнику, выигравшему аукцион, и единственному участнику сумма внесенного задатка учитывается в счет исполнения обязательств по договору, заключенному по результатам аукциона.
Участникам, не выигравшим аукцион, единственному участнику, не согласившемуся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 процентов, задаток возвращается в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона.
2. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, о чем Организатором аукциона извещаются участники аукциона.
3. Срок подписания договора купли-продажи предмета аукциона – в течение 20 дней со дня проведения аукциона. Срок оплаты предмета аукциона по договору купли-продажи – в течение 30 дней со дня проведения аукциона, если стороны договора не договорятся об ином сроке

**КОНТАКТНАЯ ИНФОРМАЦИЯ ОРГАНИЗАТОРА АУКЦИОНА**

Тел.: + 375 (17) 256-61-35, + 375 (25) 549-86-22. Игорь Садливский auction@expertiza.by .Подробная информация у нас на сайте: http://www.expertiza.by

КАРЦІНКІ З ГЛЫБІНКІ

## РАЗАМ З СЕМ'ЯМІ

**У заказніку «Спораўскі» ўжо другі год запар праходзіць свята «Тата — наш гонар!». Карэспандэнт газеты «Маяк» Бярозаўскага раёна завітаў туды і пацікавіўся, ці сапраўды тата можа ўсё што захочаш.**

Мерапрыемства было не толькі святочнае, але і спаборніцкае. Бацькаў разам з дзецьмі чакала некалькі выпрабаванняў. Таты гатавалі шашлык у конкурсе «Кулінары», з заплюшчанымі вачамі кіравалі аўтамабілем пад наглядам сваіх дзяцей, малявалі і спявалі. Да таго ж сем'яў чакалі настольныя гульні, пераправа на пароме і катары. «Дзякуй за такую цудоўную магчымасць правесці ўвесь дзень разам са сваёй сям'ёй, паглядзець на мужоў і дзяцей збоку, адчуць гонар за родных. Дзякуй і за тое, што паказалі нам, як можна палепшыць і разнастаіць вольны час з сям'ёй!» — адзначыла ўдзельніца свята Ірына Мшар.

## ПЕРШЫ ЮБІЛЯР

**У Ганцавіцкім раёне ўпершыню ўручылі пашпарт стагадовай жыхарцы. Са святам Надзею Дабралінскую павіншаваў і карэспандэнт газеты «Савецкае Палессе».**

Родам Надзея Канстанцінаўна з вёскі Малая Плотніца Пінскага раёна. Пасля вайны пераехала працаваць дэзінфектарам у Малькавіцкую ўчастковую бальніцу. Тут і сустрэла свайго мужа, з якім пражыла ў шчаслівым шлюбе 55 гадоў. Надзея Дабралінская — маці траіх дзяцей, бабуля дзесяці ўнукаў і прабабуля. Дзеці, унукі і праўнукі часта наведваюць яе. Пра іх сям'ю ў вёсцы адгукаюцца станоўча. Кажуць, што Надзея Канстанцінаўна інтэлігентная, выхаваная, прыстойная і працавітая жанчына, такімі ж выхавала і сваіх дзяцей. Пра сакрэт даўгалецця юбілярка гаворыць, што ўвага і падтрымка блізкіх даюць ёй сілы на рух наперад.

## ДЗЯЎЧЫНА ЗА РУЛЁМ

**Інструктар па кіраванні, таксіст, супрацоўнік СТА... Усе прафесіі Вольгі Давідзюк звязаны з аўтамабілямі, і ёй гэта падабаецца. Карэспандэнт газеты Клецкага раёна «Да новых перамог» сустрэўся з аўталэдзі.**



www.kleck.by

Пасведчанне кіроўцы Вольга атрымала ў 19 гадоў з першага разу. Праз некаторы час вярнулася ў гэтую ж аўташколу інструктарам. Тады дзяўчат-інструктараў амаль не было, таму некаторыя вучні спярша здзіўляліся, асабліва хлопцы. Але якасць заняткаў гаварыла сама за сябе. Пасля Вольга прадавала машыны, працавала на СТА, потым перайшла на дылерскую станцыю майстрам-прыёмшчыкам. Займалася першасным выяўленнем паломкі, кансультаваннем па рамонце, падборам запчастак, размеркаваннем работ сярод механікаў. Зараз яна атрымала пасведчанне таксіста і хутка сядзе за руль ужо ў новай якасці.

**Надзея АНІСОВІЧ.**

ДОБРЫ ПРЫКЛАД

# НЕБЯСПЕКУ ПРАСЦЕЙ ПАПЯРЭДЗІЦЬ,

## або Пра тое, як на Ганцаўшчыне пазбаўляюцца ад старых дрэў на могілках

**СТАРЫЯ дрэвы на могілках — галаўны боль не толькі для тых людзей, хто даглядае пахаванні, але і для прадстаўнікоў мясцовай улады, работнікаў жыллёва-камунальнай гаспадаркі. Першыя баяцца, каб старое ці гнілое дрэва не ўпала на даражэзныя помнікі, агароджы і не пашкодзіла іх. Другія зацікаўленыя ў тым, каб былі чысціня і парадак на тэрыторыях населеных пунктаў, не было сур'ёзных нараканняў да камунальнікаў, бо гэта ж на іх утрыманні зараз знаходзяцца могілкі.**



Выразаць дрэвы на могілах вельмі няпроста. Да таго ж, перш чым прыступіць да гэтай работы, неабходна вырашыць некалькі адміністрацыйных пытанняў, у тым ліку ў кабінеце старшыні сельвыканкама.

Работы па спілоўванні дрэў на могілках павінны праводзіць прамысловыя альпіністы. У іх ёсць навыкі, неабходныя інструменты і прыстасаванні. Вядома, іх кваліфікаваная работа патрабуе і дастойнай аплаты, кошт якой залежыць ад вышыні дрэва, яго таўшчыні і месцазнаходжання.

У Хатыніцкім сельскім Савеце яшчэ ў мінулым годзе праблема старых дрэў на могілках стаяла надзвычай востра. Пра яе гаварылі не на адным сходзе, пасяджэнні сельвыканкама. У пачатку года было вырашана ўсім мірам сабраць грошы, каб пазбавіцца ад небяспечных дрэў і паставіць кропку ў гэтым пытанні калі не назаўсёды, то надоўга.

— Небяспеку лепш папярэдзіць, — з цвёрдым перакананнем кажа **старшыня Хатыніцкага сельскага Савета Генадзь ПЕРАШЧУК.** — Цяжка нават уявіць, якую шкоду на вясковых могілках маглі б нарабіць аварыйныя дрэвы. Дыяметр асобных дасягаў паўтара метра!

Асноўныя клопаты па зборы сродкаў для спілоўвання дрэў на могілках узяў на сябе **староста вёскі Андрэй ЯРАШЭВІЧ.** Знайшліся жанчыны, якія вырашылі дапамагаць яму ў гэтым. Мудры Андрэй Андрэевіч размеркаваў іх па групах і вызначыў пэўныя вуліцы для дваровых абыходаў.

— Сказаць, што хадзіць па хатах і збіраць сродкі было нялёгка, — нічога не сказаць, — прызнаўся Андрэй Андрэевіч. — Асобныя жыхары Хатыніч ухіляліся ад агульнай справы. Некаторыя нават выганялі са свайго двара жанчын. Маўляў, дзяржава павінна займацца гэтай праблемай. Прызнаюся: сорамна мне за некаторых сваіх землякоў. Але ж большасць усё ж такі разумела, што справа гэтая не дзяржаўная, а людская, так сказаць усенародная, а могілкі — месца святое, ставіцца да яго трэба па-асабліваму.

Ішоў да людзей, вёў з імі гаворку і староста вёскі Андрэй Ярашэвіч. Чацвёртую частку ад усёй сумы сабраў менавіта гэты чалавек.

— Усё жыццё я працаваў настаўнікам, — працягвае мужчына. — І тыя, хто яшчэ ўчора быў маім вучнем, сёння моцныя і дбайныя гаспадары ў Хатынічах. Адмаўляць мне, тым больш прыніжаць, сумленне не дазваляла. Скажу больш: калі некаторыя хатынаўцы ў агульны «кацёл» клалі па пяць–дзесяць рублёў, то ў ведамасці па зборы грошай, якую вёў я, былі лічбы не меншыя за 10—20 рублёў.

Па словах старшыні сельвыканкама Генадзя Перашчука, на вясковых могілках, а іх у Хатынічах двое, яшчэ ўчора было больш чым трыццаць небяспечных дрэў. Зборнай брыгадай, у якую ўвайшлі арбарысты з Пінска, Мінска і Баранавіч, былі ліквідаваны ўсе дрэвы.

— Без людзей, без іх падтрымкі і разумення жыць і працаваць у вёсцы немагчыма, — прызнаецца Генадзь Перашчук. — Толькі разам можна рабіць вялікія справы. Вядома ж, былі часы, калі аварыйныя дрэвы спілоўвалі за кошт бюджэту. Тыя часы прайшлі і, думаю, назад ужо не вернуцца. Усім нам трэба вучыцца, як быць сапраўднымі гаспадарамі на сваёй зямлі.

Работы па спілоўванні небяспечных дрэў вядуцца не першы год і на тэрыторыі Любашаўскага сельскага Савета. На могілках вёскі Боркі яшчэ леташняй вясною пазбавіліся ад дрэў-гігантаў. Пакінулі толькі стары дуб, які аблюбавалі бусел з бусліхаю. Рука не паднялася разбураць гняздо з малымі птушанятамі, не па-людску гэта.

— А вось у вёсцы Ганцавічы прыйшлося нам падчас работы па спілоўванні дрэў нават міні-кааператывы ствараць, — тлумачыць **старшыня Любашаўскага сельскага Савета Святлана МУХА.** — На гэтых могілках аварыйных дрэў каля дзвюх соцень, а «пахаваныя» тут не толькі людзі вясковыя, але і гарадскія. Вось і ўзнікла пытанне, чаму гэта толькі насельніцтва вёскі Ганцавічы павінна клапаціцца аб парадку на могілках і збіраць грошы для спілоўвання дрэў. Таму зараз кааперуюцца людзі з горада і вёскі, сабраўшы пэўную суму, выходзяць на старасту Святлану Заньку, або на работнікаў сельвыканкама і па званку прыязджаюць працаваць прамысловыя альпіністы. Справа ідзе. Літаральна нядаўна працавалі яны на ганцавіцкіх могілках, спілавалі больш за два дзясяткі дрэў.

> «Большасць усё ж такі разумела, што справа гэтая не дзяржаўная, а людская, так сказаць усенародная, а могілкі — месца святое, ставіцца да яго трэба па-асабліваму.

У народзе кажуць, што добра чужымі рукамі жар заграбаць. Безумоўна, мудра сказана. Толькі вось у гісторыі з небяспечнымі дрэвамі няхай усё ж такі чужыя рукі зробяць гэтую справу.

**Галіна ПУПАЧ.**
**Фота аўтара.**

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

**РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.**
**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

**Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.**
**Адказны за выпуск: АНУФРЫЕВА В. А.**

Грамадскі савет: **ПАПКОЎ А.А.,** старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні; **ЦУПРЫК Л.А.**, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце; **ПАПКО В.М.**, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па міжнародных справах; **БЕЛЯКОЎ А.Э.**, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці; **ПАНАСЮК В.В.**, старшыня Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў; **ДРЫЛЁНАК Т.Л.**, старшыня Лёзненскага раённага Савета дэпутатаў; **СУШЧАНКА М.Л.**, старшыня Глушанскага пасялковага Савета дэпутатаў Бабруйскага раёна.

**Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»**

**АДРАС РЭДАКЦЫІ:**
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

**КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН** 292 44 12;
**e-mail:** info@zviazda.by

**Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.**

**Тыраж 20.008. Нумар падпісаны ў 19.30 26 ліпеня 2018 года.**